№ 11 (465) 17 сакавіка 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

У бюлетэнях ёсьць выразная альтэрнатыва, але ўсіх цікавіць толькі адно: колькі людзей зьбярэцца ў цэнтры сталіцы.

## Такіх выбараў яшчэ не было



**На фота: Аляксандар Міілінкевіч на сустрэчы з выбарцамі ў Берасьці.**

### Віталь Сіліцкі: Зьмена ўлады

ў Беларусі электаральным шляхам не магчымая. **Старонка 7.**

### Сілавікі чакаюць

масавага выхаду людзей на плошчу 19 сакавіка. **Старонка 4**.

### Апазыцыя ў пошуках адэкватных адказаў

14 сакавіка ў Амсьціслаўскім раёне затрыманы наклад газэты «Советская Белоруссия». **Старонка 8**.

### Міклашэвіч адхрысьціўся

Пракуратура: дакумэнты на прымяненьне сілы 19 сакавіка — правакацыя. **Старонка 6**.



Юлія

# У нумары


## выбары

Сілавікі чакаюць масавага выхаду ........... 4

Мілінкевіч: “Я перад выбарамі думаў, улада ў лепшай кандыдацыі” ........ 5

Міклашэвіч адхрысьціўся ................. 6

Сьнегам па дэмакратыі 6

Зачысткі па-беларуску 6

Віталь Сіліцкі: “Беларусь прыйдзе да дэмакратыі ўласным шляхам” .......... 7

Апазыцыя ў пошуках адэкватнага адказу ....... 8

Ці варта апазыцыі выступаць у дзяржаўных СМІ? ............................... 11

Сьціслая хроніка рэпрэсій і супрацiву ... 12

Чытачы пра выбары .. 26

Парады мітынгоўцам . 45

## салідарнасьць

Мікулаш Дзурында: Паміж палітычнай цемрай і сьвятлом свабоды ......................... 14

Аксана Забужка: Беларусь на шляху вызваленьня .................. 15

## грамадзтва

“Белжаба” не здаецца 17

Сяргей Балыкін: Хачу бюлетэнь па-расейску ......................... 32

## з усіх старон

Беларусь — гэта экспэрымэнт ................. 21

Я сапраўды люблю бляндынак ..................... 34

Цьвік у жэле ................. 37

## культура

Сны летнім днём ......... 40


## 50 радкоў рэдактара

### Такіх выбараў яшчэ не было

Прэзыдэнцкія выбары-2006 вылучае масавае нявер’е ў справядлівасьць падліку галасоў. Выбарам папярэднічаюць маштабныя прэвэнтыўныя затрыманьні актывістаў і іншыя сілавыя акцыі ўладаў. Палітычная пасіўнасьць у сталіцы кантрастуе зь неспадзяванай палітычнай актыўнасьцю ў многіх рэгіёнах. Супраціўленьне аўтарытарнаму рэжыму — мацнейшае, чым можна было чакаць, — падточвае яго ідэалягічныя асновы. Рэпрэсіі выклікаюць ланцуговую рэакцыю грамадзянскай салідарнасьці. На шыі прэсы сьціснулася пятля, а роля Інтэрнэту як сродка масавай інфармацыі ўзрасла. Пра гэта і іншае паведамляе сёньняшні нумар “НН”, амаль усю плошчу якога займае перадвыбарная хроніка.

На сайце “НН” www.nn.by навіны і камэнтары на тэму выбараў зь серады выстаўляюцца ў рэжыме он-лайн. Гэта дае вам магчымасьць сачыць за выбарамі праз “НН”.


Андрэй Хадановіч. Інтымная гігіена ........... 42

## аўтарскія рубрыкі

Павал Севярынец. Лісты зь лесу: Верым. Можам. Пераможам! ................. 12

Аляксандар Класкоўскі. Палітычная кухня: Патыхае “Тайфунам” 24

Лёлік Ушкін. Левым вокам: Навіны літаратуры .................... 25

Віталь Тарас. Іншымі словамі: Сьмерць пасьля сьмерці .......................... 28


## Ад рэдакцыі

# Сэнс гэтых выбараў

У апошнія дні ад маіх сяброў і калегаў нярэдка даводзіцца чуць меркаваньне, што на выбары ісьці ня сьлед, а тым больш – на плошчу. Прычым выказваюць яго далёка не прыхільнікі рэжыму. Гэта разумныя, адукаваныя людзі, не пазбаўленыя перакананьняў і прынцыпаў. Яны прыводзяць рацыянальныя доказы ў абгрунтаваньне свайго пункту гледжаньня. І галоўны зь іх палягае на тым, што вынікі выбараў вядомыя загадзя, таму галасаваньне ператвараецца, у лепшым выпадку, у фарс. Ніхто, маўляў, галасоў лічыць не зьбіраецца, і ніякае “народнае галасаваньне” не паўплывае на лічбы, якія абвесьціць Цэнтравыбаркам.

Таму адзінае, чым можна насаліць уладзе ў нядзелю, 19 сакавіка, гэта не пайсьці на выбары і тым самым сапсаваць настрой участковай камісіі, якая будзе трымаць справаздачу перад вышэйшымі інстанцыямі толькі па адзіным паказьніку — яўцы. Вядома, разважаюць прыхільнікі гэтага меркаваньня, было б добра, калі б два апазыцыйныя кандыдаты дамовіліся паміж сабой і зьнялі свае кандыдатуры ў апошні момант, заклікаўшы да байкоту выбараў бяз выбару. Але ж і без абвяшчэньня байкоту лепей заставацца дома, у цяпле ды камфорце.

З рацыянальнымі доказамі цяжка спрачацца. Хаця часам узьнікае ўражаньне, што прадыктаваныя яны, хутчэй, ірацыянальным страхам. Толькі ніхто ня хоча ў гэтым прызнацца. Адсюль нараджаюцца разважаньні наконт бессэнсоўнасьці якіх-кольвек дзеяньняў.

Можна задаць лягічнае пытаньне — а адсутнасьць дзеяньняў, пасіўнасьць маюць які-небудзь сэнс, могуць што-небудзь зьмяніць? Застацца дома — значыць, паказаць уладам фігу ў кішэні. Зразумела, такі выбар таксама магчымы. Толькі ці прынясе ён таму, хто яго зробіць, чаканы душэўны камфорт? Думаецца, не. Інакш ня сталі б прыхільнікі сядзеньня па хатах горача пераконваць у перавазе такога чыну сваіх знаёмых.

Магчыма, паход на выбарчы ўчастак сапраўды ня мае сэнсу. Але сэнс жыцьця дыктуецца ня зьнешнімі абставінамі. Кожны напаўняе сваё жыцьцё сэнсам самастойна. Кожны робіць свой выбар. Адмова зрабіць яго — таксама выбар.

Толькі ня трэба потым разважаць пра тое, што апазыцыя, Захад, Масква ці нехта там яшчэ ўпусьцілі свой шанец, чагосьці не зразумелі або не ўлічылі.

Сёньня кожнаму з вас таксама дадзены свой шанец, спадары крытыкі.

**Віталь Тарас**

КАНЦЭРТ

# Рок за Свабоду

18 сакавіка

**Удзел бяруць:**

**адзіны кандыдат**

**«N.R.M.»**

**«Neuro Dubel»**

**ты**

**твае сябры**

**Дзе:** Менск, парк Дружбы народаў **(плошча Бангалор)**
**Калі:** пачатак а **17-й.**



**Канцэрт дазволены Менгарвыканкамам.**

# Сілавікі чакаюць масавага выхаду

людзей на плошчу 19 сакавіка. Магчыма, улады рыхтуюць блякаду сталіцы.

Квіткі на цягнікі й аўтобусы з рэгіёнаў у Менск на 19 сакавіка не прадаюць — паведамляюць чытачы «НН» з розных рэгіёнаў краіны. Гэта можа быць загад, а можа быць вынік таго, што ўсе білеты раскупленыя.

А што будзе ў сталіцы? Доступ на Кастрычніцкі пляц можа быць перакрыты трыма кардонамі ўнутраных войскаў.

Пяць гадоў таму ў дачыненьні да шараговых актывістаў і журналістаў не было заведзена ніводнай крымінальнай справы. Доступ на Кастрычніцкі пляц быў свабодным, а Палац культуры прафсаюзаў фактычна належаў апазыцыйнаму кандыдату.

Сёлета па-іншаму. Узбуджана (па стане на аўторак) 16 крымінальных справаў, лік прэвэнтыўна затрыманых на 7—15 сутак набліжаецца да сотні. У рамках кампаніі запалохваньня была «выкрытая» «змова «Партнэрства».

Якім будзе супрацьдзяньне маніфэстантам у сталіцы, улады, вядома, трымаюць у сакрэце. Нам стаў вядомы адзін з плянаў: доступ на Кастрычніцкі пляц будуць перакрываць ажно тры кардоны. Унутраны — сам пляц, Адміністрацыя прэзыдэнта, Палац Рэспублікі. Другі «фронт» — ГУМ, плошча Свабоды, Цырк, скрыжаваньне Энгельса/Кірава. І, нарэшце, вонкавы «шчыт»: з поўдня — перад мостам ад вул. Маскоўскай да пл.Незалежнасьці, ад поўначы — плошча Якуба Коласа, з захаду — Юбілейны пляц (мэтро «Фрунзэнская»), на ўсходзе — вул. Ульянаўская (ля к/з «Менск»).

Пра настроі ў сілавых структурах дастаневернай інфармацыі няма.

Многія студэнцкія інтэрнаты ў Менску ў чацьвер-пятніцу зачыняюцца на дэзынсэкцыю і дэратызацыю.

Чакаецца, што 19 сакавіка будуць заблякаваныя апазыцыйныя інтэрнэт-рэсурсы і ўзьнікнуць праблемы з мабільнай сувязьзю.

Чаго баіцца ўлада ва ўмовах, калі палова лідэраў апазыцыі прэвэнтыўна арыштаваная? Магчыма, яна валодае зьвесткамі пра радыкалізацыю апазыцыйна настроеных грамадзянаў. Гэта, зрэшты, заўважна і па масавасьці несанкцыянаваных сустрэчаў зь Мілінкевічам.

18 сакавіка А.Лукашэнка плянуе зьвярнуцца да выбаршчыкаў. А пасьля будзе 19 сакавіка. Дзень, у які ўлада вырашыла зрабіць стаўку на сілу, апазыцыя — на грамадзянскую сьвядомасьць.

**Зьміцер Дрыгайла**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**На сустрэчу з Аляксандрам Мілінкевічам да Менскага лядовага палацу прыйшло тры з паловай тысячы чалавек.**

# «19 сакавіка будзе сьвятам яднаньня»

Напярэдадні выбараў кандыдат у прэзыдэнты ад дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч выступіў з зваротам да выбарцаў.




У ім, у прыватнасьці, гаворыцца: «Я зьвяртаюся да вас, грамадзяне Беларусі, як роўны да роўнага — памятаеце, што званьне Грамадзяніна вышэй за званьне Прэзыдэнта. Памятайце, што прэзыдэнты прыходзяць і сыходзяць, а Народ Рэспублікі Беларусі застаецца галоўнай крыніцай улады і яе судзьдзём. Толькі мы можам вярнуць сабе Годнасьць Грамадзяніна, перад якім адказны любы прэзыдэнт».

А.Мілінкевіч заклікаў супрацоўнікаў сілавых структураў не забывацца, што яны абараняюць «не аднаго грамадзяніна, а ўсіх грамадзянаў сваёй Айчыны», а выканаўчую ўладу — не аддаваць злачынных распараджэньняў. «Гэтым самым вы вызваліце і сябе ад той дыктатуры, ад якой самі стаміліся».

Ён засьцярог грамадзянаў ад удзелу ў датэрміновым галасаваньні.

«Мы сустрэнемся з вамі разам 19 сакавіка а 20-й на Кастрычніцкай плошчы ў г. Менску, каб адсьвяткаваць дзень выбараў, — так сканчаецца зварот. — Гэта будзе наша супольнае Сьвята Перамогі над страхам, варажнечай. Гэта будзе наша сьвята яднаньня народу Беларусі. Абдымемся, як сябры, падамо адзін аднаму рукі, скажам: «Здарова, Вясна, Свабода, Праўда, Справядлівасьць».

## У Інтэрнэце за Мілінкевіча — 71%

На адным з форумаў tut.by было арганізавана апытаньне на тэму «Як бы вы прагаласавалі 19-га». Усяго ў гэтым галасаваньні ўзялі ўдзел 688 карыстальнікаў. Настроі палітычна актыўнай часткі грамадства адрозьніваюцца ад «сярэдніх па Рэспубліцы». 71% прагаласаваў за Мілінкевіча (487), за Лукашэнку — 20% (138), Казуліна — 5% (32), супраць усіх — 3% (23).

## Аляксандар Мілінкевіч: «Я перад выбарамі думаў, улада ў лепшай кандыцыі»

«Галоўны вынік нашае кампаніі: людзі паверылі, што будучыню можна зьмяніць, — заявіў А.Мілінкевіч на прэс-канфэрэнцыі для беларускіх і замежных журналістаў у сераду. — Я перад выбарамі думаў, што ўлада ў лепшай кандыцыі. Але насамрэч яна ў агоніі. Тыя лічбы, што абвесьціць Ярмошына, дык мы іх ведалі і год, і два таму. Ну ня любіць Лукашэнка меней за 75 адсоткаў! Мы перамагаем, бо ў выніку кампаніі Беларусь стала іншай. Вызваленьне ад апатыі ўжо адбылося, вызваленьне ад страху адбудзецца 19 сакавіка. Перамога можа быць і 19, і 20 сакавіка, і празь месяц... Мы будзем з усьмешкамі ўстаўляць кветкі ў шчыліны міліцэйскіх шчытоў».

## Зачысткі па-беларуску

Улады праводзяць прэвэнтыўныя арышты актывістаў апазыцыі.

За аўторак 14 сакавіка былі затрыманыя больш за 20 актывістаў рэгіянальных штабоў Аляксандра Мілінкевіча. За сераду яшчэ столькі ж.

Суды даюць ім суткі. У Наваполацку на сем сутак асудзілі Аляксея Трубкіна, у Віцебску — Віталя Броўку, у Берасьці Сьцяпана Навасяльчана — на 10 сутак арышту, Васіля Берасьнёва ў Воршы — на 7 сутак. Затрымалі гарадзенскіх кіраўнікоў штабу Сяргея Мальчыка і Віктара Сазонава. Бяруць ва ўсіх абласных цэнтрах і буйных гарадах.

А 15-й гадзіне ў сераду ў Менску затрымалі лідэра АГП Анатоля Лябедзьку. Усім затрыманым часьцей за ўсё інкрымінуюць нецэнзурную лаянку і непадпарадкаваньне міліцыі.

Актывістаў імкнуцца выключыць з прэзыдэнцкай кампаніі менавіта на 19 сакавіка — каб у рэгіёнах людзі засталіся без сваіх лідэраў, а ў Менску Мілінкевіч — бяз штабу.

**АГ**

**Падрабязнасьці — у рубрыцы «Хроніка». Старонкі 12— 20.**

# Міклашэвіч адхрысьціўся

Пракуратура: дакумэнты на прымяненьне сілы 19 сакавіка — правакацыя.

Генэральны пракурор Беларусі Пятро Міклашэвіч сьцьвярджае, што не падпісваў ніякіх дакумэнтаў на ўжыцьцё сілы, спэцсродкаў супраць дэманстрантаў 19 сакавіка. Пра гэта заявілі БелаПАН у Пракуратуры Беларусі. Інфармацыя пра тое, што гэтыя дакумэнты былі падпісаныя сп.Міклашэвічам, утрымлівалася ў электронным лісьце за подпісам «Афіцэра МУС», які ўвечары 14 сакавіка быў дасланы ў офіс кампаніі БелаПАН. У рэспубліканскай пракуратуры ліст расцанілі як правакацыйны.

**МБ**

# Сьнегам па дэмакратыі

Болей за 6 тысячаў чалавек прыйшлі на сустрэчу зь Мілінкевічам у Гомелі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Жыхары Гомелю сталі сьведкамі ірацыянальнага відовішча. 10 сакавіка да плошчы Паўстаньня з усяго гораду пацягнуліся самазвалы са сьнегам. Пад вечар уся плошча была загрувашчаная штучнымі сьнежнымі заваламі вышынёй у чалавечы рост, а з боку вуліцы Савецкай вышыня завалаў дасягнула 2,5 мэтраў. З куч сьнегу сіратліва выглядае помнік вызваліцелям. «Навошта завозіць гэтую брыдоту ў цэнтар гораду», — голасна зьдзіўлялася бабулька, якая праходзіла побач. Бабулька ня ведала таго, што ведалі гарадзкія ўлады: 14 сакавіка Мілінкевіч плянаваў тут сустрэчу з выбаршчыкамі.

Ня менш дзіўна выглядае плошча Леніна — галоўная плошча гораду. Гарадзкім уладам уздумалася... заліць на ёй коўзанку, а ўсю пешаходную зону абгарадзілі двума шэрагамі мэталічных парапэтаў.

І гэта ў правінцыйным сонным Гомелі, дзе апошнюю кволую дэманстрацыю апазыцыі разагналі яшчэ 26 красавіка 1996-га…

У выніку такой падрыхтоўкі 14 сакавіка сустрэчу з А.Мілінкевічам перанесьлі з плошчы Паўстаньня на Цэнтральны стадыён. Паслухаць кандыдата ў прэзыдэнты туды сабралася больш за 6 тысяч гамельчукоў.

**Сяргей Баранаў, Гомель**

# Віталь Сіліцкі: Беларусь прыйдзе да дэмакратыі ўласным шляхам

Удачы і памылкі апазыцыі падчас выбарчай кампаніі. Пэрспэктывы незалежнага грамадзтва пасьля выбараў. Аналізуе палітоляг Віталь Сіліцкі.

**«Наша Ніва»: Якія асноўныя ўрокі мы выносім з гэтай кампаніі?**

**Віталь Сіліцкі:** Папершае, аб'ектыўна ёсьць пэўны дэфіцыт чаканьня пераменаў у грамадзтве. Улады ж дзейнічаюць несымэтрычна сёньняшнім настроям людзей — уся гэтая гістэрыя, нагнятаньне страху і засільле ідэалёгіі не апраўданыя, на першы погляд, у дачыненьні да стану грамадзтва. Але гэта вельмі прыдатная для ўладаў тактыка, бо такія дзеяньні ў пэрыяд пэўнага зацішша, калі грамадзтва канчаткова не «прачнулася», даюць магчымасьць зусім панізіць гэтае самае чаканьне пераменаў.

Па-другое, тое, што насуперак усім перашкодам супраціў, хай сабе і невялікі, існуе, сьведчыць, што праца з грамадзтвам ня вычарпаная і мае пэрспэктывы, нягледзячы на жорсткасьць умоваў.

Па-трэцяе, па ўсім відно, што Беларусь прыйдзе да дэмакратыі ўласным, не ўкраінскім і не грузінскім, шляхам.

**«НН»: Ці можна сказаць, што цяпер ужо канчаткова ясна — зьмена ўлады ў Беларусі электаральным шляхам не магчымая?**

**ВС:** Адназначна.

**«НН»: У сваім артыкуле ў «ARCHE» Вы назвалі гэтую кампанію «заручэньнем гаранта канстытуцыі ўсенароднай падтрымкай», а ня выбарамі. Ці можна сьцьвярджаць, што апазыцыя сарвала пляны ўладаў? Ці ўлады пабурылі пляны апазыцыі?**

**ВС:** Апазыцыя пакуль не пераканала грамадзтва, нават настроеную станоўча да пераменаў яго частку, што Лукашэнка ня здольны выйграць выбары ў любы спосаб, што з дапамогай фальсыфікацыяў, што ў чэснай і адкрытай барацьбе. І гэта ёсьць адной зь яе галоўных праблемаў, бо гэта б'е па даверы да апазыцыі з боку яе прыхільнікаў.

Галоўнай жа перамогай апазыцыі ў гэтай кампаніі лічу разбурэньне міту пра безальтэрнатыўнасьць дзеючага прэзыдэнта.

**«НН»: Якія пэрспэктывы ў аб'яднанай апазыцыі ў выпадку магчымай паразы на выбарах і на вуліцы? Якімі будуць у такім выпадку першыя крокі рэжыму?**

**ВС:** Варта чакаць у такім разе, што апазыцыйны рух скоціцца да дысыдэнцкіх суполак. Трэба прыслухоўвацца да таго, што часам кажа сам Лукашэнка. Ён неаднакроць абяцаў, што такой апазыцыі, як зараз, пасьля выбараў ня будзе. Хоць пры гэтым ён заўважаў, што «яны самі перасварацца», варта чакаць, што апазыцыі ў гэтым дапамогуць. Паказальным ёсьць знакавы зварот да досьведу Францыі: яшчэ перад рэфэрэндумам 1996 г. Лукашэнка ўзгадваў 7-гадовы тэрмін прэзыдэнцтва ў Францыі. На апошнім форуме ён казаў пра тое, што некаторыя заходнія краіны, нягледзячы на іх дэмакратызм, не адмаўляюцца ўжыць у выпадку чаго надзвычайшчыну, намякаючы, відавочна, на нядаўныя францускія падзеі. Адсюль варта чакаць усяго. Нават у дачыненьні да саюзьнікаў. Вельмі хутка можа разгарэцца чарговы нафтагазавы канфлікт з Расеяй з выкарыстаньнем незалежніцкай рыторыкі.

**«НН»: Ці заўважылі Вы нейкія зьмены ў рэакцыях міжнароднай супольнасьці ў параўнаньні з 2001 годам?**

**ВС:** Бязьдзеяньне міжнароднай супольнасьці за апошнія 5 год нікольк не памянялася, усё тыя ж дэкляратыўныя завярэньні ў падтрымцы незалежнага беларускага грамадзтва ды заклікі да рэжыму вярнуцца на шлях дэмакратыі. А простыя эўрапейцы, як і эўрапейскія няўрадавыя арганізацыі, падтрымлівалі нас заўсёды, і ня толькі перад выбарамі.

**Запісаў Сямён Печанко**

### З кім з кандыдатаў вы хацелі б пагаварыць

Паводле апытаньня на сайце naviny.by, большасьць (56,8%) хацела б пагаманіць з А.Мілінкевічам, з А.Казуліным — 8,93%, з А.Лукашэнкам — 15,24%. С.Гайдукевіч набраў менш за 1% галасоў. А.Мілінкевіч выходзіць з кампаніі з пазытыўным іміджам у вачох інтэрнаўтаў. Як цьвердзяць псыхолягі, выбарцы найбольш ахвотна галасуюць за кандыдата, зь якім ім хацелася б разам «пасядзець за сталом».

### Апытаньне: на плошчу выйдзе больш за 30 тысяч

Паводле апытаньня на інтэрнэт-партале telegraf.by, 51,7% вераць у тое, што на Кастрычніцкі пляц 19 сакавіка выйдзе больш за 30 тыс. чалавек, 7,9% мяркуюць, што выйдзе ад 20 тыс. да 30 тыс., 17,2% — у межах ад 10 да 20 тыс. Што на плошчу выйдзе менш за 5 тыс., лічаць 13,2% наведнікаў.

### Гомель абвяргае сацыёлягаў

Інфармацыйны бюлетэнь "Грамадзянскія ініцыятывы" аналізуе вынікі збору подпісаў за дэмакратычнага кандыдата. Было вывучана 1147 подпісаў, аддадзеных у падтрымку Аляксандра Мілінкевіча ў Гомелі. Найбольшую цікавасьць выклікае узроставае разьмеркаваньне падпісчыкаў. Так, колькасьць подпісаў грамадзянаў ва ўзросьце 18—25 год складае 16,3% ад агульнай колькасьці, 26—35 — 19,4%, 36—45 — 22,6%, 46—60 — 31,6% і старэйшых за 60 год — 10,1%.

Насуперак існуючым стэрэатыпам, разыходжаньне паміж узроставымі групамі амаль незаўважнае: у сярэднім на кожны год прыпадае каля 2% подпісаў. Невялікую перавагу ўзроставай катэгорыі 36—45 год (2,2%) перад моладзьдзю бюлетэнь тлумачыць тым, што гэтая група грамадзянаў ужо сфармавалася ў прафэсійным пляне і больш самастойная ў сваіх палітычных паводзінах.

**СП**

# Апазыцыя ў пошуках адэкватнага адказу

У аўторак 14 сакавіка ў Мсьціслаўскім раёне быў затрыманы наклад газэты «Советская Белоруссия». 65 тыс. асобнікаў на васьмі бачынах, аддрукаваныя ў смаленскай тыпаграфіі Міхайлава. У машыне, якая перавозіла газэту, знаходзіўся намесьнік старшыні Партыі БНФ Алесь Міхалевіч. Гэта не абсурд — гэта была спроба палітычнага пэрформансу.

Вонкава газэта не адрозьнівалася ад арыгіналу. Тыя ж шрыфты, фарбы, калянтытулы, вёрстка, нават прозьвішчы журналістаў, што працуюць у рэдакцыі, выходныя зьвесткі: заснавальнікі — Адміністрацыя прэзыдэнта і рэдакцыйная рада. Але на першай старонцы зьмяшчалася фота дзейнага кіраўніка дзяржавы з загалоўкам «19 сакавіка — выбары прэзыдэнта Беларусі А.Р.Лукашэнкі». Астатнія матэрыялы мелі наступныя загалоўкі: «Прэзыдэнт Беларусі — нашчадак расейскіх цароў», «Народная манархія», «Аргумэнты «за» і «супраць» царызму ў Беларусі», «Самы чалавечны чалавек».

Алесь Міхалевіч заявіў, што Партыя БНФ ня мае ніякага дачыненьня да выпуску фальшывага нумару, гэта праект грамадзкай ініцыятывы «Хопіць».

Галоўны рэдактар «СБ» Павал Якубовіч наступным чынам пракамэнтаваў правакацыю для агенцтва БелТА: «Гэта даволі дарагая задумка. Калі гаворка ідзе пра *65 тыс. асобнікаў* каляровай газэты, то гэта *150 тыс.* даляраў. Грамадзяне ўзялі грошы яўна не з панчохі сваёй жонкі».

Ухапіўшыся за лічбы, агучаныя П.Якубовічам, на інтэрнэт-форумах задаюцца пытаньнем, адкуль бяруцца грошы на выданьне сапраўднай «СБ»? Са словаў рэдактара вынікае, што сабекошт аднаго 8-старонкавага нумару «СБ» складае каля 5000 рублёў, у той час як у шапіках нумар каштуе 400 руб. Улічваючы, што заяўлены наклад газэты — 500 тыс. экзэмпляраў штодзённа, а перад выбарамі спэцвыпуск газэты трапіў у кожную паштовую скрынку, напрошваецца пытаньне: хто даплачвае розьніцу?

«Што тычыцца маральна-псыхалягічнага аспэкту, то, у параўнаньні з тым, што робіць «Советская Белоруссия», — гэта супэрмаральна», — заявіў Алесь Міхалевіч у інтэрвію БелаПАН.

Супольная апэрацыя ФСБ і КДБ

**Як паведаміў журналістам прэс-сакратар ініцыятыўнай групы кандыдата ў прэзыдэнты Аляксандра Лукашэнкі Дзьмітры Косьцін, затрыманьне стала вынікам супольнай апэрацыі Фэдэральнай службы бясьпекі Расеі й Камітэту дзяржбясьпекі Беларусі.**

## ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЬЦЬ



# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84
e-mail: dastauka@tut.by
паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя: **3015 212 000 012** | Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | |
| | | Пеня | |
| | | Всего | |

Кассир — Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя: **3015 212 000 012** | Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

**КВИТАНЦИЯ**

| Вид платежа | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | |
| | | Пеня | |
| | | Всего | |

Кассир — М.П. — Плательщик

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

## Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

## Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьнена. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. Квіток ахвяраваньня трапляе да нас праз 5—10, а часам і болей дзён.

# Шукаем чытачоў!!!

Калі хто ведае наступных чытачоў «НН», просьба падказаць ім скантактавацца з газэтай.

**Чытач з Зарніцы Спасава,** дашліце свой дакладны адрас і прозьвішча.
**Леанід Мікалаевіч Н.** з вул.Калініна, удакладніце свой адрас.
**Сп. Міхайлаў** з вул. Багдановіча, скантактуйцеся з Рэдакцыяй.

**Калі вы не атрымалі газэты**

да панядзелка, а ў Менску — да суботы, абавязкова тэлефануйце ў Рэдакцыю. Пытацца Аляксандру.

Тэлефоны:

(017) 284–73–29,
(029) 618–54–84,
(029) 260–78–32 (МТС)

dastauka@tut.by

## Правілы падачы адрасоў:

Абавязкова падавайце індэкс, бо зь індэксам газэта дойдзе хутчэй.

Калі вы жывяце ў вёсцы ці ў мястэчку, пазначайце раён і вобласьць.

Ня трэба дасылаць квіток, пакіньце яго ў сябе, гэта вашае пацьверджаньне таго, што вы зрабілі ахвяраваньне.

Разборліва падавайце свае зьвесткі.

Атрымліваць газэту можна зь любога нумару, толькі паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас.

**запрашаем прыватных прадпрымальнікаў**

браць газэту на распаўсюд у Менску і рэгіёнах.

**Вельмі просім чытачоў, якія ад Новага году чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

# Просім ахвяраваньняў!

Вельмі просім усіх, хто яшчэ не пераказваў ахвяраваньняў на выхад “Нашай Нівы” ў другім квартале, зрабіць гэта як найхутчэй.

**Шчыры дзякуй за шчодрасьць**

Віктару С., Вользе Г., Кастусю З. зь Віцебску.
Леаніду А. з Гарадка.
С.Р. зь Бярозы.
Мікалаю В. зь Белааазёрску.
Уладзімеру А. з Вушацкага раёну.
Уладзімеру М. зь Менскага раёну.
Алене П., Міхасю Г. з Гомеля.
Віктару К. з Рэчыцы.
Глебу С., Андрэю Л. з Салігорску.
А.Н. з Слуцкага раёну.
М.К., Аляксандру Р. з Наваполацку.
Веры Б. з Стоўпцаў.
Аляксею П., Андрэю Ф., Валер’ю Б., Аляксандру А. з Горадні.
Мікалаю Н. з Барані.
Ларысе Я., Алене П. з Полацку.
Івану В. зь Берасьця.
Сяргею К. з Воршы.
Вячаславу С., Алесю Б. з Баранавічаў.
Сяргею Ч., Віталю К. зь Ліды.
І.Б. з Барысава.
Уладлене Д. з Кобрына.
Антону Т., Канстаціну Я., Сяргею Н. з Жодзіна.
Марыі К. з Наваградскага раёну.
Дзянісу С. з Магілёва.
Андрэю Л. з Жлобіна.
Ігару П. з Маладэчна.
Віктару П. з Валожынскага раёну.
Сяргею У. з Бабруйску.
М.Ш., Алене С., Віктару П., Ж.К., Канстанціну С., Аляксандру К., В.В., Ігару С., Аксане С., Паўлу П., Я.П., Маўлюдзе А., І.Ц., М.А., Канстанціну Т., Станіславу Г., Вячаславу Б., Аляксею К., Максіму К., В.К., С.К., Аўгіньні Б., Рэгіне Б., А.Ш., Тацяне Б. зь Менску.

# Ці варта апазыцыі выступаць у дзяржаўных СМІ?

Віктар Карняенка, Юры Хадыка ды іншыя дзеячы апазыцыі ўзялі ўдзел у ток-шоў «Выбар» на АНТ. Яго паказвалі ў запісе. Зь дзьвюх з паловаў гадзінаў запісу паўтары гадзіны было выразана. У выніку праграма прадказальна ператварылася ў рэкляму А.Лукашэнкі, істотныя выказваньні з крытыкай рэжыму зьніклі, засталіся вырваныя з кантэксту ўрыўкі. Да таго ж, адбылося нібыта «рэйтынгавае галасаваньне» гледачоў, па выніках якога гарант канстытуцыі набраў свае паложаныя 78%. Аўдыторыю моцна пацешыла, што першую тысячу галасоў за Лукашэнку машына налічыла тады, калі яшчэ не былі абвешчаныя нумары тэлефонаў...

Чаму дысыдэнты пагаджаюцца ўдзельнічаць у такіх перадачах? Лічыцца, што трэба выкарыстоўваць кожную магчымасьць выступаць перад людзьмі, нават калі ад тваіх словаў пакідаюць толькі найменш удалыя.

Існуе і іншы падыход. Многія вядомыя інтэлектуалы — Уладзімер Арлоў, Валер Булгакаў ды іншыя — прынцыпова адмаўляюцца ад прапановаў лукашэнкаўскіх СМІ.

Каторы з гэтых падыходаў больш карысны для Беларусі? Адказваюць вядомыя людзі і падпісчыкі «НН».

**Віктар Карняенка, намесьнік старшыні штабу А.Мілінкевіча па арганізацыйна-масавай працы:**

Наш удзел у праграме «Выбар» быў прадыктаваны рашэньнем штабу. Мая ж уласная пазыцыя — толькі жывы этэр. Гэта значна звужае магчымасьці аўтараў такога кшталту перадачаў для маніпуляцыяў. Усе астатнія кантакты пазбаўленыя сэнсу праз адсутнасьць сумленьня ў дзяржаўных журналістаў.

**Яраслаў Раманчук, намесьнік старшыні Аб’яднанай грамадзянскай партыі:**

Безумоўна, ёсьць дылема: працаваць ці не працаваць зь дзяржаўнымі СМІ ва ўмовах, калі канчатковы прадукт залежыць ад аўтараў гэтых перадачаў. Аднак пакуль працягваецца перадвыбарчы пэрыяд і мы маем хоць нейкі доступ да людзей, трэба гэтым карыстацца. Па выбарах можа ня быць і гэтага. Перад апазыцыяй стаіць задача выпрацаваць стратэгію паводзінаў у дачыненьні да дзяржаўнага тэлебачаньня — трэба патрабаваць такіх умоваў, каб не было магчымасьцяў мантажаваць і цэнзураваць нашыя выступленьні. Напрыклад, патрабаваць толькі жывы этэр. Альбо часава абмяжоўваць працягласьць праграмаў.



ПАБЛА ПІКАСА. БЫК І МАТАДОР

**Андрэй Казакевіч, палітоляг:**

Трэба карыстацца любой нагодай, каб данесьці да выбаршчыкаў альтэрнатыўную інфармацыю. Але пры гэтым трэба дакладна пралічваць наступствы і эфэктыўнасьць кантактаў зь дзяржаўнымі СМІ. Калі шкода ад выступленьня на тэлебачаньні ці ў прэсе перавышае ўсю карысьць, то ад такіх выступленьняў трэба адмаўляцца. Маніпуляцыі магчымыя ня толькі з запісаным матэрыялам, але і ў жывым этэры.

**Уладзімер Мацкевіч, палітоляг, былы вядучы ток-шоў «Выбар»:**

СМІ для таго і існуюць, каб іх выкарыстоўваць. І рабіць гэта неабходна, не зьвяртаючы ўвагі на складанасьці. Іншая рэч, што рабіць гэта трэба ўмела. Перш чым прыняць удзел у той ці іншай праграме, трэба выпрацаваць нейкую тактыку паводзінаў, адзінства дзеяньняў. У той праграме ўдзельнічалі палітыкі, якія ня лічаць патрэбным карыстацца нечымі парадамі і кансультацыямі, а такая самадастатковасьць не на руку, калі ты ідзеш запісвацца ў ток-шоў на дзяржаўным тэлеканале. Ад сябе магу прапанаваць жадаючым трэнінгі.

**Адам Глёбус, пісьменьнік:**

Неяк Гогаль сказаў: «Добры пісьменьнік знойдзе, як падмануць цэнзуру». Тое ж можна сказаць і пра палітыка. Палітык — чалавек, які ня можа быць абмежаваны толькі ўласнымі поглядамі, ён публічная асоба і мусіць даносіць свае ідэі да людзей. А для гэтага трэба выкарыстоўваць усе трыбуны. Толькі для гэтага трэба сур’ёзна рыхтавацца. Канфлікты паміж палітыкамі і СМІ — гэта ня толькі спэцыфіка Беларусі. Вазьміце хоць бы Італію: Бэрлюсконі, даведзены журналістамі да адчаю, зьбег пасярод праграмы.

**Генадзь Бураўкін, былы кіраўнік Белдзяржтэлекампаніі:**

Безумоўна, калі ёсьць цьвёрдая гарантыя таго, што думкі дэмакратычных палітыкаў дойдуць да людзей праз СМІ без істотных скарачэньняў і скажэньняў, то ўдзел у такіх праграмах мае сэнс. Аднак практыка паказвае, што дзяржаўнае тэлебачаньне знаходзіцца па-за межамі прыстойнасьці і прафэсыяналізму. Падчас таго ж «Выбару»: палахліва-нахабны Хрусталёў, Ярмошына, Абрамава зь яе пустым і зацягнутым выступам, і ніякіх магчымасьцяў для дэмакратычных палітыкаў адэкватна адказаць. Ім нават як сьлед дагаварыць не давалі. Таму, ня маючы ўпэўненасьці ў канчатковым выніку, ні ў якім разе нельга сябе падстаўляць удзелам у дзяржаўных ток-шоў.

**Адам Шпакоўскі, кандыдат фізыка-матэматычных навук:**

Трэба. Нават калі існуе пагроза цэнзуры, бо людзі такім чынам маюць магчымасьць убачыць сьвежыя твары на экране. А так толькі і чуеш пытаньні: «А хто, калі ня ён?»

**Мікалай Юхнэль, беспрацоўны:**

Я не гляджу БТ…

**Запісаў Сямён Печанко**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Верым.

Нядаўна мяне ў Малым Сітне наведалі некалькі прадпрымальнікаў-пратэстантаў. Звычайныя «чаўнакі», якія аб'езьдзілі з валізкамі салідарнасьцёвую Польшчу першай паловы 1990-х, якія вазілі тавар з Прыбалтыкі часоў дэкалянізацыі і якіх ужо ня грошы, а сэрца паклікала ва Ўкраіну на кіеўскі Аранжавы Майдан, у 2004-м. Яны прыехалі й распавялі, што трэба зрабіць, каб перамагчы 19 сакавіка.

Прапанова была простая: адначасовы агульнанацыянальны пост і малітва. Штопятніцы сьвятары й вернікі розных канфэсіяў разам посьцяць і моляцца за перамены ў Беларусі. Нацыя яднаецца ў духу! Бо апошнія 12 гадоў і нацыянальнаму духу, і лідэрам, і ўсёй краіне галоўнае, чаго не хапала, дык гэта духу. Бо і ў Польшчы, і ў Прыбалтыцы, і ў Сэрбіі, і ў Грузіі, і ва Ўкраіне менавіта малітвы, рэлігійныя гімны і казані ў храмах рыхтавалі мільённыя выступы за свабоду, праўду і справядлівасьць — у 1989-м, 1991-м, 2000-м, 2004-м... Бо супольныя пост і малітва — найвышэйшая ступень салідарнасьці, даступная чалавеку: так дасягаецца салідарнасьць сэрцаў. Бо толькі ў сэрцы можа нарадзіцца цьвёрдае рашэньне дамагчыся перамогі, якое затым рэалізуецца ў аксамітных рэвалюцыях на плошчах. Чалавек, які заўжды баіцца пераменаў, мусіць сьпярша перамагчы сябе — набрацца духу.

Гэтыя сьціплыя вернікі прапанавалі тое, з чаго, у прынцыпе, і трэба пачынаць перамены нацыянальнага маштабу. Маліцца, каб скаланулася ўся краіна. Яднацца духова, каб у вачох Божых стаць не дзесяцьцю мільёнамі людзей на балоце, а *беларускім народам*. Разам марыць, разам верыць, разам каяцца, разам прагнуць, нарэшце, проста быць разам, зьліваючыся ў вадно — вось што значыць *быць нацыяй*! Гэтаму мы вучыліся ўсе 12 гадоў, пакуль Бог дапускаў над намі ўладу Лукашэнкі. Можа быць, у тым, каб урэшце адчуць сябе «агромністай грамадою», і быў сэнс гэтых выпрабаваньняў, зьдзеку, ганьбы, змаганьня. Нарэшце сабрацца разам... Згадайце, як мы штогод перапытвалі сябраў: ну, як думаеш, колькі *народу* зьбярэцца на Дзень Волі? На Чарнобыльскі Шлях?.. І расчароўваліся: пяць... тры... паўтары тысячы... дзьвесьце чалавек... Няўжо гэта ўсё, што засталося ад Беларусі?

...Вось і мне сьпярша падумалася: ну што з тае

## СЬЦІСЛА

### Іх нoравы

У будынку суду 9 сакавіка чалавек у цывільным, адпіхваючы журналістаў, ударыў нагой фотакарэспандэнтку газэты «Наша Ніва» **Юлію Дарашкевіч**.

### Затрыманы пяцікласьнік

9 сакавіка ў Менску міліцыянты затрымалі пяцікласьніка **Пятра М.**: вяртаючыся з школы зь сябрамі, ён наляпіў на ліхтарны слуп налепку «Свабода». Міліцыянт завёў хлопчыка ў пастарунак. Замкнуўшы дзьверы і лаючыся матам, міліцыянты забралі ў школьніка ўсе налепкі.

### Дні беларускай культуры — гэта тэрарызм

У ноч на 8 сакавіка міліцыянты ня выпусьцілі ў Польшчу групу студэнтаў, якая мелася ехаць у Кракаў на Дні беларускай культуры. Зранку 9 сакавіка ў пракуратуру тэлефанаваньнем запрасілі арганізатара паездкі **Дзяніса Дзянісава** для тлумачэньняў. Работнікі пракуратуры заявілі, што маюць інфармацыю: Дзянісаў займаецца ў Кракаве падрыхтоўкай тэрарыстаў.

### Рэктар Баранавіцкага ўнівэру лютуе

З Баранавіцкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту 11 сакавіка адлічаныя моладзевыя актывісты **Андрэй Юруць** і **Віктар Кісьлюк**. Афіцыйная прычына — парушэньне ўнутранага распарадку. Студэнты кажуць, што яны паклалі ў аўдыторыі афіцыйна выдадзеную ўлётку А.Казуліна, атрыманую напярэдадні падчас сустрэчы зь ім.

### Толькі паднімі сьцяг

13 сакавіка ў Менску прайшлі суды над беларускімі і ўкраінскімі грамадзянамі, затрыманымі напярэдадні падчас сустрэчы кандыдата ў прэзыдэнты Аляксандра Мілінкевіча з выбарцамі. Падчас хапуна затрымалі журналістку ўкраінскага 5-га тэлеканалу **Ганну Гаражэнку** падчас жывога этэру, адпусьцілі яе толькі пасьля ўмяшальніцтва польскіх дыпляматаў.

Моладзевы актывіст **Міхаіл Волчак** асуджаны на 12 сутак арышту за «дробнае хуліганства»: хлопца зьбілі пры затрыманьні, зламалі палец на руцэ. З залі суду дастаўлены з тэмпэратурай у бальніцу, дзе яму адмовілі ў шпіталізацыі.

За парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў асуджаныя **Аляксандар Гойшык** (15 сутак), **Павал Кірушчанка, Сяргей Лаўрэнкін, Мацьвей Чысьцік** (па 10 сутак), **Ільля Петравец** (8 сутак), **Уладзімер Высоцкі, Іван Шчарбакоў** (па 3 сутак), **Уладзімер Валодзін** (штраф у 30 б.в.), **Сяржук Мацкойць, Алег Ларычаў** (па 20 б.в.). **Зьміцер Фабішэўскі** дастаў 10 сутак арышту за распаўсюд агітацыйных матэрыялаў, што судзьдзя Натальля Пратасавіцкая кваліфікавала як дробнае хуліганства. Грамадзяне Украіны **Наталля Касарчук**, **Мікола Карпінскі**, **Анатоль Яцэнка** асуджаныя на 10 сутак арышту кожны. Непаўналетняга **Цімура Ліцьвіна** беларускія ўлады выдалі супрацоўнікам украінскай амбасады. Сярод затрыманых грамадзянаў Украіны называюць таксама **Арцёма Бажэньскага** і **Ігара Галубіцкага**, зь беларусаў — **Валянціна Сакалоўскага, Аляксандра Макаева**.

### Прэвэнтыўныя арышты ў Менску

8 сакавіка пасьля сустрэчаў Мілінкевіча з выбарцамі затрымалі **Вінцука Вячорку, Аляксандра Зялко, Сержука Лянцэвіча, Арцёма Ліцьвінку** (хворага на астму), **Зьмітра Кудраўцава, Аляксандра Паўлоўскага, Пятра Бабарэку, Уладзімера Грыдзіна**. На наступны дзень іх асудзілі на 15 сутак арышту.

Тры супрацоўнікі палка міліцыі спэцыяльнага прызначэньня ў цывільным (Юры Аксюта, Аляксей Іваноў і Сяргей Жур) затрымалі 10 сакавіка дэпутата Вярхоўнага Савету XII склікання, аднаго зь лідэраў рабочага руху **Сяргея Антончыка** разам з сынам **Аляксандрам**. Іх зьвінавацілі, што брыдкасловілі на вуліцы ды не падпарадкоўваліся міліцыянтам, і асудзілі на 15 сутак арышту. За краты С.Антончык накіраваўся з цэлым пакетам лекаў: у яго хворае сэрца.

13 сакавіка быў затрыманы журналіст **Андрэй Пачобут**.

Моладзевага актывіста **Аляксея Шыдлоўскага** затрымалі 8 сакавіка падчас раздачы налепак. Дома ў яго правялі ператрус: шукалі «бомбу».

10 сакавіка зь Менскага політэхнічнага каледжу выключылі моладзевага актывіста **Барыса**

# Можам. Пераможам!

вёсачкі... Але Малое Сітна — гэта самае месца, каб маліцца за ўсю Беларусь. Бо гэта дно. Дно, ад якога трэба адштурхнуцца, каб выплыць. Бо ў глыбіні душы і «чыстыя, толькі пасьля Дажынак», беларускія раённыя гарадкі, і «ўпрыгожаныя лядовымі палацамі» абласныя цэнтры, і забудаваны новымі пірамідамі горад-герой Мінск, па сутнасьці, застаюцца *вялікім Малым Сітнам*.

12 гадоў каштоўнасьці гэтае гіганцкае вёскі вычэрпваліся трыядай «Чарка. Скварка. Лукашэнка». Але гэтых гадоў аказалася досыць, каб зразумець: «Ня хлебам адзіным жывы чалавек...» А чым жа? «...А ўсякім словам, якое сыходзіць з вуснаў Божых» (Мацьвея 4:4). Таму зараз на кухнях і ў аўдыторыях, на вуліцах і плошчах беларускіх гарадоў гучаць тры іншыя словы, у Бібліі адныя з найчасьцейшых:

Свабода. Праўда. Справядлівасьць.

Менавіта таму за Мілінкевіча зараз ня толькі Менск, Горадня, Віцебск, Жодзіна... За Мілінкевіча — Малое Сітна й Алёшча, тысячы занядбаных беларускіх вёсачак, якія прагнуць свабоды, праўды й справядлівасьці.

Зараз, калі вы чытаеце гэтыя радкі, тысячы беларускіх каталікоў, праваслаўных, уніятаў і пратэстантаў моляцца да Ўсёмагутнага Бога, просяць Усявышняга, проста крычаць ад болю на ўвесь голас да Творцы ўсяго існага: Божа! Дай Давыду перамагчы Галіяфа!..

Тая пятніца, калі вы атрымаеце гэтую «Нашу Ніву», будзе апошняй перад 19 сакавіка, каб пераадолець 12 гадоў бязьвер'я, нямогласьці, паразаў, ужо ў гэтую пятніцу трэба станавіцца поплеч на шляху да перамогі. Пасьціць. Маліцца. «Па веры вашай будзе вам», кажа Ісус у Эвангельлі (Мацьвея 9:29). Зьбірайцеся з духам. Выходзьце на плошчу, дзе ўпершыню за гэтыя гады нарэшце *зьбярэцца нацыя*. Выходзьце хаця б паглядзець, колькі нас і хто мы! І ня проста гукайце, бы ў лесе, а абвяшчайце ўладу Боскую і ўладу беларускую па-над гэтай краінай:

ВЕРЫМ! МОЖАМ! ПЕРАМОЖАМ!

*Малое Сітна*

> Гэта дно, ад якога трэба адштурхнуцца, каб выплыць.

## СЬЦІСЛА

**Гарэцкага**, студэнта–выдатніка 3–га курсу аддзяленьня мікраэлектронікі. Адміністрацыя каледжу спаслалася на тое, што трэцякурсьнік парушыў правілы ўнутранага распадрадку: яго арыштавалі на 15 сутак за ўдзел у акцыі Дзень салідарнасьці 16 лютага. Неафіцыйна ж паведамілі, што загад на адлічэньне прыйшоў з Камітэту дзяржаўнай бясьпекі. У гэты ж дзень аўтамабіль, у якім ехаў **Б.Гарэцкі** зь **Яўгенам Сакаловым**, затрымалі супрацоўнікі міліцыі: абвясьцілі, што шукаюць зброю й наркотыкі. Хаця ў машыне не знайшлі нічога крымінальнага, хлопцаў завезьлі ў пастарунак, дзе трымалі некалькі гадзінаў.

10 сакавіка міліцыянты затрымалі моладзевага актывіста **Аляксея Ляўковіча, Паўла Юхневіча і Максіма Вінярскага**. Ляўковіча асудзілі на 15 сутак, зьвінаваціўшы ў дробным хуліганстве.

9 сакавіка невядомыя схапілі ў Менску непаўналетняга актывіста **Антона Акуліча** з Барысава падчас распаўсюду агітацыйнай літаратуры: яго запхнулі ў чырвонае «пэжо» і зьвезлі ў Заводзкі РУУС, дзе зьбівалі (білі ў сонечнае спляценьне). Адпусьцілі Антона толькі праз 6 гадзінаў.

**Паўла Давідовіча** затрымалі 11 сакавіка ў цэнтры Менску. Ва ўскраінным мікраёне Сухарава ў гэты ж дзень затрымалі **Алеся Зарамбюка** з Мастоў, **Сяргея Марчыка** з Баранавічаў і **Зьмітра Мацельскага** з Барысава, актывістаў групы Мілінкевіча: на іх склалі пратаколы за расклейку агітацыі ў не прызначаных для гэтага месцах.

11 сакавіка каля станцыі мэтро «Інстытут культуры» затрыманыя моладзевыя актывісткі **Юлія Гарачка** і N. падчас раздачы агітацыйнай літаратуры. Дзяўчат даставілі ў міліцыю мэтрапалітэну, дзе склалі на іх адміністрацыйныя пратаколы за «незаконны распаўсюд друкаваных выданьняў».

У Менску 13 сакавіка моладзевага актывіста **Алега Лабатага**, затрыманага напярэдадні, асудзілі на 3 сутак: яго зьвінавацілі, што нецэнзурна лаяўся ў грамадзкім месцы.

### ...і ў Калінкавічах

У Калінкавічах 9 сакавіка былі затрыманыя і асуджаныя на 15 сутак «за хуліганства» **Аляксей Маневіч** і **Дзяніс Рабянок**, актывісты А.Мілінкевіча. У судзе зьвінавачаныя заявілі, што міліцыянты самі справакавалі бойку: невядомыя абкідалі іх сьнежкамі, а міліцыянты затрымалі хлопцаў, якія нібыта пачалі брыдка лаяцца.

### Берасьце

У памяшканьні штабу А.Мілінкевіча 7 сакавіка актывісты знайшлі падслухоўвальную апаратуру: пра яе знаходжаньне даведаліся з ананімнага ліста, падпісанага супрацоўнікамі КДБ.

**Андрэя Шаранду** і **Алесю Худасоўцаву**, агітатараў за А.Мілінкевіча, 6 сакавіка запалохвалі міліцыянты: зьвінавачвалі, што «разьмяшчаюць агітацыйныя матэрыялы ў неналежных месцах», хаця агітатары раздавалі матэрыялы.

7 сакавіка на групу агітатараў за А.Мілінкевіча (**Ірына Лаўроўская, Канстанцін Турчаняк, Сяргей Вакуленка, Сьцяпан Навасельчан, Аляксандар Дзенісенка, Коўш** і інш.) напала ахова Берасьцейскага політэхнічнага ўнівэрсытэту і стала біць. Агітатары выклікалі міліцыю.

**І.Лаўроўскую** й **К.Турчаняка**, агітатараў за **А.Мілінкевіча** ў Берасьці, затрымалі яшчэ й 9 сакавіка.

### Жлобін

Міліцыянты спынілі 6 сакавіка аўтамабіль **Віктара Карняенкі** й канфіскавалі 28 тыс. улётак А.Мілінкевіча, заявіўшы, што слоган «Мілінкевіч — будучы прэзыдэнт» «парушае выбарчае заканадаўства».

### Магілёў

7 сакавіка на чыгуначным вакзале міліцыянты затрымалі **Віталя Васількова**, зьвінаваціўшы яго ў перавозе фальшывых даляраў. Фальшывых не знайшлі, затое канфіскавалі ўсе наяўныя.

Пасьля сустрэчы з выбарцамі 7 сакавіка **Анатоля Лябедзьку** аштрафавалі на 50 базавых велічыняў (1 млн 550 тыс.), а **Ўладзімера Шанцава**, кіраўніка абласнога штабу Мілінкевіча, арыштавалі на 15 сутак.

Моладзевага актывіста **Артура Бадаева** 9 сакавіка адлічылі з 4–га курсу Магілёўскага політэхнічнага каледжу. Афіцыйная прычына — «акадэмічная непасьпяховасьць»: Артуру не далі магчымасьці здаць пісьмовыя работы. Актывіст кажа, што на яго ціснулі супрацоўнікі КДБ, намаўляючы на супрацу. Ён адмовіўся ад вэрбоўкі

# Паміж палітычнай цемрай і сьвятлом свабоды

## Прэм'ер-міністар Славаччыны верыць у перамогу 19 сакавіка

Кіраўнік ураду Мікулаш Дзурында выступіў з заявай з нагоды прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі. Ліст пачынаецца наступнымі словамі: «У нядзелю народ Беларусі будзе абіраць новага прэзыдэнта. Беларусы стануць перад выбарам паміж палітычнай цемрай і палітычнай свабодай». За тры дні да гэтага, 16 сакавіка, пройдзе чарговы Дзень салідарнасьці, калі беларусы будуць на сваіх падваконьнях запальваць сьвечы памяці. Падобная акцыя ў Славаччыне мела нечаканыя вынікі. «18 гадоў таму [1988], калі савецкі камунізм усё яшчэ акупаваў Усходнюю Эўропу, людзі ў Браціславе, сталіцы маёй радзімы, вырашылі запаліць сьвечкі на галоўнай плошчы. Яны прыйшлі проста памаліцца пры сьвятле сьвечак за свабоду веравызнаньня, за незалежнасьць і за канец тыраніі таталітарызму. У той дзень кіраўнічы рэжым задушыў пратэсты, але нейкім чынам гэтыя агеньчыкі, якія на кароткі час прымусілі адступіць цемру, не пагасьлі. Праз 20 месяцаў гэты рэжым абрынуўся, і ў Цэнтральную Эўропу прыйшла свабода», — зазначае славацкі кіраўнік.

Мікулаш Дзурында верыць, што беларускі народ 19 сакавіка зробіць правільны выбар — «і свабодная і дэмакратычная Беларусь стане найлепшым домам для сваіх людзей і іхных дзяцей і добрым суседам для Эўропы і Расеі, а не экспартэрам палітычных уцекачоў».




13 сакавіка. Акцыя салідарнасьці ў Брусэлі, зладжаная бэльгійскімі ўкраінцамі.

14 сакавіка. Акцыя пратэсту перад беларускай амбасадай у Вільні супраць арыштаў у Беларусі.



## ХРОНІКА

і быў адлічаны з каледжу.

11 сакавіка міліцыя правярала ўсе машыны, якія ехалі з Воршы на Магілёў. У самім горадзе двойчы затрымлівалі актывіста БСДП (Грамада) **Мікалая Расюка**: за тое, што нёс недзяржаўную газэту «Народная воля» і за тое, што агітаваў за А.Казуліна на прывакзальным рынку.

12 сакавіка міліцыянты затрымалі **Ірыну Качарову** й **Эдуарда Абакановіча**, якія расклейвалі плякаты кандыдата ад аб'яднанай апазыцыі на рэклямных тумбах. Міліцыянты заявілі, што Магілёўскі гарвыканкам дазволіў расклейваць плякаты толькі ў месцах, вызначаных для сустрэчаў з выбарцамі, і склалі адміністрацыйны пратакол на актывістаў. Падчас раздачы агітацыйных улётак 12 сакавіка былі затрыманыя **Дана Смычкова, Алена Лаўрыновіч, Сяржук Нягацін** і **Сяржук Гіркін.**

### Прэса

Смаленская друкарня 13 сакавіка адмовіла ў друку газэтам «Народная воля», «Товарищ», «БДГ. Деловая газета», спаслаўшыся на эканамічныя прычыны. Раней пад ціскам беларускіх уладаў былі зьнятыя бігборды з партрэтам А.Мілінкевіча, выстаўленыя з расейскага боку мяжы.

Вышэйшы гаспадарчы суд прыпыніў выхад газэты «Згода» яшчэ да судовага працэсу. Зроблена гэта на патрабаваньне Міністэрства юстыцыі, якое палічыла, што газэта можа да суду «груба парушыць патрабаваньні Закону аб друку».

### Палітвязьні

7 сакавіка стала вядома, што палітвязень **Сяргей Скрабец** патрапіў у турэмны шпіталь у Менску: пачаўся прыступ падагры.

Палітвязьня **Андрэя Клімава**, які адбывае тэрмін абмежаваньня волі ў вёсцы Баршчоўка Рэчыцкага раёну, 13 сакавіка асудзілі на 7 сутак арышту, зьвінавацілі ў абразе работнікаў пракуратуры. Палітвязень мяркуе, што гэта зроблена з боязі, што ён уцячэ ў Менск на 19 сакавіка.

### Віцебск

8 сакавіка міліцыянты затрымалі **Арцёма Хадыку** і **Алега Сідарава** — агітатараў за А.Мілінкевіча. Хрыстафору Жаляпаву, які прыехаў вызваляць юнакоў, міліцыянты паведамілі, што іх запрасілі на размову.

У Віцебску суд 9 сакавіка аштрафаваў **Барыса Хамайду** па дзьвюх адміністрацыйных справах. За парушэньне правілаў прадпрымальніцкай дзейнасьці (ён прадаваў незалежныя газэты) — штраф у 21 б.в. За паўторнае на працягу году парушэньне парадку правядзеньня грамадзкіх мерапрыемстваў —151 б.в.: у верасьні яго затрымалі за пікет да Дня беларускай вайсковай славы, а 22 лютага — за пікет, які заклікаў да байкоту прэзыдэнцкіх выбараў.

10 сакавіка ў Чыгуначным судзе Віцебску Хамайду аштрафавалі яшчэ на 16 б.в. за выхад з плякатам «Байкот — наша маральная перамога». У суме штраф складае блізу 6 млн руб.

У Віцебскім дзяржунівэрсытэце 10 сакавіка затрымалі на пяць гадзінаў юнакоў **Віталя Броўку** і **Дзяніса Дзянісава**. Вось як апісвае падзеі кіраўнік выбарчага штабу Мілінкевіча па Віцебшчыне Хрыстафор Жаляпаў. Дэкан факультэту беларускай культуры Віцебскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Машэрава Віктар Несьцяровіч а 16-й у аўдыторыі 212 галоўнага корпусу ВДУ праводзіў са студэнтамі 4—5 курсу сустрэчу, прысьвечаную выбарам прэзыдэнта. На сустрэчы В.Несьцяровіч абвясьціў, што ўсе студэнты павінны прагаласаваць да 17 сакавіка 2006 г.

На гэтай сустрэчы прысутнічалі прадстаўнікі перадвыбарнага штабу Мілінкевіча Віталь Броўка і Дзяніс Дзянісаў, якія ўказалі дэкану на неправамоцнасьць яго дзеяньняў. У адказ Несьцяровіч выклікаў міліцыю і да яе прыбыцьця пры садзейнічаньні супрацоўнікаў Службы парадку ВДУ і першага прарэктара Андрушкевіча ўтрымліваў Дз.Дзянісава і В.Броўку. Супрацоўнікі аб'яднаньня «Ахова» Першамайскага раёну Віцебску,



**12 сакавіка. Грандыёзны канцэрт «Solidarni z Białorusią» ў Варшаве. Сьпявалі «N.R.M.», «Крама», Кася Камоцкая, ліцэісты-коласаўцы.**





Украінская пісьменьніца, актыўная ўдзельніца Памаранчавай рэвалюцыі **Аксана Забужка** зьвярнулася да беларусаў напярэдадні выбараў.

# Беларусь на шляху вызваленьня

«Якімі б ні былі прыпынкі на шляху, асноўная тэндэнцыя гістарычнага разьвіцьця — гэта ўсё адно эскаляцыя свабоды. Зірніце на Эўропу 100 ці 50 гадоў таму і на Эўропу сёньня, гэта ўсё адно — шлях вызваленьня, шлях ачышчэньня ад таталітарызму, аўтарытарызму, шлях вызваленьня народу, той самы, які пачаўся ў XIX стагодзьдзі і на якім мы, Украіна і Беларусь, апынуліся ў апошніх вагонах.

Я б хацела, каб беларуская інтэлігенцыя не забывалася, што нельга адчапіць гэты самы вагон ад цягніка, што якімі б ні былі прыпынкі, затрымкі, перашкоды, усё адно нельга губляць надзею і цярпеньне і трэба рабіць усё, каб адбывалася павелічэньне прасторы для свабоды духу ўжо ў жыцьці гэтага пакаленьня. І гэта абавязкова прынясе плён».

## ХРОНІКА

што прыбылі ва ўнівэрсытэт, высьветлілі асобы В.Броўкі і Дз. Дзянісава і заявілі, што ня маюць да затрыманых прэтэнзій і падстаў для затрыманьня, паколькі ў іх дзеяньнях няма складу правапарушэньня. Аднак В.Несьцяровіч настойваў на затрыманьні і напісаў заяву, дзе абвінаваціў В.Броўку і Дз.Дзянісава ў дзеяньнях хуліганскага характару, якія праявіліся ў парушэньні грамадзкага парадку. У выніку В.Броўку і Дз.Дзянісава ўсё-такі затрымалі і пратрымалі шэсьць гадзін у Першамайскім РУУС.

### Масты

7 сакавіка дэпутат Мастоўскага райсавету **А.Зарамбюк** атрымаў паведамленьне з суду, што яго завочна асудзілі й аштрафавалі на 10 б.в. (310 тыс.). За канфіскаваныя каляндарыкі з партрэтам Мілінкевіча яго зьвінавацілі ў парушэньні выбарчага заканадаўства, бо на час канфіскацыі (12 студзеня) Мілінкевіч яшчэ ня быў зарэгістраваны кандыдатам у прэзыдэнты.

### СуднадКазаковым і Зубром

У Менску 9 сакавіка пачаўся суд над моладзевымі актывістамі з Барысава **Аляксандрам Казаковым** і **Зьмітром Зубром**, зьвінавачанымі ў супраціве міліцыянтам. Паколькі З.Зубро хварэе і ня можа ўдзельнічаць у працэсе, суд быў перанесены на 7 красавіка.

### Бабровічы, Калінкавіцкі раён

На грамадзкага актывіста **Канстанціна Каваленю** з пасёлку Бабровічы Калінкавіцкага раёну 9 сакавіка завялі крымінальную справу паводле арт.206 ч.1 («Адкрытае выкраданьне маёмасьці»). Інваліда III групы вінавацяць у тым, што ён нібыта скраў ровар у прадстаўніцы мясцовай вэртыкалі Валянціны Пурахоўскай. «Сьведкі» кажуць, што бачылі чалавека, «падобнага да Кавалені», які цягнуў на сабе ровар, тым часам як Каваленю нельга падымаць рэчы, цяжэйшыя за 5 кг. На жонку і сына актывіста, якія даводзілі сьледзтву, што зьвінавачаны меў алібі, распачалі крымінальную справу за «ілжывыя сьведчаньні». Каваленя кажа, што прэсынг пачаўся пасьля таго, як ён заявіў Пурахоўскай, што зробіць усё, каб яна ня стала старшынёй участковай выбарчай камісіі.

### Масты

На грамадзкага актывіста **Андрэя Панасіка** з Мастоў раённая пракуратура 10 сакавіка распачала крымінальную справу: яго вінавацяць у прыналежнасьці да незарэгістраванай арганізацыі «Партнэрства».

### Шчучын

11 сакавіка ў Шчучыне на допыт выклікалі **Васіля Бязьмена** як сьведку ў крымінальнай справе **Сяргея Ляшкевіча**, якога вінавацяць у арганізацыі тэрарыстычных групаў. Самому Ляшкевічу прыйшла позва ў ваенкамат на 20 сакавіка — на мэдагляд, хоць ён зьняты з вайсковага ўліку паводле ўзросту.

### Жлобін

Крымінальную справу спрабуюць завесьці на моладзевага актывіста з Жлобіна **Эдварда Зелянкова:** яго вінавацяць у графіці на будынках. 13 сакавіка яго выклікалі на адміністрацыйную камісію, дзе паведамілі, што матэрыялам справы займаецца КДБ.

### Гомель

9 сакавіка на **Алега Шабетніка**, актывіста гомельскага выбарчага штабу А.Казуліна, міліцыянты склалі адміністрацыйны пратакол за парушэньне парадку агітацыі: 8 сакавіка ён з групай актывістаў раздаваў гамяльчанкам віншаваньні ад імя кандыдата ў прэзыдэнты каля ўнівэрмагу «Гомель».

Міліцыянты 9 сакавіка затрымалі агітатараў **Кацярыну Церашкову** і **Ўладзімера Шуміліна**, якія раздавалі буклеты А.Мілінкевіча: на іх склалі пратаколы за парушэньне выбарчага заканадаўства.

### Барысаў

У Барысаве падчас распаўсюду агітацыйнай літаратуры 7 сакавіка Яны прыйшлі дадому да **Івана**




**Вінцук Вячорка з жонкай і маці ў залі суда.**

## ХРОНІКА

**Романа** і да **Анатоля Хацька,** аднак прысутныя не пусьцілі міліцыянтаў.

### Бяроза

Суд Бярозаўскага раёну 9 сакавіка пакараў **Ларысу Мажэйку**, зьбіральніцу подпісаў за А.Казуліна, штрафам у 3 б.в. Падставай стала паведамленьне раённай выбарчай камісіі: у часе праверкі подпісаў камісія нібыта даведалася, што 2 подпісы былі сабраныя людзьмі, якія не ўваходзяць у ініцыятыўную групу.

10 сакавіка з аналягічнага абвінавачаньня на 5 б.в. аштрафавалі **Аляксандра Кузьміна**, зьбіральніка подпісаў за А.Казуліна. Заслуханая на судзе сьведка паведаміла, што ня памятае, хто канкрэтна зьбіраў подпісы, але прыйсьці ёй парэкамэндавалі работнікі ідэалягічнага аддзелу Бярозаўскага райвыканкаму.

### Полацак

10 сакавіка служба аховы Полацкага ўнівэрсытэту затрымала выкладчыка **Аляксея Кавалёва** й **Аляксея Трубкіна**, якія раздавалі студэнтам перадвыбарчую праграму А.Мілінкевіча. А.Кавалёва рэктар Дзьмітры Лазоўскі абвінавацiў у злоўжываньні службовымі паўнамоцтвамі й пазбавіў прэміі за сакавік. А.Трубкіна даставілі ў пастарунак, адкуль адпусьцілі, пераканаўшыся, што парушэньня закону няма.

Выбарчыя камісіі ў Наваполацку 13 сакавіка адмовілі ў рэгістрацыі назіральнікам **Міхаілу Чадаеву** і **Валеру Шаўчэнку** (ГА «Беларускі рэспубліканскі клюб выбарцаў»).

### Мазыр

10 сакавіка падчас расклейкі плякатаў Мілінкевіча міліцыянты затрымалі **Рыгора Крывіцкага** і **Ўладзімера Целепуна**: іх вінавацяць у тым, што клеілі плякаты ў «неналежным месцы» — на прыпынку.

### Асіповічы

**Алену Мядзьведзеву** й **Ірыну Міхалап**, агітатарак за А.Казуліна, затрымалі 10 сакавіка каля гарвыканкаму, калі яны раздавалі афіцыйна выдадзеныя перадвыбарчыя ўлёткі. Нядоўга пратрымаўшы ў пастарунку, іх усё ж адпусьцілі.

11 сакавіка ў пастарунак патрапіў актывіст БНФ **Ігар Сімбіроў**, які вяртаўся дадому пасьля працы ў Маскве: яго падазравалі, што прывёз грошы ў рэгіянальны штаб А.Мілінкевіча. Аднак знайшлі толькі налепкі з партрэтам кандыдата ў прэзыдэнты. Сімбіроў пасьпеў затэлефанаваць сябрам і сказаць, што яго запалохваюць, б'юць, не даюць вады. Яго засудзілі на 10 сутак арышту, зьвінаваціўшы, што скандаліў у цягніку.

### Горкі

10 сакавіка ў Горках міліцыянты затрымалі актывіста КХП—БНФ, пратэстанта **Пятра Малачкіна**: ён падаваў заяўку на пікет пажылых жыхароў супраць дзеяньняў камунальных службаў і гарадзкіх уладаў. Заяўніка затрымалі, у кватэрах многіх з удзельнікаў адбыліся ператрусы бяз санкцыі пракурора. 11 сакавіка Горацкі раённы суд вынес Малачкіну папярэджаньне.

У Горках 12 сакавіка міліцыянты канфіскавалі агітацыйную літаратуру (улёткі й плякаты А.Мілінкевіча і А.Казуліна, нумары газэты «Народная воля»), што належала мясцоваму актывісту **Эдуарду Брокараву**, які захоўваў яе ў гаражы свайго знаёмца. Гараж быў узламаны трыма міліцыянтамі і невядомым супрацоўнікам у цывільным.

### Бабруйск

10 сакавіка каля штабу адзінага затрымалі дэпутата гарсавету **Алеся Чыгіра** (кіраўніка штабу) і яшчэ трох актывістаў. Іх выпусьцілі з пастарунку праз гадзіну, ня выставіўшы абвінавачаньняў. Па некаторым часе гэтаксама затрымалі групу на чале з актывістам Партыі БНФ **Дзянісам Шэйкам**.

11 сакавіка затрымалі **А.Чыгіра**, **Мікіту Буцэнку** ды трох прадстаўнікоў БНФ і незарэгістраванай Партыі свабоды і прагрэсу, якія агітавалі за А.Мілін-

Яшчэ адзін сайт бязьлітаснай палітычнай карыкатуры б'е рэкорды папулярнасьці.

# «Белжаба» не здаецца

Стваральнік гумарыстычнага інтэрнэт-праекту «Беларуская жаба» (www.belzhaba.com) Майк кажа, што праца над ім — сродак зьняцьця стрэсу: «Намалюеш колькі «жабаў» пасьля працы — адразу спакайнееш».

Ягоны сайт ёсьць лідэрам па наведвальнасьці ў разьдзеле «Гумар» лічыльніка «Акавіта». Жарты зь «Белжабы» адразу ж становяцца гітамі інтэрнэтаўскай субкультуры. Апошні гіт — «Галасуем за інтэлект!»: чалавек, падобны на цяперашняга прэзыдэнта, адклаўшы фаліянт «В.Быкаў. Вершы», задумліва схіліўся над кнігай мэмуараў «Ф.Скарына. Мой Піцер».

Асноўная тэма для «фатазьдзекаў» — гульня са слоганам «За Беларусь». На гэты конт на «Белжабе» можна знайсьці дзясяткі малюнкаў: ад ляканічнага «ЗАдрал» да трапнага «За таго, хто плаціць» з выяваю ўдзельнікаў агітканцэртаў.

Сьпярша Майк ствараў каляжы самастойна, але потым заняўся зборам малюнкаў у Інтэрнэце. Цяпер сайт называюць «жабасховішчам» — чым бліжэй да выбараў, тым часьцей даводзіццааднаўляцца. «Шкада, што праект занадта палітызаваны. Хацелася б ствараць жабы і на іншыя тэмы, — прызнаецца Майк. — Але я разумею, што гэта рэакцыя людзей на тую колькасьць ідэалягічнай бязглуздзіцы, якая выліваецца дзяржавай». Таму Майк пакуль пазыцыянуе праект як «хуліганскі спосаб пратэсту супраць абалваньваньня насельніцтва». Кажа, калі ў краіне ўсё зьменіцца да лепшага — адразу памяняе гідкі чырвона-зялёны дызайн сайту. «Пры зьмене ўлады «Жаба» толькі выйграе — тады зьявіцца разнастайнасьць сярод герояў. Пакуль жа дамінуе толькі адзін».

Малюнкі з праекту «Белжаба» ўвойдуць у CD-праект, які рыхтуе грамадзкая ініцыятыва «Трэці шлях» разам зь песьнямі праекту «UltraВожык» і флэш-мультфільмамі Алега Мініча.

**Сяргей Будкін**







**«Жаба» на кампутарным слэнгу — сатырычны каляж, апрацаваны з дапамогай графічных рэдактараў. Сайт мае адмыслова нязручна абранае рашэньне колераў. «Наш дызайн можа паказацца гідкім толькі прадажным апазыцыянэрам, бо ён увабраў у сябе колеры нашага роднага сьцягу!» — тлумачаць на галоўнай старонцы стваральнікі.**

## ХРОНІКА

кевіча: міліцыянты правяралі законнасьць надрукаваных улётак.

Актывіста Партыі БНФ **Ігара Ходзьку** 11 сакавіка міліцыянты затрымалі й правялі надгляд ягоных рэчаў, спаслаўшыся на тое, што адбыўся крадзеж і шукаюць злодзея.

### Штраф за сход на кватэры

9 сакавіка першы намесьнік старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычна партыі (Грамады) **Анатоль Ляўковіч** атрымаў паведамленьне, што ён囗аштрафаваны на 150 б.в. 21 лютага ў Гомелі ён сустракаўся на прыватнай кватэры з актывістамі партыі, калі туды ўварваліся міліцыянты, а да пад'езду падагналі 7 міліцэйскіх аўтамабіляў. Міліцыянты патлумачылі, што шукаюць віетнамцаў-нелегалаў, і перапісалі пашпартныя зьвесткі ўсіх прысутных, а на Ляўковіча распачалі адміністрацыйную справу за несанкцыянаваны сход. Хоць 27 лютага А.Ляўковіч зьвярнуўся ў пракуратуру з скаргай на незаконныя дзеяньні міліцыі, гомельскую судзьдзю М.Дамненку гэта не спыніла: 2 сакавіка ў адсутнасьць А.Ляўковіча яна разгледзела адміністрацыйную справу і пакарала яго штрафам.

### Крупкі

У вёсцы Дакудава Крупскага раёну на настаўніка **Васіля Лапаціна** 10 сакавіка завялі адміністрацыйную справу і абвінавацілі ў антысанітарыі: ён разьвесіў 6 абвестак пра сустрэчу з актывістам штабу А.Мілінкевіча, лідэрам Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатолем Лябедзькам. Каб асудзіць, прыдумалі такі довад: «вёска ня ўнесеная раённым начальствам у сьпіс населеных пунктаў, дзе можна сустракацца з удзельнікамі прэзыдэнцкай кампаніі».

### Рэчыца

13 сакавіка ў Рэчыцы пачаўся суд над **Валер'ем Пуціцкім**, актывістам кампаніі А.Мілінкевіча. Яго затрымалі 12 сакавіка, зьвінавацілі ў дробным хуліганстве. Судовы працэс адклалі да 17 сакавіка праз адсутнасьць сьведкаў.

### Перасьлед за веру

На япіскапа Саюзу хрысьціянаў веры Эвангельскай па Менскай вобласьці **Сяргея Цвора** на пачатку сакавіка склалі пратакол за несанкцыяванае богаслужэньне (без дазволу выканкаму). С.Цвору пагражае штраф ад 30 да 150 б.в. альбо зьняволеньне ад 3 да 15 сутак.

### Драгічын

11 сакавіка **Васіля Ракопчыка**, агітатара за А.Мілінкевіча, затрымалі падчас распаўсюду інфармацыі пра сустрэчу з кандыдатам у прэзыдэнты. На яго склалі адміністрацыйны пратакол за антысанітарыю і трымалі ў пастарунку 5 гадзінаў.

### Суд спалохаўся

Суд Маскоўскага раёну 13 сакавіка адмовіўся разглядаць справы **Мікалая Цяцёркіна, Сяргея Кастыленкі, Івана Лабачова, Уладзімера Казуліна**, актывістаў штабу кандыдата ў прэзыдэнты А.Казуліна, затрыманых 2 сакавіка. Судзьдзя Надзея Равуцкая заявіла ім, што не выклікала (хаця ва ўсіх на руках былі позвы). Старшыня суду Анатоль Савіч адмовіўся разглядаць справы, спаслаўшыся, што дакумэнты аформлены няправільна.

### Пінск

Пінскі гарадзкі суд 13 сакавіка адмовіў **Аляксандру Аўсеенку**: актывіст штабу А.Мілінкевіча дамагаецца скасаваньня папярэджаньня, якое вынес яму гарвыканкам падчас збору подпісаў. Аўсеенку зьвінавацілі, што замінаў хадзіць па вуліцы ды сьмеціў. Днямі суд аштрафаваў яго яшчэ й на 4 б.в. за парушэньне выбарчага заканадаўства падчас збору подпісаў. Актывіст мае скардзіцца ў Берасьцейскі аблсуд.

### Не пусьцілі

**Дэпутатам Эўрапарлямэнту**, якія хацелі прыехаць у Менск назіраць за выбарамі, беларускія ўлады 13 сакавіка адмовілі ў выдачы візаў.

**АШ**




СЯРГЕЙ ГРЫЦ

**Удзельнік БРСМаўскага пікету спрабуе ўдарыць фатографа «НН» Андрэя Лянкевіча падчас сустрэчы А.Мілінкевіча з выбарцамі Берасьця.**



ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
СВЕТЛАГОРСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
СВЕТЛОГОРСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

[illegible]

Руководителю предприятия

Под Вашу персональную ответственность прошу обеспечить организованное прибытие работников предприятия, не задействованных в технологическом процессе, к 18.00 на Центральную площадь для участия в [illegible] мероприятии «За сильную, процветающую Беларусь» с участием звёзд Белорусской эстрады. В акции примут участие Председатель Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь В.Н.Коноплев и председатель Гомельского облисполкома А.С.Якобсон.

Руководитель предприятия лично регистрирует прибывших у фойе здания райисполкома по адресу [illegible]

Председатель райисполкома [illegible]

[illegible]

**Такі дакумэнт патрапіў у рэдакцыю «»Нашай Нівы».**

## ХРОНІКА

### Любань

У Любані 12 сакавіка падчас раздачы «Народнай волі» й агітацыйных улётак А.Мілінкевіча каля гарадзкога рынку былі затрыманыя моладзевыя актывісты **Зьміцер Ефімовіч, Вячаслаў Гурленя, Іван Шыла**. Міліцыянты заявілі, што хочуць высьветліць асобы затрыманых, хаця актывісты адразу паказалі ім пашпарты. Пратрымалі хлопцаў 1,5 гадзіны, але выпусьцілі, не складаючы пратаколаў, і нават вярнулі ўсю друкаваную прадукцыю.

### Беразіно

У Беразіне 13 сакавіка міліцыянты–аўтаматчыкі затрымалі **Андрэя Скарабагатаdа**, які расклейваў абвесткі пра сустрэчу з Анатолем Лябедзькам, даверанай асобай А.Мілінкевіча. Міліцыянты заявілі, што абвесткі незаконныя, і завезьлі актывіста ў пастарунак. Аднак там было вырашана, што нічога незаконнага ў абвестках няма.

### Выпусьцілі пад заклад

**Антона Філімонава**, сына забітай журналісткі Веранікі Чаркасавай, 13 сакавіка выпусьцілі пад заклад. Ад 30 сьнежня 2005 г. Антона, не зважаючы на хранічныя захворваньні, трымалі ў менскім СІЗА №1 па абвінавачаньні ў падробцы грошай.

### Хваля прэвэнтыўных затрыманьняў у аўторак

14 сакавіка па Беларусі пракацілася чарговая хваля арыштаў і затрыманьняў актывістаў выбарчай кампаніі.

У Берасьці затрымалі **Сьцяпана Навасяльчана**, давераную асобу А.Мілінкевіча: сьпярша яму заявілі, што няправільна прыпаркаваў аўтамабіль, але ў пастарунку абвінавацілі ў супраціве міліцыянтам. Суд прызначыў Навасяльчану 10 сутак арышту. **Ірыну Лаўроўскую** й **Ігара Дземідовіча**, агітатараў за А.Мілінкевіча, затрымалі падчас распаўсюду агітацыйнай літаратуры й склалі адміністрацыйныя пратаколы.

У Горадні судзьдзя Натальля Козел асудзіла на 7 сутак арышту моладзевага актывіста **Максіма Губарэвіча**, затрыманага напярэдадні ўвечары: міліцыянты, якія яго затрымалі, заявілі ў судзе, што хлопец нецэнзурна лаяўся на вуліцы.

У Віцебску **Барысу Хамайду** прысудзілі штраф у 160 б.в. (4 млн 960 тыс. руб.) за вулічны пікет.

У Магілёве 13 сакавіка затрымалі моладзевага актывіста **Сержука Нягаціна**, калі ён выйшаў з тамтэйшага штабу Мілінкевіча: асуджаны на 15 сутак арышту. У пастарунку хлопцу заявілі, што ён лаяўся матам. 14 сакавіка АМАПаўцы затрымалі **Рыгора Костусева**, даверанаую асобу А.Мілінкевіча, і асудзілі на 10 сутак. Абвінавачаньні стандартныя — брыдкаслоўе.

У Берасьці 14 сакавіка міліцыянты затрымалі кіраўніка выбарчага штабу А.Мілінкевіча Зьмітра Шыманскага.

# Беларускі вечар на Хлебнай фабрыцы

**У нядзелю, 19 сакавіка**, калі ў Беларусі пройдуць «прэзыдэнцкія выбары», **«Беларусы ў Бэрліне» ладзяць** імпрэзу ў нямецкай сталіцы.

Мы хочам скарыстаць гэты «знамянальны» дзень, каб сабрацца ў клюбе «**Хлебная фабрыка**» (**«Brotfabrik»** Weißensee) ды патанчыць, паесьці, паглядзець кіно ці — калі хто захоча — паразмаўляць. Мы хочам паказаць, што такое для нас **Беларусь**. Бо ў Эўропе пра Беларусь ведаюць мала. Як яна выглядае, што за людзі там жывуць, якой яны самі бачаць сваю радзіму? Мы хочам, каб наша краіна набыла твар. Для таго мы падрыхтавалі **мультымэдыйную выставу**.

Безь вялікай палітыкі абысьціся ў такі вечар не атрымаецца. Таму на працягу вечара мы правядзём прамыя ўключэньні зь Менску, каб запытацца пра сытуацыю ў Беларусі ў людзей, што мусяць гэта ведаць. І мы кажам не бяз гонару — гэта будзе **сусьветная прэм’ера**. Бо інтэрвію ў жывым этэры між Нямеччынай і Беларусьсю яшчэ ніколі ня ладзілася.

А той, хто будзе прысутным на гэтай гістарычнай падзеі, будзе ўзнагароджаны **падарункам — кампакт-дыскам**. На гэтым — таксама прэм’ерным — дыску, зрэшты, як і на самой вечарыне, можна будзе пачуць нешта, пра існаваньне чаго некаторыя і не здагадваліся, але тое, што вельмі нават існуе, а менавіта — **беларускую рок- і поп-музыку**.

І, нарэшце, мы будзем галасаваць: свабодна і справядліва.

Мы запрашаем усіх! Выдаткоўвацца ня прыйдзецца! Каб прайсьці на вечарыну, дастаткова будзе проста цікаўнасьці! (Праўда, аматары кіно мусяць выкласьці асобна за фільм 6 эўра.) Пачатак а 19-й гадзіне!

Прыходзьце!

**Даведкі:**
www.belarusnews.de

ці запытацца ў:
**Інго Пэтца:** +49 (0)163 84 31 400 (ingopetz@hotmail.com)

ды **Нікіты Андрэева:** +49 (0) 163 85 21 804 (nikita.andreew@gmx.de)




## ХРОНІКА

У Гомелі на 10 сутак засудзілі **Сяргея Сямёнава**, які 12 сакавіка на сустрэчы з А.Казуліным задаў пытаньне пра рэформу сыстэмы адукацыі МУС. 14 сакавіка міліцыянты забралі Сямёнава з працы, у пастарунку яму сказалі, што ёсьць заява начальніка ўправы ідэалягічнай работы Гомельскага аблвыканкаму Анатоля Кацілы: маўляў, Сямёнаў нецэнзурна абразіў яго на той сустрэчы з выбарцамі.

На беларуска-расейскай мяжы каля Дуброўна беларускія мытнікі затрымалі сьвежы нумар недзяржаўнай газэты **«Народная воля»**: наклад павезьлі ў Віцебскую абласную міліцыю. Тамсама трымаюць і наклад папярэдняга нумару «НВ», таксама канфіскаваны пры пераезьдзе мяжы.

У Горадні на 7 сутак асудзілі актывіста незарэгістраванага Саюзу палякаў **Юзафа Пажэцкага**: яго зьвінавацілі ў дробным хуліганстве. **Андрэя Пачобута** асудзілі па тым самым абвінавачаньні на 10 сутак арышту. У залі суду Пачобут абвесьціў сухую галадоўку.

У гэты ж дзень затрыманыя праваабаронца Віктар Сазонаў і davераная асоба А.Мілінкевіча **Сяргей Мальчык**: ім закідаюць распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак.

На 12 сутак у Менску засудзілі **Андрэя Кіма**, актывіста каманды А.Казуліна, затрыманага 2 сакавіка. Арыштам пакаралі 14 сакавіка ўдзельнікаў сустрэчы з А.Мілінкевічам, якая прайшла 12 сакавіка ў Менску, прадпрымальнікаў **Аляксандра Макаева** (15 сутак) і **Аляксандра Прысмакова** (10 сутак): іх зьвінавацілі, што падчас мітынгу яны выкрыквалі «антыдзяржаўныя» лёзунгі: «Беларусь у Эўропу!» і «Свабоду Беларусі!». Справу «зуброўца» **Максіма Вінярскага** разглядалі ў ягонай адсутнасьць, бо актывіст у суд не зьявіўся: рашэньне судзьдзя мае абвесьціць 17 сакавіка.

У Наваполацкай гімназіі, вызначанай гарвыканкамам як месца для агітацыі, затрымалі **Аляксея Трубкіна**, які прыйшоў, каб вывесіць агітацыйныя матэрыялы.

У Касьцюковічах па абвінавачаньні ў распаўсюдзе друкаваных матэрыялаў у недазволеным месцы затрыманыя актывісты ПБНФ **Мікалай Малахаў** і **Ўладзімер Патапаў**.

У Рэчыцы падчас наклейкі налепак А.Казуліна на агітацыйны стэнд быў затрыманы **Алег Шабетнік**: на яго склалі пратакол за адміністрацыйнае правапарушэньне.

### Штраф для прэсы

Суд Клімавіцкага раёну 13 сакавіка аштрафаваў рэдактара незарэгістраванага выданьня «Вольны горад» **Сяргея Няроўнага** на 20 б.в.: яго зьвінавацілі, што вырабляў і распаўсюджваў друкаванае выданьне звыш вызначанага накладу. Газэту затрымалі пры перавозе з друкарні праз расейска-беларускую мяжу 13 студзеня: пры дазволеным накладзе для незарэгістраванага выданьня міліцыянты налічылі каля 1000 асобнікаў газэты.

### Танцы на даху

На даху будынку, дзе знаходзіцца офіс апазыцыйнай Аб’яднанай грамадзянскай партыі, у гэты ж дзень працавалі зь невядомай апаратурай людзі ў цывільным у суправаджэньні афіцэра ў форме «хакі». Насупраць будынку цэлы дзень стаяў мікрааўтобус з вайскоўцамі (№ 0173 УЕ). На рукаве кіроўцы — шаўрон «спэцназ унутраных войскаў».

### Частковая справядлівасьць

Актывісту каманды А.Мілінкевіча студэнту **Яўгену Скрабутану** ўдалося часткова дамагчыся справядлівасьці: рашэньне адміністра-



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Вучні адной з сталічных школаў вывешваюць расьцяжку на мосьце над Нямігай у Менску. Юныя падпольшчыкі хваляваліся і павесілі яе наадварот. Ды што ж... «І так усё ясна».**

# ХРОНІКА

цыйнай камісіі Кастрычніцкага раёну Горадні, якая аштрафавала яго на 1 б.в. за каляндарыкі з партрэтам кандыдата ў прэзыдэнты, скасавана.

За каляндарыкі Яўген пацярпеў тройчы: апрача адміністрацыйнай камісіі, яго пакараў штрафам у 10 б.в. Мастоўскі раённы суд, а рэктар Гарадзенскага ўнівэрсытэту выключыў яго з навучальнай установы.

## Выдаляюць замежнікаў

Зь Беларусі пачынаюць дэпартаваць замежнікаў, якія, нібыта, прыехалі праводзіць экзыт-полы, бо на правядзеньне сацыялягічных апытаньняў патрабуецца афіцыйны дазвол уладаў (такая норма была ўведзеная на пачатку 2006 г.). Як паведаміла прэс-служба АГП, з гатэлю «Аквабел» 10 грамадзянаў Даніі дастаўленыя ў міліцыю, у іх нумарах адбыліся ператрусы. Яшчэ аднаго грамадзяніна Даніі дэпартуюць з Быхава.

У Горадні 14 сакавіка супрацоўнікі КДБ затрымалі грамадзянаў Швэцыі **Охмана Томаша** і **Стэнстрома Б'ёрна**: ім загадана пакінуць Беларусь цягам 24 гадзінаў.

## Актывістаў зьбіваюць

У Магілёве 14 сакавіка ахоўнікі заводу «Магатэкс» зьбілі **Мікалая Расюка**, агітатара А.Казуліна, за тое, што раздаваў работнікам заводу газэту «Народная воля» і ўлёткі кандыдата ў прэзыдэнты. У Расюка здарыўся сардэчны прыступ, абаранілі яго работнікі заводу.

**Мікалая Ворана** ў Горадні зьбіў міліцыянт, калі актывіст раздаваў афіцыйныя ўлёткі А.Казуліна каля інтэрнату Гарадзенскага заводу аўтаагрэгатаў. Міліцыянт некалькі разоў ударыў актывіста галавой аб сьценку проста на прахадной інтэрнату. Цяпер Воран у больніцы, куды яго завезла хуткая дапамога. Мэдыкі ацэньваюць ягоны стан як «сярэдняй цяжкасьці».

## У пракуратуру два разы ў дзень

У Шчучынскую пракуратуру **Сяргея Ляшкевіча**, актывіста групы А.Мілінкевіча, 14 сакавіка выклікалі двойчы, адзін раз — для вочнай стаўкі. Пракуратура вядзе крымінальную справу па факце «падрыхтоўкі тэрарыстаў». Увечары 14 сакавіка С.Ляшкевіча пасадзілі ў сьледчы ізалятар.

## Жодзіна

Уначы на 15 сакавіка ў Жодзіне былі затрыманыя моладзевыя актывісты **Сяржук Гудзілін, Яўген Ваўкавец, Алесь Чырэйка**, якія рыхтавалі сустрэчу А.Мілінкевіча з выбарцамі гораду. На пад'ездзе да гораду яны малявалі на сьнезе надпісы-прывітаньні дэмакратычнаму кандыдату. Жодзінская міліцыя адмаўляецца казаць, што інкрымінуюць хлопцам і чаму іх трымаюць даўжэй за дазволеныя законам 3 гадзіны.

## Віцебск

Уначы на 15 сакавіка ў Віцебску быў затрыманы моладзевы актывіст **Віталь Броўка** па дарозе дадому. Хлопцу закідаюць «дробнае хуліганства»: некалькі дзён таму ён прыйшоў на агітацыйны сход у Віцебскім унівэрсытэце, дзе спрабаваў выказацца ў падтрымку Мілінкевіча. Знаходжаньне Броўкі невядомае.

Проста на выбарчым участку 15 сакавіка забралі назіральніка **Валер'я Шчукіна.**

## Менск

Актывіста прадпрымальніцкага руху **Ігара Ледніка** 15 сакавіка судзьдзя Цэнтральнага суду сталіцы Аляксей Бычко асудзіў на 10 сутак арышту. Яго затрымалі напярэдадні ўвечары й зьвінавацілі ў непадпарадкаваньні супрацоўнікам міліцыі.

## Берасьце

14 сакавіка затрымалі **Ігара Дземідовіча** і **Андрэя Шарэнду**, актывістаў штабу А.Мілінкевіча: іх зьвінавацілі ў агітацыі ў недазволеным месцы. Міліцыю выклікаў пракурор, які праяжджаў міма агітатараў. На актывістаў склалі пратакол, хаця месца, дзе яны праводзілі агітацыю, уваходзіць у афіцыйна дазволены пералік.

На **Рыгора Бакіевіча**, актывіста кампаніі А.Мілінкевіча, увечары 14 сакавіка напаў невядомы, які ўдаваў зь сябе п'янага. Бакіевіча забралі ў пастарунак і выставілі яму абвінавачаньне ў хуліганстве.

Суд над **Зьмітром Шыманскім** прызначаны на 15 сакавіка: яго затрымалі напярэдадні ўвечары й абвінавацілі ў арганізацыі несанкцыянавага сходу. Актывіста пакінулі на ноч пад вартай, хаця ён і прасіў яго адпусьціць дадому, бо мае малое дзіця.

## Горадня

**Віктара Сазонава**, актывіста штабу А.Мілінкевіча, 15 сакавіка асудзілі на 7 сутак, зьвінаваціўшы ў «дробным хуліганстве» — «нецэнзурнай лаянцы». У залі суду, куды не пускалі сяброў і сваякоў, Сазонаў абвесьціў галадоўку.

## Наваполацак

**Аляксея Трубкіна**, актывіста кампаніі Мілінкевіча, 15 сакавіка асудзілі на 7 сутак арышту.

## Ворша

15 сакавіка актывісты, якія прыйшлі ў суд падтрымаць **Васіля Леўчанкава**, абвінавачанага ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу, былі вельмі зьдзіўленыя: хоць у 18.30 напярэдадні суд быў адкладзены да раніцы, у 19.30 актывісту штабу Мілінкевіча абвесьцілі прысуд — 7 сутак арышту.

## Украіна нон-грата

На ўкраінска-беларускай мяжы ўначы на 15 сакавіка памежнікі без тлумачэньня прычынаў высадзілі здымачную групу ўкраінскага «5-га каналу» — журналіста **Андрэя Жыгуліна** і апэратара **Віталя Дарашэнку**, не зважаючы на акрэдытацыю МЗС Беларусі.

## Затрыманьні моладзі

14 сакавіка ўвечары без нагоды былі затрыманыя моладзевыя актывісты **Мікіта Сасім**, **Натальля Ушко**, **Ніка Лазоўская**, **Мікіта Шуцянкоў**, якія стаялі каля станцыі мэтро «Пушкінская». За распаўсюд газэтаў 15 сакавіка затрыманыя **Юлія Гарачка**, **Даніла Барысевіч**, **Вольга Жураўлёва** і **Руслан Мацьвееў**, за разьвешваньне джынсавых стужак — **Антон Столяр** і **Вольга Сакалова.**

**Сакалову** і **Столяра** абвінавацілі ў дробным хуліганстве і затрымалі ў пастарунку. Астатніх адпусьцілі. Толькі Сасім патрапіў у больніцу, дзе яму 15 сакавіка зрабілі апэрацыю на апэндыцыт. Цяпер актывіст ляжыць, прыкуты да ложка кайданкамі.

Колькасьць матэрыялаў пра Беларусь у замежным друку рэзка вырасла. Якасьць, збольшага, таксама. З Бэрліна піша **Алесь Кудрыцкі.**

# Беларусь — гэта экспэрымэнт

Такі артыкул павінен быў зьявіцца, і ён зьявіўся. Ужо ў загалоўку **Джонатан Стыл**, аўтар брытанскай ***The Guardian***, кідае камень у бок Захаду: «Эўропа і ЗША вызначыліся зь пераможцам яшчэ да галасаваньня». Палітыка ў Беларусі будзе вымушаная падпарадкавацца эканоміцы — а яна ў цудоўным стане, робіць выснову Стыл, грунтуючыся на справаздачы Міжнароднага валютнага фонду, выдадзенай у чэрвені 2005 г. «Няўжо вы чакаеце, што эўрапейскі лідэр, падчас кіраваньня якога на працягу некалькіх апошніх год няўхільна расьлі рэальныя прыбыткі насельніцтва, у тым ліку на 24% за апошнія 12 месяцаў, ня будзе абраны зноў? А калі ён яшчэ і зьменшыў ПДВ, утаймаваў інфляцыю, зьменшыў напалову колькасьць жабракоў і пазьбег сацыяльнай напружанасьці, захаваўшы самую чэсную сыстэму разьмеркаваньня прыбыткаў сярод краінаў рэгіёну? — піша аўтар *The Guardian*. — Дзеля чаго тады гэтае крэшчэнда заяваў заходніх урадаў, якія рэхам адбіваюцца ў заходніх мэдыях, што прыводзіць да аднабаковага асьвятленьня падзеяў у адной з самых маленькіх краінаў Эўропы?»

У 1996 г. Стыл быў назіральнікам за правядзеньнем рэфэрэндуму ад Эўрапейскага інстытуту мэдыяў. Тады ён прызнаў, што выбарчая атмасфэра ў Беларусі ні свабодная, ні справядлівая. «Я ня быў у Беларусі ўжо 10 год, — прызнаецца аўтар, — але мясцовыя жыхары, зь якімі я размаўляю па тэлефоне, а таксама замежнікі, перадаюць, што большасьць людзей задаволеная сваім узроўнем жыцьця».

Аўтар адзначае: «Лукашэнка, натуральна, зусім не лібэрал». Аднак, мяркуе Стыл, насуперак сьцьвярджэньням, што рэпрэсіі Лукашэнкі стварылі «інфармацыйную чорную дзірку», выбар навінаў больш шырокі, чым у 1996 г. «У той час як Расея амаль ня ўмешваецца ў хаду перадвыбарчай кампаніі, Эўропа і ЗША ўпампоўваюць у Беларусь грошы». Мікраскапічных цэнаў на расейскі газ і мільёнавых крэдытаў аўтар не заўважае. «Калі заходнія мэдыі, нягледзячы на іх хвалёную аб’ектыўнасьць ды шматгадовы дэмакратычны досьвед, вузка і тэндэнцыйна асьвятляюць падзеі ў Беларусі, гэта кажа пра многае», — робіць выснову Джонатан Стыл.

### Сцэнар для экспэрымэнту

Аўстрыйская ***Der Standard*** зьмяшчае артыкул «Не хапае дэмакратычнага досьведу». «Палітолягі не сумняваюцца ў перамозе Аляксандра Лукашэнкі — нават пры адсутнасьці маніпуляцыяў», — піша выданьне.

У артыкуле аналізуецца дасьледчыцкі праект Інстытуту Дунайскай прасторы і Сярэдняй Эўропы, прадстаўлены ў Вене 8 сакавіка. Аўтары дасьледаваньня, **Ганс-Георг Гайнрых**, палітоляг і экспэрт у пытаньнях Расеі, а таксама расейскі палітоляг **Людміла Лобава,** тлумачаць сваю думку чатырма фактарамі. Спрыяльнае эканамічнае становішча ў краіне, кантроль над мэдыямі, адсутнасьць уладнай альтэрнатывы прэзыдэнцкаму апарату, а таксама адсутнасьць уласнага эканамічнага базісу ў апазыцыі. Многія беларусы прагаласуюць за Лукашэнку, бо ім жывецца лепей, чым жыхарам іншых былых краінаў СССР. Акрамя гэтага, ім бракуе дэмакратычнага досьведу.

«Беларусь — гэта экспэрымэнт, — кажа Гайнрых, — які функцыянуе, нягледзячы на палітыку ізаляцыі». Пытаньне толькі ў тым, як доўга ён будзе працягвацца.

Рэвалюцыі пасьля выбараў чакаць не абавязкова, хаця, як кажа Лобава, «усё магчыма». Наступным крокам дасьледчыкаў будзе праца над распрацоўкай разнастайных сцэнароў разьвіцьця Беларусі. Працу мяркуецца скончыць у чэрвені 2008 г.

### Стралянiна ў Менску

«Хваля страху ўздымаецца ў Беларусі», — піша аўтар брытанскай ***The Times*** **Джэрэмі Пэйдж**. Пачатак артыкулу – як у тым баевіку: «Агент дзяржбясьпекі не назваў свайго імя, ён без папярэджаньня адкрыў агонь па машыне Юр’я Радзівіла ў цэнтры Менску... Апазыцыйныя актывісты ў былой савецкай рэспубліцы Беларусі, якую Захад называе апошняй дыктатурай Эўропы, звыклыя да запужваньняў, зьбіцьцяў ды затрыманьняў. Але нават яны былі шакаваныя дзеяньнямі агента».

Аўтар заўважае, што, у адрозьненьне ад мінулых выбараў, гэтым разам Захад пакінуў усе спробы захаваць бесстароннасьць і адкрыта заклікае

**Працяг на старонцы 22.**

# Беларусь — гэта экспэрымэнт

**Працяг са старонкі 21.**

беларускі народ сказаць Лукашэнку «не». «Расейскі прэзыдэнт Пуцін адчайна спрабуе не дазволіць яшчэ адной рэспубліцы павярнуцца сьпінай да Масквы, — піша журналіст. — Зноў выбары ў абшарах былога Савецкага Саюзу ператвараюцца ў завочную бітву паміж Расеяй ды Захадам».

## Свабода пад псэўданімам

«Покліч «Свабоду!» робіцца ўсё больш гучным», — піша аўстрыйская *Wiener Zeitung*.

«З транспарантамі сюды прыходзяць вельмі рэдка. Людзі занадта баяцца затрыманьняў ці гвалтоўнага разгону сходу. Разам з тым паслухаць Аляксандра Мілінкевіча зьбіраюцца тысячы. У артыкуле «Радыёхвалі супраць менскага рэжыму», зьмешчаным у рубрыцы «Пераход празь мяжу», карэспандэнтка газэты **Марына Чарноўска** аналізуе стан з новымі мэдыйнымі праектамі для Беларусі. У цэнтры артыкулу — аднаўленае радыё «Рацыя».

«Для Міколы Маркевіча няма праблемы назваць сваё прозьвішча. Чаго ня скажаш пра многіх ягоных калегаў, — піша журналістка. — Усе яны — журналісты і працуюць для адной радыёстанцыі. Але Маркевіч сядзіць у студыі ў Польшчы, а ягоныя калегі знаходзяцца ў Беларусі. На польскай тэрыторыі беларускі ўрад ня можа ўплываць на асьвятленьне падзеяў. Але ўскладніць жыцьцё карэспандэнтаў, якія працуюць для радыёстанцыі зь Беларусі, — нескладана. Таму большасьць зь іх выкарыстоўвае псэўданімы».

Карэспандэнтка характарызуе Польшчу як найбольш актыўнага памочніка Беларусі, у тым ліку ў мэдыйным сэктары. Эўразьвяз ад яе адстае. «Толькі пасьля доўгіх ваганьняў Эўракамісія адважылася зрабіць мэдыяльны ўнёсак у патэнцыйную дэмакратызацыю Беларусі», — кажа журналістка, маючы на ўвазе 2 млн эўра, выдзеленыя нямецкай агенцыі *Media Consulta* на арганізацыю тэлевяшчаньня на Беларусь.

## Вера прэм’ера

*The Washington Post* зьмяшчае пранікнёны і поўны сымпатыі да беларусаў тэкст **Мікулаша Дзурынды**, прэм’ер-міністра Славаччыны (падрабязьней пра гэта — на **старонцы 14**). «У нядзелю людзі Беларусі будуць абіраць новага прэзыдэнта, — піша ён. — Я ўпэўнены, што ў гэтыя выходныя людзі Беларусі паўстануць перад выбарам паміж палітычнай цемрай і сьвятлом свабоды». Аўтар верыць у перамогу дэмакратыі: «Ніхто і нішто ня ў стане супраціўляцца гістарычным сілам, прыведзеным у рух імкненьнем людзей да свабоды». «Што надае мне надзею на людзей Беларусі? Такія самыя сьвечкі, якія гарэлі на плошчы ў Браціславе, цяпер блішчаць у вокнах менскіх кватэраў і ў вясковых хатках. Усё зводзіцца да невытлумачальнай жывучасьці гэтых маленькіх агеньчыкаў. І менавіта так, урэшце, цемра будзе канчаткова пераможаная, а страх забыты».

## Рэпартаж з андэрграўнду

Брытанская ***Independent*** зьмяшчае вялікі рэпартаж **Эндру Осбарна** пра «Свабодны тэатар». «У па-спартанску абстаўленай кватэры, у Беларусі, краіне, якую Амэрыка называе апошняй дыктатурай Эўропы, сем таленавітых маладых актораў і акторак рызыкуюць згубіць працу, здароўе і свабоду — для таго, каб правесьці рэпэтыцыю новай п’есы. Так журналіст апісвае працу актораў над новай пастаноўкай пад назвай «Белівуд», галоўны герой якой, малады беларус, пакутуе ад «галасоў», і, урэшце, памірае.

«Гэта трапная і дэпрэсіўная мэтафара для сёньняшняй Беларусі, якая знаходзіцца недзе паміж Оруэлаўскім «1984» ды Савецкім Саюзам 50-х гадоў». «Калі мастацтва сапраўды імітуе жыцьцё і калі андэрграўндны тэатар у Беларусі — гэта мікракосм грамадзтва, то гэтыя знакі не даюць падставаў для радасьці».

Уражвае разнастайнасьць матэрыялаў пра Беларусь. Калі раней кожны артыкул успрымаўся як маленькі цуд, дык цяпер ужо можна выбіраць што пацікавей. Найбольшае задавальненьне атрымліваеш ад артыкулаў, напісаных заходнімі журналістамі, якія прыяжджаюць у Беларусь у доўгія камандзіроўкі (а такія зьяўляюцца ўсё часьцей). Іх матэрыялы — ужо не адпіскі, на хуткую руку скляпаныя з паведамленьняў інфармацыйных агенцыяў.

Цікава заўважаць, зь якой цяжкасьцю многія з журналістаў, якія прайшлі праз «заглыбленьне ў Беларусь», стрымліваюць асабістыя эмоцыі ў сваіх тэкстах. Тое, што такія пазыцыі пачалі афармляцца, як і тое, што некаторыя аналітыкі спрабуюць пераасэнсаваць стандартныя падыходы да рэжыму — добры знак. Захад праглынуў беларускую пігулку.

# Беларусь у цэнтры ўвагі

14 сакавіка прэм’ер-міністар Славакіі Мікулаш Дзурында абмеркаваў сытуацыю ў Беларусі з прэзыдэнтам ЗША Джорджам Бушам. Наконт вынікаў выбараў 19 сакавіка, якія будуць абвешчаныя ўрадам, славацкі прэм’ер выказаўся пэсымістычна. Але адзначыў, што пэўны ў дэмакратычнай будучыні краіны.

Днём раней беларускую сытуацыю абмеркавалі ў Стакгольме прем’ер-міністар Польшчы Казімеж Марцінкевіч і яго швэдзкі калега Горан Пэрсан. Апошні падтрымаў ініцыятыву пра сумесную дапамогу беларускім дэмакратычным аб’яднаньням. Варшава прапануе стварыць швэдзка-польскую арганізацыю «Салідарнасьць для Беларусі», якая магла б карыстацца патрымкай швэдзкай урадавай арганізацыі СІДА.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Пра Менскі падпольны «Свабодны тэатар» пісалі «Independent» і «New York Times». На фота — прэм’ера новага спэктаклю «Белівуд».**



# Патыхае «Тайфунам»

Арсэнал псыхалягічнай вайны — зброя двухбаковавострая. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

У мэдыі трапіў ананімны ліст са сцэнаром імавернага разгону «беларускага Майдану». Падрабязна апісаны арсэнал. Асабліва мусяць уразіць публіку гранаты «Тайфун-М» з адмысловым газам, пад узьдзеяньнем якога ўсе спантанна робяць у штаны. Трэба думаць, спэцназ будзе ў адгазьніках. Мо «джынсавую рэвалюцыю» выратуюць у такім разе памперсы?

А цяпер сур’ёзна.

Найхутчэй, ва ўладаў ёсьць некалькі сцэнароў утрыманьня сытуацыі, у тым ліку і найгоршы, кажа палітоляг Валер Карбалевіч. Мабыць, падрыхтаваны і адпаведны арсэнал спэцсродкаў. Разам з тым, мяркуе экспэрт, рэжым палічыў бы за лепшае абысьціся безь вялікага гвалту. Асабліва калі столькі чужых вачэй — зьехаліся ж назіральнікі, журналісты з усяго сьвету. Лепей давесьці ім славутую стабільнасьць, чым як пацьвердзіць рэпутацыю дыктатуры.

Згадайма 2001, 2004 гады. І падчас мінулых прэзыдэнцкіх выбараў, і як быў апошні рэфэрэндум, улада паводзіла сябе незвычайна рахмана. «Разбор палётаў» ладзіўся потым.

Мо й сапраўды ў сілавых структурах ёсьць ананімы, якія спачуваюць апазыцыі. Але ўвогуле выглядае на тое, што рэй там вядуць іншыя адмыслоўцы.

Пагартайце падручнікі псыхалягічнай вайны — і вы ўбачыце, што шэраг сэнсацыяў апошняга часу (напрыклад, пра апазыцыйных шагідаў) — цалкам у рэчышчы ейных канонаў.

Псыхалягічная вайна — зусім не мэтафара, як думаюць многія. Гэта добра распрацаваная навука. Сэнс палягае у тым, што спэцыяльныя органы адной дзяржавы адмысловымі сродкамі ўзьдзейнічаюць на насельніцтва і войскі іншай дзяржавы, каб іх дэмаралізаваць.

Гэта клясычнае вызначэньне. Спэцыфіка ж нашае сытуацыі ў тым, што адмысловы арсэнал (напрыклад, запалохваньне праз чуткі, у якіх боб зьмяшаны з гарохам) ужываецца супраць значнай часткі насельніцтва ўласнай краіны. У вобраз «купкі адмарозкаў» найперш ня вераць самі яго стваральнікі.

Экспэрты і раней казалі: фактычна, ідзе ціхая грамадзянская вайна. Нядаўна палітоляг Сьвятлана Навумава ўвогуле зазначыла, што ў выніку каштоўнаснага канфлікту ўнутры Беларусі сфармаваліся дзьве краіны. І між імі — антаганізм.

Сапраўды, у такім разе выкарыстаньне псыхалягічнае зброі па-свойму заканамернае. На вайне як на вайне.

Але гэта зброя двухбаковавострая. Так, распачатая вярхамі «вайна рэйтынгаў» ударыла бумэрангам. Выступы апазыцыйных кандыдатаў паказалі фэномэн голага караля. Улада пачала апраўдвацца, і стала зразумела, што яе маральна-псыхалягічная бронекамізэлька не трывае трапных пііраўскіх стрэлаў.

Больш за тое, зьнішчыўшы незалежныя мэдыі, улада стварыла глебу для хуткага распаўсюду пагібельных для сябе чутак.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Згадайце, як летась краіну накрыў розгалас пра «новы чарнобыльскі выбух» — і ўвесь прапагандысцкі апарат стаўся бездапаможным.

Калі 19 сакавіка «вуліца» станецца шматлікай, гэта можа ператварыцца для апанэнтаў рэжыму ў зброю стрыманьня, ня горшую за той «Тайфун-М».

Вядома ж, псыхоз можа штурхануць і на дурное. Але ўвогуле цяжка паверыць, што наверсе — пры ўсёй празе ўлады — так і мараць набыць сталы ярлык «крывавай хунты».

Усе псыхалягічныя атакі разьбіваюцца аб маральны дух. Дэмакраты маюць шанец годна, мірна паказаць свой патэнцыял, сваю моц ды згуртаванасьць.

**На фота: датэрміновае галасаваньне ў сталіцы. Кіраўніцтва ВНУ зь невядомых прычынаў схіляе студэнтаў да масавага датэрміновага галасаваньня.**



# Навіны літаратуры



Супрацоўнікам Нацбібліятэкі трэба ўжо зараз завесьці спэцыяльны каталёг аб прэзыдэнцкіх выбарах. У хуткім часе ён можа папоўніцца цікавымі кнігамі. Накшталт... Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

**Арэнс Г.-Х. Я проста фігею.** — Бэрлін, 2006. — 152 с.

Мэмуары прадстаўніка камісіі АБСЭ па правах чалавека. Цікавыя ўражаньні заходняга дыплямата падчас перадвыбарчай кампаніі, якія цудоўна пацьвярджаюць народны афарызм: «Што нам добра, то немцу — сьмерць».

**Мілошавіч, Слабадан. З думаю пра Беларусь.** — Гаага, 2006. — 46 с.

Прысьвечаныя Беларусі фрагмэнты дзёньніка, які вёў у турме найлепшы сябра беларускага народу.

Кнігу варта набыць хаця б дзеля апошняй фразы: «Сёньня даведаўся, што ЗША пагражаюць яму санкцыямі. Ад пэрспэктывы цёплай сустрэчы са старым сябрам проста тут у Гаазе мне заняло дыханьне. Ой, нешта мне дрэнна…. сапраўды дрэн…»

**Некаторыя пытаньні ўдасканаленьня практыкі асуджэньня апазыцыянэраў за лаянку матам і непадпарадкаваньне прадстаўнікам міліцыі. Матэрыялы сходу беларускіх судзьдзяў.** — Менск, 2007. — 280 с.

**Паўлічэнка, Дзьмітры. Размова па-мужчынску: новы стыль баявога мастацтва.** — Менск, 2006. — 4 с.

Абсалютна новае слова ў тэхніцы рукапашнай барацьбы. Каб заваліць праціўніка, вам не спатрэбіцца болей гадамі пацець у качалках. Дастаткова забіць яму «стрэлку», прыхапіць з сабой 30 сяброў — і сам Клёд Ван Дам адпачывае!..

**Сідараў А. Як перажыць перадвыбарчыя кампаніі ў Беларусі. Парады для людзей, якія хварэюць на алергію ад чырвоных і зялёных колераў.** — Малая Багацькаўка, 2006. — 76 с.

Кніга, прызначаная для алергікаў, падрабязна распавядае, як пазбавіцца сустрэчы з правакацыйнымі колерамі, напрыклад, адзяваць, выходзячы на вуліцу, чорныя акуляры або карыстацца выключна тэлевізарам з чорна-белым экранам.

**Скобелеў, Эдуард. Арбузік, Бябешка і прафэсар-дэбіл.** У трох тамах. — Менск: Дзіцячая думка, 2006.

Працяг вядомай кнігі аб прыгодах двух сяброў — Бебешкі і Арбузіка. На гэты раз ім супрацьстаіць не сяміхвостая пачвара, а куды больш небясьпечны вораг — «прафэсар пэдагогікі, які, атабарыўшыся на гарадзкім сьметніку, пагражае дэстабілізаваць сытуацыю ў горадзе, дзе жывуць нашыя героі».

**[Бяз аўтара і выходных зьвестак.] Стральба па машынах у людных месцах.** — Самавучыцель для байцоў групы «Алмаз».

**Трусаў, Алег. Новыя тосты: Аб апошніх тэндэнцыях у беларускай піцейнай культуры, выкліканых кампаніяй «За Беларусь!».** — Смаленск: тыпаграфія Міхайлава, 2006. — 555 с. + ілюстрацыі.

Кніга вывучае зьмены застольнага рытуалу беларусаў, кшталту зьяўленьня пад уплывам афіцыйнай прапаганды такіх экзатычных тостаў, як «За дастатак», «За самабытную Беларусь», «За алімпійскую Беларусь», і яе ўплыў на інтэнсіўнасьць спажываньня алькаголю.

**Шэймановіч, Аляксандар. Што рабіць, калі вас не пускаюць у Эўропу.** Браслаў, 2006. — 56 с. + карцінкі.

Праспэкт рэкамэндаваны для турыстычных апэратараў і турфірмаў, якія працуюць з кліентамі, якіх пазбавілі права на ўезд у Эўразьвяз.

**Ярмоленка, Анатоль. Слухай бацьку:** Лібрэта да аднайменнай опэры й ноты + мікрафон-караоке. — Менск: Музычная мысьль, 2006. — 666 с.

Папулярны твор, асновай якому стаў вядомы гіт «Сяброў». Рэкамэндаваны да пастаноўкі ў школах і на ранішніках у дзіцячых садках.

**Ярмоленка Анатоль. Глядзі бацьку:** Лібрэта да аднайменнага м'юзыклу і ноты. — Менск: Музычная мысьль, 2006. — 550 с.

Легендарны твор, асновай якому стаў вядомы гіт «Сяброў». Рэкамэндаваны да пастаноўкі ў школах і на ранішніках у дзіцячых садках.

## Лепшая жызьнь

**Ад старых людзей часта можна пачуць такія словы: "Лукашэнка самы лепшы і харошы на нашай зямлі. Ён даў нам жызьнь".**

Ня трэба наракаць на просты люд. Што ён бачыў за сваё жыцьцё за саветтамі? Неяк давялося глядзець кінахроніку 1930–х. Працоўныя і сяляне перад камэрай славілі шчасьлівае жыцьцё, выступаючы на нейкім сходзе. Зразумела, галоўным дабрадзеем быў таварыш Сталін і партыя бальшавікоў. Дасюль помняцца словы адной працоўнай: "Ці маглі б мы, простыя кабеты, некалі думаць, што яшчэ за нашым жыцьцём будзем вадзіць сваіх дзяцей у садкі, езьдзіць адпачываць на курорты?... Дзякуй таварышу Сталіну, што даў нам жыцьцё, даў магчымасьць адпачыць на курорце!... І гэта хочуць у нас забраць праклятыя трацкісты й бухарынцы... Дзякуй таварышу Яжову, што перапыніў іх варожыя намеры".

Потым нашыя бабулі й дзядулі хвалілі Брэжнева, за якім жыцьцё падавалася ім раем. Пасьля хрушчоўскіх трудаднёў заробкі, пашпарты і магчымасьць адправіць дзяцей у людзі падаваліся вяршыняй жыцьцёвых дасягненьняў.

Жыцьцё працягвае сваю хаду, тэхнічны і культурны прагрэс дабіраецца паціху і да нас, як бы мы ні намагаліся гэта запыніць.

Зараз народ пачаў атрымліваць нейкія палёгкі, стаў палучаць крыху больш і нават мае права (але не магчымасьці) атрымаць крэдыт пад будаўніцтва асабістага жытла. Можна браць у банках пазыкі на куплю аўто і DVD–прайгравальнікаў з хатнімі кінатэатрамі – чым жа не вяршыня мараў для большасьці.

Магчыма ў будучыні цяперашнія апазыцыйныя дзеячы будуць казаць сваім унукам: "Дзякуй глябалізму, жыцьцё нам даў — гіпэрмаркеты і рэстараны ў кожнай вёсцы. Крэдыты на прыватныя палёты ў космас узяць можна. Ці маглі б мы пра гэта некалі нават марыць?"

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Выбары могуць быць толькі на плошчы

**Пра якія «выбары» вядзецца гаворка?** Пры поўнай адсутнасьці свабодных СМІ, ашалелай прапагандзе вы натхнёна распавядаеце пра «маючыя адбыцца выбары». Ці ня варта было б ясна сказаць, што *выбар* — гэта выйсьці на наш Майдан альбо адседзецца ў сваёй хатцы.

Мяркую, што з большасьцю чытачоў «НН» я сустрэнуся на Нашым Пляцы.

**Алесь Вялейскі**

## Ганіце дрэнных прарокаў!

**Чаму праваабаронца Алесь Бяляцкі прадвяшчае такія вынікі галасаваньня?** Журналіст Аляксандар Старыкевіч, замест таго, каб зь цяжкіх гармат граміць антыбеларускую нечысьць, вы прадказваеце тое, што зробіць ЦВК («НН», №5).

Сёньня галоўная мэта сумленнай журналістыкі — у лоб папярэджваць ЦВК, што калі ён намалюе лічбу 80%, ягоныя чальцы будуць асуджаны народным судом, а іх род пракляты на многія пакаленьні.

Толькі супольнымі намаганьнямі можна перамагчы д'ябальскую сілу, а з настроем няўпэўненасьці, пусканьня на самацёк ня варта за штосьці змагацца. Лепей адразу схавацца пад спадніцу жонкі.

Ужо сёньня патрэбна заклікаць народ 19 сакавіка выходзіць на плошчы сьвяткаваць перамогу дабра над злом, Волі над цемрашальствам. Народ гатовы да змаганьня, патрэбны толькі аптымістычны кліч правадыроў дэмакратыі.

Жыве вольная Беларусь!

**Мікола Канаховіч, афіцэр у адстаўцы, Пружаны**

## Учора і сёньня

Учора нас душылі моцна,
І хмары цёмныя плылі.
А сёньня людзі бачаць сонца,
І ў бой сьвяты ідуць яны.

Заве вясна у бой чаканы,
І сэрца стукае часьцей.
Учора быў народ рахманы,
А сёньня ўжо: рады шчыльней!

Ручай гамоніць: тэрмін трэці
Убачыць ён вясной ў чацьвер...
Пасьля дажджу і нашай сьмерці.
Шчыльней рады! Далой давер!

**Мікола Петрушэнка, актывіст Партыі камуністаў (ПКБ), Талачын**

## Яшчэ пабачым, колькі выйдзе

**Выбары ні ў якім разе байкатаваць нельга.** Будзем спадзявацца, што Казулін далучыцца да Мілінкевіча, і тады застануцца толькі два сур'ёзныя кандыдаты. Гайдукевіча ў разьлік не бяру. Ведама, што «пераможцам» выйдзе Лукашэнка. Але глядзіце, як хутка расьце рэйтынг Мілінкевіча.

У кожным разе, лёс Беларусі ў сакавіку будзе вырашацца разам зь Мілінкевічам на вуліцах і плошчах. Разам пераможам. І хопіць пэсымізму, што перамога немагчыма ні ў 2006, ні ў 2011.

**Дзьмітры Сяржук, Барысаў**

## Выбарам «так»... са сваёй ТАКтыкай!

**У адзін сонечны дзень у пэўным месцы Радзіма зьбярэ дзясяткі ці сотні тысячаў беларусаў разам. Гэта і будзе азначаць Перамогу.**

Калі мы пагаджаемся ўзяць удзел у выбарах, гэта не азначае аўтаматычнага прыняцьця ўмоваў гульні. Бо мы кажам «Так!» барацьбе за свой лёс, самім сабе і верым у тое, што адзін чалавек — гэта адзін голас. Толькі праз удзел магчыма пераканаць тутэйшае грамадзтва ў несправядлівасьці сёньняшняй сыстэмы.

Таму стратэгія відавочная: трэба гуляць у кампанію «выбары прэзыдэнта». А вось *тактыку* кожны абірае паасобку. І тут ёсьць некалькі варыянтаў.

Нарэшце, апанэнты ўладаў прапанавалі народу адзінага моцнага кандыдата (Алеся Мілінкевіча), які ўголас заявіў, што здольны кіраваць краінай. І каманда ёсьць, і праграма, і сілы. Нават лёзунг «Свабода. Праўда. Справядлівасьць». Ці ня гэтага патрабуе беларускі народ? Такі, як і мы, беларус, які жыве нашымі праблемамі і дыхае адным з намі паветрам. Да таго ж адукаваны, патрыятычны, мужны...

Другі варыянт (Народнае галасаваньне) нам прапанаваў Зянон Пазьняк. Але, на жаль, ёсьць чыньнікі, якія перашкаджаюць правесьці гэтую кампанію. Найперш, інфармацыйны вакуўм.

Асобна вырашыў удзельнічаць у кампаніі Аляксандар Казулін. Ягоны рух, па сутнасьці, — альтэрнатыва ня толькі існай сыстэме, але й апазыцыі. І былы рэктар БДУ карыстаецца падтрымкай сярод насельніцтва.

Насамрэч, няма розьніцы, Мілінкевіч ці Казулін выступіць у ролі будучага прэзыдэнта. Мае значэньне толькі факт дасягненьня адзінства. Два Аляксандры павінны працаваць разам. Нельга разрываць на дзьве часткі беларускі народ, трэба сесьці і дамовіцца.

Ідучы да скрыні для галасаваньня, кожны грамадзянін адчувае сваю значнасьць і важнасьць: ён сам абірае шлях цэлай краіны... І ніхто ня мае права адабраць тую мажлівасьць: ані прэзыдэнт, ані начальнік, ані чалец выбарчай камісіі. Ці дазволіць сумленьне маўчаць, калі цябе прыніжаюць, калі ганьбяць тваю годнасьць?

У адзін сонечны дзень у пэўным месцы Радзіма зьбярэ дзясяткі ці сотні тысячаў беларусаў разам, гэта будзе азначаць Перамогу.

**Юрась Бусел, Маладэчна**

## Не разьбяру, хто «адмарозкі»?

**Памятаеце вядомую зь дзяцінства гульню «пяты кут»? Прыблізна яе я назіраў, прыйшоўшы 16 лютага на дзень салідарнасьці** зь беларускімі палітвязьнямі ды зьніклымі палітыкамі і журналістамі. Людзей, што мірна стаялі з памінальнымі сьвечкамі, гэбэшнікі, апранутыя ў спартовую адзежу, разам зь міліцыянтамі піхалі, піналі, як быдла, як немцы палон, валілі на сьнег, хапалі за рукі, выварочвалі і тапталі тыя сьвечкі. Чаго яны гэтых зьнічоў так баяцца? Дзяўчаткам і жанкам дасталося болей за ўсіх, бо слабейшыя.

**Юрась Навіцкі, Менск**

* * *

Перада мною кніга Джорджа Орўэла "1984". Побач — "СБ" №42, прапушчаная праз цэнзуру Мінстэрства Праўды. І я думаю: хто каго ілюструе — Орўэл Беларусь ці Беларусь Орўэла? І як гэта кончыцца — як у Орўэла ці Эжэна Іянэску ў "Забойцы па прызваньні, ці як у Бэкета ў "Чакаючы Гадо", ці як у ягоных жа "Насарогах"?

**Мікола Бусел, Дуброва**

* * *

Нашы вёскі паціху ўміраюць,
Паўцякалі ў горад сяльчане мае.
Палеткі дзяржавы быльлём зарастаюць,
Бо сёньня агульныя яны і нічые.

Нам бы прыклад узяць з Украіны,
Абудзіцца ад цяжкага сну.
Прахадзімцаў і злодзеяў выгнаць з краіны,
У новым убраньні сустрэці вясну.

**Вікторыя Радуньская, Менск**

## Перадвыбарныя прыпеўкі

Я хадзіла да суседа
Пачытаць газэту.
Русакевіч перакрыў
Мне маю асьвету.

Уключаю тэлевізар
І ад шчасьця плачу я:
Люлі-люлі, цірлі-мірлі —
І брахня сабачая.

Гаварыў мне дзед
Скарына,
Што Гагарына відаў.
Як на пана гнулі сьпіну,
Ён над імі пралятаў.

Ўсталі Колас і Купала,
Беларусь пабачылі.
Ані долі, ані мовы,
Усё прасабачылі.

Партызаны-партызаны,
Беларускія сыны.
За няволю, за кайданы
Нас пазбаўце сатаны.

Севярынец у Сібіры,
А Вячорка у турме.
А Захаранку забілі,
А народ ні бэ, ні мэ.

А хто дзе, а хто дзе,
А мой мілы у судзе.
Бачыць Божа, зробіць цуд,
Скіне ў пекла гэты суд.

А хто ў арміі служыў,
Кашу еў пярловую.
Мы ідзём, зямля дрыжыць,
Бо мы хочам новага!

Я купіла калькулятар
За апошні грошыкі.
Чары-мары, мінус-плюс,
Вылезьлі ярмошыкі.

А я вопыт пераймала,
Калі цётка сватала.
Як вусы казычуць мала,
Бяры барадатага.

**Джуды Сьміт,
hotmail.com**

## Царква не павінна цярпець хлусьню

**Зважаючы на паўсталую дыскусію («НН», №2, №9) аб месцы Царквы ў грамадзкім жыцьці,** мушу заўважыць, што ўдзел Царквы ў канкрэтных палітычных баталіях на баку канкрэтнага палітыка сапраўды ня ёсьць ейнаю місіяй. Але і ня ейная місія — навучаць «мудрасьці, разважнасьці, стрыманасьці». Місіяй Царквы ёсьць укараненьне Слова Божага ў душы людзкія. Бачачы хлусьню, зьдзек з асобы, страх, што здушыў грамадзтва, Царква не павінна мірыцца з такім прыніжэньнем чалавечае асобы і шукаць нейкіх кампрамісаў.

«Што супольнага ў сьвятла зь цемрай? Якая згода Хрыста з Вэліялам?» (2 Карынф. 6:14—15.) Яна мусіць называць ману маной, а зло — злом.

Не адстойваючы чалавечае годнасьці, стаючы ў баку ад пануючай несправядлівасьці, як можаш казаць, што падаў руку дапамогі таму, хто гэтага прагнуў.

Сапраўды, ад іерархаў дзеючых у Беларусі канфэсіяў мы ня чуем зваротаў аб патрэбе трымацца маральнасьці і жыць не паводле зла. Але маецца і іншая пазыцыя. Каб адчуць розьніцу, досыць пачытаць фрагмэнты звароту да вернікаў Сыноду япіскапаў Кіева-Галіцкае Мітраполіі Украінскае Грэка-Каталіцкае Царквы, што прагучаў у 2004 годзе перад выбарамі. Нашы ўкраінскія браты не баяліся адкрыта засьцерагаць хрысьціянаў ад удзелу ў фальсыфікацыі выбараў.

**Міхась Баўтовіч,
Полацак**

## Перамога — у нестардатнасьці

**Апазыцыя шмат гадоў шукае шлях, які прывядзе яе да так доўга чаканай перамогі. Казулін паказаў, што ўсё нашмат прасьцей, чым на першы пагляд здаецца.** Ён пачаў дзейнічаць нестандартна, і сыстэма пачала рабіць памылкі. Навошта было зьбіваць Казуліна? Не пусьцілі б на зьезд — і кропка. На гэтым бы ўсё і скончылася. А так тысячы беларусаў чарговы раз даведаліся, што мае рацыю ў нас толькі адзін чалавек. Лукашэнка стаў прэзыдэнтам дзякуючы таму, што казаў выбаршчыку стандартныя рэчы нестандартна. Зянон Пазьняк быў найбольш пасьпяховым як палітык менавіта ў пачатку 90-ых, калі дазваляў сабе паводзіць сябе так, як астатнія тады баяліся.

У сытуацыі поўнага кантролю дзяржавы над асноўнымі сродкамі інфармацыі творчы падыход зьяўляецца адзіным магчымым сродкам эфэктыўнага супрацьстаяньня. Ці зможа ад яе адштурхнуцца беларуская апазыцыя?

**Ігар Шчэкарэвіч,
Кіеў**

## Эпідэмія хлусьні

**У Докшыцкім раёне ўлады стараюцца ўнушыць людзям, што нічога ня зьменіш.**

«Нічога не кажыце дрэннага падчас прыезду Лукашэнкі», — казалі кіраўнікі прадпрыемстваў падначаленым на пачатку году. А начальнік адной з такіх арганізацый сказаў работнікам: «Нічога ня зьменіце. Мы пераабярэм яго яшчэ на адзін тэрмін”. Нібы не народ абірае прэзыдэнт, а чыноўнікі.

Чым бліжэй да выбараў, тым больш дзяўбуць пра “сьветлае жыцьцё” на днях інфармаваньня. Адзін з такіх меў тэму «Стратэгічныя прыярытэты і кансалідуючыя ідэі беларускіх грамадзянаў. Беларусь напярэдадні трэцяга ўсебеларускага народнага сходу». Агітатары на іх распавядалі, што ўсебеларускі сход — гэта нібыта “вышэйшая праява дэмакратыі».

Ня так даўно па тэлебачаньні выступаў Мілінкевіч. Надта спадабаўся людзям, у тым ліку пэнсіянэрам. Амаль усе гатовы галасаваць за яго альбо за Казуліна. Таму зразумела — «элегантнай перамогі» ня будзе. Аднак ці здольны людзі адстойваць свой выбар?

**Янка Зуброўскі,
Лапуты
(Докшыцкі
раён)**

Рада Беларускае Народнае Рэспублікі
Прэзыдыюм

# Зварот да беларускага народу

Атаўская газэта *The Ottawa Citizen* передрукавала 10 сакавіка артыкул Джэрэмі Пэйджа з *Times* пад загалоўкам «Страх ахапіў Беларусь напярэдадні выбараў».

І тут мне прыпомніліся словы папы Яна Паўла II. «Ня бойцеся», — казаў ён.

Усе тыраніі, усе дыктатуры абапіраюцца на страх. Страхам апраўдваюцца так званыя «моцныя» рэжымы, бо, маўляў, толькі «моцны» правадыр можа абараніць народ ад нутраных і вонкавых ворагаў. Калі ворагаў няма, трэба іх прыдумаць. Так былі прыдуманыя «агрэсіўная» Амэрыка дый найгоршыя з найгоршых — нашыя ўласныя «нацыяналісты».

У адсутнасьці аб’ектыўнай інфармацыі людзям ня бачна, што ўся гэтая прапаганда, якой прамываюцца іх мазгі ад часоў Сталіна, ня мае іншай мэты, як зрабіць зь іх застрашаных нявольнікаў, якія будуць працягваць казаць, як нашыя дарагія бабулькі: «абы вайны не было». Сталін зьнішчыў 20 млн нявінных людзей пад тлумачэньнем, што ён зьнішчае «ворагаў народу». (...)

Сёньня забараняецца чытаць вольную прэсу, канфіскуецца выбарчы матэрыял, арыштоўваюцца патрыёты, забараняюцца мітынгі выбаршчыкаў, канкурэнты Лукашэнкі не дапускаюцца да СМІ і зьбіваюцца. (...)

Калі Лукашэнка здолее зьдзейсьніць сваю задуму «саюзу з Расеяй», дзяржава нашая перастане існаваць, як яна перастала існаваць пасьля далучэньня да Расеі ў 1795 г.

Дарагія суродзічы, вы маеце права, як і ўсе людзі, жыць спакойна і шчасьліва ў сваёй уласнай дзяржаве, бяз страху, без тэрору. Вы маеце права працаваць самі на сябе, на сваіх дзетак, на сваіх унукаў. Вашыя суседзі прайшлі ўжо шлях да нармальнага стану жыцьця. Усе яны гатовыя вам дапамагчы. Адзін толькі сусед вам дабра не жадае, бо калі б жадаў, не падтрымоўваў бы дыктатара Лукашэнку.

Дык паўтару словы Яна Паўла — ня бойцеся!

Не давайце нікому адабраць у вас ваш голас. Не апускайце рук. Пакажыце сьвету сваю чалавечую годнасьць, каб Дзень 25-га Сакавіка стаўся назаўсёды ўсебеларускім Днём Волі.

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла,
Старшыня Рады БНР.**

*Канада, 12 сакавіка 2006 г.*

# Сьмерць пасьля сьмерці

Палітычна Мілошавіч памёр, калі Сэрбіі надакучыла баяцца і яна выйшла на вуліцы. Піша **Віталь Тарас.**

Першая для нармальнага чалавека рэакцыя — спачуваньне. Асабліва калі ты сам ведаеш, што такое гіпэртанія, ішэмічная хвароба сэрца ці інфаркт. А калі чалавек памірае ў турэмнай камэры, далёка ад роднага дому й сваякоў, у атачэньні людзей, сярод якіх няма ніводнага знаёмага ці хоць бы прыязнага твару?

Аднак калі імя нябожчыка Слабадан Мілошавіч, звычайныя чалавечыя пачуцьці адыходзяць на другі плян. Нават калі б нехта й хацеў паразважаць аб хуткаплыннасьці жыцьця ды зьменлівасьці лёсу, тэлевізія ня дасьць гэтага зрабіць. Сьмерць палітыка становіцца сусьветным шоў і выклікае палітычныя эмоцыі, якія ня маюць нічога супольнага з сантымэнтамі.

## Сябры нябожчыка

Адным зь першых на сьмерць Мілошавіча адгукнуўся кіраўнік Беларусі, які назваў яго «выдатным палітыкам нашага часу». Пасьля гэтага патрэба ў якіхсьці яшчэ водгуках з боку беларускіх дзяржаўных чыноўнікаў адпала сама сабой. Ёсьць вядомая прыказка: «скажы мне, хто твой сябар, і я скажу табе, хто ты». Можна перабудаваць гэтую фразу па-іншаму: «скажы добра пра палітыка пасьля ягонай сьмерці, і я скажу табе, чаго ты хочаш».

З расейскіх тэлеканалаў смутак напалам з гнеўнымі тырадамі на адрас Трыбуналу ў Гаазе і ўсяго Захаду выказвалі часьцей за іншых Жырыноўскі, Зюганаў і Прымакоў. Для аднаго гэта была падстава нагадаць пра сябе, для другога — заявіць чарговы раз пра мітычны «славянскі саюз», для трэцяга — пахваліць самога сябе за свой незвычайны дыпляматычны талент. Каб зрабіць прыемнае Прымакову, расейскія, а нярэдка і беларускія журналісты часта згадваюць ягоны славуты «паварот над Атлянтыкай». У траўні 1999 г. тагачасны міністар замежных справаў Расеі, даведаўшыся пра пачатак бамбаваньняў Югаславіі сіламі NATO, адмяніў проста ў паветры свой візыт у Вашынгтон.

Але журналісты забываюцца на тое, што «чаўночная дыпляматыя» Прымакова, які выступаў добраахвотным адвакатам то Хусэйна, то Мілошавіча, то Асада, то Арафата, заўсёды сканчалася, у лепшым выпадку, нічым. Працягам гэткай вытанчанай «дыпляматыі» савецкага ўзору можна лічыць і некаторыя з апошніх дзеяньняў Крамля на замежнапалітычнай арэне. Напрыклад — бліскучы правал на перамовах з Іранам наконт стварэньня СП па перапрацоўцы ўрану. Але размова тут не пра Прымакова. Большасьць расейскіх палітыкаў і палітолягаў новага, пуцінскага, пакліканьня выкарысталі сьмерць Мілошавіча як падставу абвінаваціць Захад і ягоныя інстытуцыі — найперш, Міжнародны трыбунал у Гаазе — у неэфэктыўнасьці, а сам суд над міжнародным злачынцам назваць фарсам. Натуральна, пры гэтым маецца на ўвазе і працэс над Садамам Хусэйнам у Іраку, і ўсе падобныя цяперашнія й будучыя судовыя працэсы над міжнароднымі ваеннымі злачынцамі.

## Балканскі гамбіт

Чалавецтва дагэтуль ня выдумала лепшых інстытуцыяў, акрамя дэмакратычных, да ліку якіх належыць і міжнароднае правасудзьдзе. Можна выстаўляць колькі заўгодна прэтэнзій Карле дэль Понтэ. Але самае галоўнае ў тым, што злачынцаў супраць чалавечнасьці судзяць бяз тэрміну даўніны, не зважаючы на асобы.

Прэзыдэнт Пуцін сёньня гатовы прызнаць «маральную адказнасьць» Расеі за крывавае падаўленьне паўстаньня ў Вугоршчыне ці за 1968 г. у Чэхаславаччыне. Але ён адмаўляе юрыдычную адказнасьць расейскай дзяржавы як спадкаемцы СССР за гэтыя дзеяньні, а таксама за агрэсію супраць краінаў Балтыі ў 1940-х. Адно з самых страшных злачынстваў XX ст. — расстрэл тысячаў грамадзянаў Польшчы ў Катыні расейская вайсковая пракуратура ўвогуле адмовілася лічыць злачынствам, а ягоных ахвяраў — прызнаць палітрэпрэсаванымі. Адмовілася на той падставе, што НКВД у Катыні расстрэльвала не на падставе артыкулаў Крымінальнага кодэксу РСФСР, а паводле запіскі Сталіна, без суду й сьледзтва. Як любіў казаць заснавальнік савецкай дзяржавы, паводле формы — правільна, па сутнасьці — зьдзек.

Магчыма, што паводле крымінальнага кодэксу былой Югаславіі яе кіраўнік не нясе непасрэднай адказнасьці за зьнішчэньне альбо дэпартацыю дзясяткаў тысяч мусульманаў у Косаве ці Босьніі. Але ж дзеля таго й створаны быў міжнародны трыбунал, каб у адкрытым публічным працэсе, пры спаборніцтве бакоў можна было даказаць (альбо абвергнуць) датычнасьць да злачынстваў супраць чалавечнасьці галоўных асобаў краін — удзельніц канфлікту, а ня толькі шара-



Скажы добра пра палітыка пасьля ягонай сьмерці, і я скажу табе, чаго ты хочаш.



говых салдатаў, выканаўцаў загадаў.

Зразумела, суд заўсёды будзе выклікаць незадаволенасьць абодвух бакоў працэсу. Падсудныя, іх абаронцы й сваякі заўсёды будуць лічыць суд несправядлівым, а падсудных — невінаватымі. Сваякі ахвяраў, са свайго боку, заўсёды будуць лічыць пакараньне занадта мяккім. Беларускае й расейскае тэлебачаньне ахвотна паказвала кадры «ўсенароднага смутку» ў Сэрбіі, які выказвалі пераважна сябры сацыялістычнай партыі Мілошавіча. Але тыя ж тэлеканалы пазьбягалі паказваць інтэрвію цяперашняга міністра замежных справаў Сэрбіі й Чарнагорыі Вука Драшкавіча. Ён не выказваў смутку, бо многія сваякі ды паплечнікі Драшкавіча сталі ахвярамі рэжыму Мілошавіча.

І ўсё-ткі тэлебачаньне не змагло абысьці таго сымбалічнага факту, што на наступны дзень пасьля ягонай сьмерці выпала трэцяя гадавіна забойства прэмьер-міністра Сэрбіі Зорана Джынджыча, былога лідэра апазыцыі, якая процістаяла дыктатуры. На магілу Джынджыча прыйшлі тысячы людзей. Многія зь іх шкадавалі і пра сьмерць Мілошавіча, але толькі таму, што яна дазволіла ўнікнуць прысуду.

Немагчыма схаваць той факт, што сэрбскае грамадзтва застаецца расколатым на два лягеры. І гэта таксама трэба прызнаць спадчынай Мілошавіча. Ягоная сьмерць стала свайго роду вяршыняй своеасаблівага трохкутніка ў часе й прасторы — забойства Джынджыча ў Бялградзе, сьмерць Ібрагіма Руговы ў Прышціне, сьмерць Мілошавіча ў турме ў Галяндыі. І якой бы ні была непасрэдная прычына ягонай сьмерці, журналісты ўжо сьпяшаюцца падвесьці рысу пад мінулым. Маўляў, апошняя балканская вайна скончылася — трэба аб ёй забыцца й будаваць будучыню, так бы мовіць, з чыстага ліста.

## Слоба, Коба ды іншыя

Пра былых хаўрусьнікаў Мілошавіча ў Менску й Маскве можна сказаць так, як некалі пасьля францускай рэвалюцыі казалі пра дынастыю Бурбонаў. Яны ўсё памятаюць, але нічому не навучыліся. Дый сучаснае жыцьцё ў Беларусі не дае забыцца на ўрокі, якія даваў сваім супляменьнікам і ўсяму сьвету Слоба. (Ці ня праўда, ёсьць у гэтай мянушцы нешта сугучнае з партыйнай мянушкай Сталіна — Коба?) Усе катаклізмы, няшчасьці й трагедыі, якія здараліся з сэрбскім народам пры канцы XX ст., ён умеў выкарыстаць ва ўласных мэтах. Чым горай было народу — тым лепей дыктатару. Вайна з Харватыяй, потым у Босьніі, апагеем якой сталася разьня мусульманаў у Срэбраніцы, этнічныя хваляваньні ў Косаве, нарэшце масавыя выступы апазыцыі ў Бялградзе ў 1998-м — усё было Мілошавічу ні па чым. Ягоная ўлада толькі ўзмацнялася, а банкаўскія рахункі яго сваякоў папаўняліся. Нават мільённыя мітынгі на вуліцах Бялграду не былі для яго апошнім аргумэнтам. Апошнім аргумэнтам зрабіліся самалёты натаўскае авіяцыі, аб якую разьбіліся ўрэшце невымерныя амбіцыі Мілошавіча. Думаецца, яго згубіла ў турме не атрута, але адчуваньне ўласнага бясьсільля перад законам і абставінамі. Магчыма, ён і быў атручаны, але атручаны ўласнай прагай да ўлады й нянавісьцю, якія душылі ягонае сэрца да апошняга моманту.

Сярод дыктатараў і тыранаў, напэўна, таксама бываюць па-свойму таленавітыя. Толькі гэта таленты асаблівага кшталту. Імі валодалі Ленін, Гітлер і ў вышэйшай ступені Сталін. Былі і ёсьць у іх і больш пасрэдныя вучні, дыктатары сярэдняй рукі. Але адзін, галоўны ўрок усе яны засвойвалі адразу і на ўсё жыцьцё. Калі табе ў рукі трапіла ўлада, ніколі і ні пры якіх абставінах не выпускай яе з рук. У прыхільнікаў «цьвёрдай рукі» заўсёды былі й будуць свае паклоннікі. Менавіта для іх «балканскі мясьнік» Мілошавіч — герой. Каб разьвянчаць гэты міт, быў толькі адзін спосаб: арыштаваць і судзіць.

Сьмерць падсуднага сталася чарговым доказам трывіяльнай ісьціны, што ўсяму прыходзіць канец — нават дыктатарам. Нездарма Сталін некалі ўсур’ёз цікавіўся ў савецкіх лекараў, ці магчымая фізычная несьмяротнасьць. Шчыры адказ расчараваў і нават раззлаваў. Імаверна, гэта стала адным са штуршкоў да фабрыкацыі вядомай «справы дактароў» незадоўга перад сьмерцю правадыра. Дарэчы, ягоны скон таксама дагэтуль ахутаны легендамі. Паводле адной зь іх, Сталіна атруцілі ягоныя падначаленыя.

Хто ведае, можа, сярод былых паплечнікаў Мілошавіча па партыі альбо сяброў з братняй Расеі таксама знайшліся такія, хто быў зацікаўлены ў тым, каб ён хутчэй пайшоў з жыцьця... Але ў кожным выпадку гэта ўжо ня мае ніякага значэньня.

Прынцыповае значэньне мае тое, што ягонай дыктатуры паклалі канец не сьляпы лёс і нават не самалёты NATO, а сэрбскія рабочыя й студэнты, якім аднойчы надакучыла баяцца, і яны выйшлі на вуліцы, каб прагаласаваць за «адзінага кандыдата» ад апазыцыі. Менавіта тады Мілошавіча напаткала палітычная сьмерць, якой ён баяўся больш, чымся сьмерці фізычнай.

А баяцца цяпер прыйшоў час іншым ваенным злачынцам — найперш Караджычу й Младзічу, выдачы якіх па-ранейшаму чакае Міжнародны трыбунал. Месцаў у камэрах турмы ў Гаазе яшчэ хопіць, трэба спадзявацца, на многіх злачынцаў і дыктатараў.

# «Духоўныя войны» эпохі застою

*Што можа быць больш «агалцелае», чым прапаганда? Вядома ж, толькі беларуская прапаганда...* ***(чорны гумар)***

Спэкуляцыі на «духоўнасьці» ці «асаблівым шляху» ўзьнікаюць там, дзе пануе бясспраўе, гвалт улады, чыноўнае свавольства.

Калі б Ленін жыў сёньня, то найважнейшым з мастацтваў ён назваў бы тэлевізію. Але каб галоўны скульптурны герой нашай краіны пабачыў БТ, то, напэўна, перавярнуўся б у труне. Наша тэлемастацтва напярэдадні выбараў — відовішча не для слабых. Думаю, сам Гёбэльс пазайздросьціў бы той ахінеі, што гоняць у этэр умельцы агітпропу. Сумесь расейскага манархізму і камунізму, ваяўнічага праваслаўя і атэізму, ксэнафобіі і сусьветнага мэсіянства — наўрад ці такое можа зьмясьціцца ў галаве здаровага чалавека. Напэўна, у галовах беларускіх ідэолягаў варыцца такая «каша», што многім зь іх рана ці позна не мінуць вар’ятні.

## Сьвяты... Вісарыёнавіч

Асабліва цікава назіраць, як услед за Расеяй нашы «патрыёты» кананізуюць апошняга расейскага цара. Быў — Мікола-«крывавы», кат «трудавога народу», стаў — Мікола-«сьвяты», ледзь не галоўны пэрсанаж праваслаўнага пантэону. Яго апанэнты-бальшавікі зрабілі адваротны шлях — з ікон часоў сацыялістычнай рэвалюцыі трапілі ў апраметную расейскай гісторыі. Але ж у Беларусі жывы міт пра Сталіна разам зь ягонай «лініяй» яшчэ ў вялікай пашане. Менавіта пры ім разбураліся храмы і масава зьнішчаліся сьвятары, аж да таго, што ў 1939 г. на ўсю Ўсходнюю Беларусь застаўся адзін праваслаўны прыход. Дык каму цяпер зьбіраюцца маліцца беларускія «ідыёлухі»? Можа, ужо час хадайнічаць перад Масквой аб кананізацыі сьвятога Ёсіфа? Прэцэдэнт зь Міколам II ужо ёсьць, а падставы тут ня менш сур’ёзныя.

Па-першае, Джугашвілі-Сталін быў праваслаўны і меў няскончаную сэмінарыю. Па-другое, ён памёр у выніку жыда-масонскай змовы ад рук лекараў-забойцаў, і гэта лёгка могуць даказаць «лепшыя беларуская гісторыязнаўцы». Такім чынам, спадарства, рыхтуйце ў Курапатах месца для царквы сьв.Ёсіфа Вісарыёнавіча, а калі Масква раптам заўпарціцца, то кананізацыю можна правесьці і адпаведным указам.

## Фарысэі-чэкісты-праведнікі

Сёньня нават просты абываталь разумее, што трэба калі не знайсьці свой, беларускі погляд на бліжэйшую гісторыю, то хаця б крытычна пераасэнсаваць вядомыя і малавядомыя факты. А то з гэтага хаатычнага «вінегрэту» не выходзіць ні духоўнай ежы, ні інтэлектуальнай спажывы. Яе немагчыма ні слухаць, ні глядзець, ні нюхаць. Такое ўражаньне, што з экрану на цябе пастаянна вывальваюць тоны «ірвотных мас», і адзіная адэкватная рэакцыя на гэтыя тэлеваніты — хутчэй ачысьціцца ад іх. Можа, тэлекухарам плацяць малыя грошы, і яны наўмысна гоняць такую «туфту»? Не, праблема ў іншым. Бадай, ніводны, нават з самых высокапасаджаных ідэолягаў, ня мае права і ня можа сказаць нешта сьвежае, арыгінальнае, сваё, што б выходзіла за межы разуменьня і лексыкі Галоўнага Начальніка. Быць перакананым атэістам і рабіць выгляд зацятага верніка — больш амаральна, чым прызнацца ў сваім нявер’і або немагчымасьці ўвераваць. Шчырасьць — адвечная каштоўнасьць чалавечай натуры, але сёньня ў Беларусі яна небясьпечная. Напрыклад, шчыра прызнаць, што сьвецкая і царкоўная гісторыя, мірская і рэлігійная ўлады — сёньня зусім розныя рэчы, — патрабуе ўжо смеласьці.

## Хлусьлівая вайна

Спэкуляцыі на «духоўнасьці», «сьвятасьці» ці «асаблівым шляху» ўзьнікаюць там, дзе пануе бясспраўе простых людзей, гвалт улады, хабарніцтва, чыноўнае свавольства, злачыннасьць. Ніхто ў Нямеччыне, Грэцыі або Ісьляндыі не фанабэрыцца сваёй «супэрдухоўнасьцю», ніхто не прыніжае іншых, не абвінавачвае ў сатанізьме, садаміі і ўсіх грахах іншыя народы ці дзяржавы. Сапраўдная духоўнасьць, як і сапраўднае хрысьціянства, — сьціплая і некрыклівая, добрыя справы робяцца ціха, бязь лішняй пампэзнасьці. Дый вайна ня можа быць «духоўнай». Любая вайна, нават рэлігійная, — зьява бездухоўная, бо яна ёсьць часовай перамогай хціваcьці, зайздрасьці, агрэсіі, невуцтва ды іншых чалавечых заганаў над розумам і вечнай душой. Дух перамагае ня гвалтам, а любоўю, не прымусам, а суперажываньнем. Таму «сусьветны паход», распачаты нашымі «крыжакамі» ад праваслаўя і КДБ, насамрэч толькі рэклямна-выбарчая акцыя аднаго нябеднага кандыдата. А калі гэта і «вайна», то хлусьлівая вайна бяз правілаў, вайна супраць усіх і ўсяго, у тым ліку і супраць будучыні беларускага народу.

Гісторыя сьведчыць, што ісьціна нараджаецца не на вайне, а пасьля яе за сталом перамоваў. Што ўсе скарбы і каштоўнасьці ствараюцца ў мірны час, а вайна толькі пляжыць і марнуе іх. Ня думаю, што мы сёньня настолькі моцныя і багатыя, каб распачынаць якія б там ні было войны. Таму трэба ясна сказаць: «Далоў вайну і тых, хто яе распальвае — ідэолягаў, кар’ерыстаў, праваслаўных атэістаў, савецкіх рэваншыстаў і іншых спэцслужбістаў. Жыве мір у Беларусі і ва ўсім сьвеце!»

**Васіль Аўраменка, Магілёў**

# «Дзякуй прэзыдэнту за магчымасьць жыць»

Дзяржаўныя часопісы ствараюць вобраз «Бацькі народу». Піша Сямён Печанко.

Старое пакаленьне беларусаў памятае часы, калі нават падручнікі па аграхіміі пачыналіся з асьвятленьня ролі чарговага зьезду КПСС у павышэньні эфэктыўнасьці выкарыстаньня сродкаў аграхіміі.

Нарэшце шчасьлівыя былыя часы вярнуліся. Дзяржаўныя часопісы друкуюць вытрымкі з прамоваў прэзыдэнта, гутаркі з старшынямі аблвыканкамаў пра сацыяльна-эканамічнае разьвіцьцё рэгіёнаў і нават лісты вучняў школаў і ліцэяў прэзыдэнту.



**Фатографам дзяржаўных выданьняў давялося ўспомніць прыёмы сацрэалістычнага мастацтва. (Здымак Артура Прупаса, «Советская Белоруссия»).**

## Клапатлівы прэзыдэнт

Гарадзенскі гімназіст Сяргей Ярашэвіч піша ў «Беларускай думцы» (2006, №1): «Сталеючы, задумваешся, што далёка не паўсюль на нашай плянэце ў аднагодкаў шчасьлівае дзяцінства. Хочацца падзячыць роднай краіне, нашаму прэзыдэнту А.Р.-Лукашэнку за ўмацаваньне міру, дружбы і згоды паміж народамі, за тое, што мы ў Беларусі маем магчымасьць спакойна жыць, вучыцца, працаваць і займацца творчасьцю. Няхай нашая мілая Айчына будзе апораю міру, шчасьця і працы!»

Часопіс «Маладосць» (2004, №8) друкуе гутарку зь менскім школьнікам Андрэем Радковым, удзельнікам БРСМаўскай акцыі «Пісьмо — Прэзыдэнту». Малады чалавек радуецца эўрапейскаму выгляду нашай сталіцы, смуткуе з-за апусьценьня вёсак. «Мне вельмі балюча бачыць нашыя апусьцелыя вёскі. Дзе ўсё менш і менш застаецца моладзі, дзе безупынна скарачаецца колькасьць вучняў. А хіба можа быць дзяржава бязь вёскі? Мне думаецца, што трэба, як было раней, у савецкія часы, аднаўляць вёскі маладзёжнымі будоўлямі, каб маладыя, таленавітыя людзі ехалі туды і ня толькі аднаўлялі, а і стварылі на сваё разуменьне якой яны бачаць вёску XXI ст.». На пытаньне, чым найбольш запомнілася сустрэча з прэзыдэнтам, Андрэй адказаў: «Я спачатку хацеў задаць некалькі пытаньняў наконт тэставаньня і таго, што часам перашкаджае нармальнаму жыцьцю, але прэзыдэнт пачаў размаўляць з хлопцам, які працаваў улетку на камбайне, была размова пра ўраджайнасьць, пра працу, і я палічыў, што мае пытаньні менш значныя».

Аб клопаце прэзыдэнта пра моладзь піша і аўтар нататкі пра белавескую рэзыдэнцыю Дзеда Мароза: «Наш прэзыдэнт клапоціцца пра таленавітую моладзь, яго словы і думкі на галаву вышэй за тое, што думаюць і пішуць многія «спэцы» ад пэдагогікі і культуры» (Беларуская Думка, 2005, №12).

## Шчыры прэзыдэнт

Запатрабаваныя дзяржаўнай прапагандай і праваслаўныя дзеячы. Уладзімер Чартовіч, гендырэктар ЗАТ «Праваслаўная ініцыятыва» і выдавец славутай кнігі «По законам подлости», у часопісе «Беларуская Думка (2005, №10) вытлумачвае прэзыдэнцкую характарыстыку сябе як праваслаўнага атэіста: «Ён не лукавіць ні ў вялікім, ні ў малым. Неяк ён назваў сябе «праваслаўным атэістам». І як жа зубаскаліла наша «апазыцыя»! А сьмешнага тут нічога няма. Насупраць, тым самым А.Лукашэнка яшчэ раз давёў, што крывіць душой і ня можа, і ня хоча. Дарога да Бога нялёгкая для любога чалавека. А ўжо для таго, хто прайшоў багаборніцкую савецкую школу — тым больш. Менавіта гэта і выказаў Прэзыдэнт сваім экспромтам».

## Нязломны прэзыдэнт

Кандыдат гістарычных навук Мікалай Катэнка на старонках «Полымя» (2005 г.) раскрывае сакрэты «халоднай вайны». Інфармацыйная вайна, разьвязаная Захадам і ЗША, закранула і Беларусь. «Вакол Беларусі плятуцца езуіцкія сеткі. Чаму? У нашай краіне адбылася стабілізацыя кіраваньня дзяржавай».

Знаходзіцца на бачынах часопісаў месца і для замежных аўтараў. Сакратар ЦК кампартыі Літвы Часлаў Высоцкі («Беларуская думка», 2005, №9) моцна крытыкуе палітыку Польшчы і Літвы: «Зараз Польшча — траянскі асёл Эўропы, але ёй ня варта забывацца на тое, што былі ўжо тры падзелы Польшчы. Можа быць і чацьверты. (…) Літва ператварылася ў галодны край з крамамі, запоўненымі заморскімі таварамі». Іншая справа — Беларусь. «Краіна скіраваная ў будучыню. Гэта наглядна пацьвердзілі і нядаўнія масавыя ўрачыстасьці, прысьвечаныя Дню Незалежнасьці сувэрэннай дзяржавы. Моладзь, што запоўніла да берагоў Кастрычніцкую плошчу, бурнай авацыяй падтрымала стваральны заклік прэзыдэнта: «Давайце зробім так, каб наш любы Мінск стаў горадам сьвету, дабра і шчасьця».

Беларусь займае асаблівае месца ў сэрцы літоўскага камуніста. «Прэзыдэнт Лукашэнка змагаецца ня толькі за Менск, але і за Маскву, Кіеў, Вільнюс, ён гераічна ўтрымлівае апошні рубеж перад «Dran*k* [так у тэксьце — ***«НН»***] nach Osten».

**Сямён Печанко**

# Цяжкая ноша беларускіх банкаў

За мінулы год КДК распачаў 310 крымінальных справаў паводле вынікаў праверак банкаў ды іх кліентаў. 164 зь іх — за выманьваньне крэдытаў. Пра гэта Нацбанк паінфармаваў камэрцыйныя банкі краіны адмысловым лістом.

КДК выявіў каля 32,5 млрд руб. незаконна атрыманых крэдытаў. Таксама ў 2005 г. камэрцыйныя банкі правяраў і Нацбанк. Ён зладзіў 14 праверак — у Белаграпрамбанку, Белзьнешэканамбанку, «Прыёрбанку», Белінвэстбанку, а таксама ў банках-рэзыдэнтах свабодных эканамічных зон.

Парушэньні знойдзеныя таксама ў крэдытнай сфэры, пры апэрацыях з каштоўнымі паперамі, пры ўліку актываў, пры адлюстраваньні памеру ўласнага капіталу банкаў.

Шмат банкаў з праверaных не стварылі службы маніторынгу рызыкаў.

Толькі па выніках комплекснай праверкі Белаграпрамбанку было распачата 45 крымінальных справаў. Праблемы — у «Джэм-банку», «Міжгандальбанку», «Белінвэстбанку».

Цяпер у Беларусі функцыянуе 30 камэрцыйных банкаў. На долю шасьці буйнейшых банкаў — Беларусбанку, Белінвэстбанку, Белпрамбудбанку, Белагрампрамбанку, Белзьнешэканамбанку і Прыёрбанку (адзінага недзяржаўнага ў гэтым сьпісе) прыпадае каля 90% валавых актываў усёй банкаўскай сыстэмы. У Беларусі няма філіяў замежных банкаў, усе банкі, што дзейнічаюць у краіне, – рэзыдэнты Беларусі. У кожным банку ў назіральную раду ўваходзіць сябра ўраду, хоць гэта парушае прынцып таямніцы банкаўскіх апэрацыяў.

На бягучы год беларускім банкам даведзена заданьне павялічыць аб’ём крэдытаў у рублях для прадпрыемстваў прамысловасьці й сельскай гаспадаркі на 50% (да 2 трлн 700 млрд руб.), бо практыка прыцягненьня замежных інвэстыцыяў у Беларусі фактычна замарожаная.

**Яўген Васілеўскі**

# Сяргей Балыкін: Хачу бюлетэнь па-расейску

Юрыст газэты «Белорусы и рынок» Сяргей Балыкін накіраваў скаргу ў Цэнтравыбаркам, дзе ён выказвае нязгоду з тым, што выбарчыя бюлетэні надрукаваныя толькі па-беларуску. Гэта, на яго думку, можа перашкодзіць зрабіць правільны выбар выбарцам, якія не разумеюць беларускай мовы: «Уявім, што чалавек ня ведае беларускіх назваў месяцаў, а хоча прагаласаваць за кандыдата, зыходзячы зь яго (…) гараскопу. Можа быць, гэта і глупства, але гэта права выбаршчыка. Атрымліваецца, што адрозьненьні ў беларускай і расейскай мовах могуць прывесьці да памылак у галасаваньні». А з гэтага, па яго словах, вынікае, што расейскамоўныя грамадзяне Рэспублікі Беларусь абмежаваныя ў рэалізацыі свайго выбарчага права.

Выбарчыя бюлетэні надрукаваныя па-беларуску дзякуючы высілкам ГА «Таварыства беларускай мовы». Таму па камэнтары мы зьвярнуліся да яго старшыні Алега Трусава.

Найперш сп.Трусаў падзякаваў старшыні ЦВК Лідзіі Ярмошынай. «Закон аб мовах дазваляе выбіраць любую зь дзяржаўных моваў, і я ўдзячны сп.Ярмошынай за такі выбар. Раю сп.Балыкіну спачатку ініцыяваць зьмены ў закон, бо бяз гэтага ягоныя скаргі і звароты нічога ня вартыя. Хіба папрасіць ЦВК надрукаваць для сп.Балыкіна пэрсанальны бюлетэнь па-расейску, каб пазьбегнуць памылак, а пасьля здаць яго ў музэй».

Сп.Трусаў адзначыў, што ў гісторыі сучаснай Беларусі гэта першы выпадак, калі афіцыйны дакумэнт, якім ёсьць бюлетэнь, накладам 7 млн надрукаваны толькі па-беларуску. А вось інфармацыйныя плякаты ў кожным раёне сталіцы выкананыя на абедзьвюх дзяржаўных мовах. «Аднак толькі Заводзкі раён аформіў інфармацыйныя стэнды выключна па-беларуску», — кажа Алег Трусаў.

**Сямён Печанко**




**Апошняя зімовая рыбалка на праспэкце Скарыны.**

### Казіно ў езуіцкіх мурох

З канца 1990-х стаіць у цэнтры Воршы закансэрваваным будынак былой езуіцкай калегіі. 150 гадоў там месьцілася вязьніца. Пасьля яе закрыцьця ў будынку меркавалі зрабіць мастацкі ды экалягічны музэі, адчыніць мастацкія майстэрні, кавярні. Але не было грошай. Хіба ў 2000 г., калі побач мусіў праехаць А.Лукашэнка, будынак пафарбавалі ды зрабілі больш-менш прыстойны дах. Няма фінансаў і сёньня. Старшыня гарвыканкаму Валер Шабадалаў зьвярнуўся да прадпрымальнікаў з прапановай узяць будынак калегіі (цалкам ці часткамі) у доўгатэрміновую арэнду. Замест культурнага цэнтру тут плянуюць зрабіць спартовы або забаўляльны комплекс. Ахвотных пакуль няма.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

# «N.R.M.» сыграў у Вільні

Гурт «N.R.M.» 16 сакавіка, у Дзень салідарнасьці, даў канцэрт у віленскім клюбе «Intro», што месьціцца непадалёк ад касьцёлу Сьв. Ганны. Цікава, што гурт ніколі ў сваёй гісторыі не выступаў у Вільні.

# «Тарпач» па-за палітыкай

Пераможца «Басовішча-2004» «Тарпач» знайшоў новую вакалістку замест Сьветы Сугакі, што сышла з гурту два месяцы таму. Удзельнікі каманды тады заявілі, што хочуць займацца выключна музыкай, а не палітыкай: «Час размахваньня сьцягамі прайшоў. Мы больш не жадаем мітынгаваць».

Цяпер у гурце пяе Вольга Самусік — музычная журналістка, вакалістка «Жыгімонта Вазы». «Сьвета — цікавая асоба, але ў мяне харызмы ня меней», — кажа яна.

Сама Сьвятлана запісала нядаўна разам з «Таварышам Маўзэрам» песьню «Беларусь будзе вольнай!», якая днямі была прэзэнтавана на «Тузіне гітоў».



**«N.R.M.» падчас канцэрту салідарнасьці ў Варшаве.**

# «Краскі» — за Мілінкевіча

Гурт «Краскі» распаўсюдзіў ліст у падтрымку Мілінкевіча. «Ужо тры гады, як мы знаходзімся на выгнаньні. Мы ведаем, што такое рэжым Лукашэнкі, і выпрабавалі магутнасьць яго рэпрэсій на сабе — у 2003 г. наш офіс у Менску быў захоплены АМАПам, нас жорстка зьбівалі, абвінавачвалі, дапытвалі і змусілі зьехаць зь Беларусі», — гаворыцца ў лісьце.

Цяпер «Краскі», што паходзяць з Гомелю, знаходзяцца ў ЗША і пэрыядычна даюць канцэрты ва Ўсходняй Эўропе. Гурт зычыць перамогі на выбарах Мілінкевічу і спадзяецца вярнуцца ў вольную Беларусь. «Мы з вамі! Мы з Радзімай», — так сканчаецца ліст.

# Музыкі сьпяваюць пра Чарнобыль

Пасьля выданьня праекту «Песьні Свабоды» лэйбл «VoliaMusic» узяўся за рэалізацыю складанкі, якая будзе прысьвечана 20-м угодкам чарнобыльскай катастрофы. «Тэма Чарнобыля — заўжды актуальная, у тым ліку і сярод музыкаў», — кажа завадатар праекту Puper.

Плянуецца сабраць усе ранейшыя вядомыя песьні пра Чарнобыль, экалёгію, радыяцыю: ад «бондаўскага» «Радыяактыўнага блюзу» — да «Радыяцыі» ў выкананьні «Тарпача». У дыск увойдзе і відэакліп на песьню «Крамы» «Гомельскі вальс».

Узяць удзел у складанцы пад працоўнай назвай «Чарнобыльскі вецер» можа кожны гурт. Свае музычныя творы на тэму Чарнобылю, радыяцыі, экалёгіі, прыроды можна дасылаць да 26 сакавіка.

E-mail праекту — kryw.mzr@ gmail.com, тэл.: 8 (029) 3948927.

**Сяргей Будкін**



# Я сапраўды люблю бляндынак





Нарвэгія зьдзівіла аэрапортам: шкляная падлога і дрэва — сучасны нарвэскі дызайн. Duty free на выхадзе… кажуць, ідэя швэдаў, спадабалася. Сучасныя паркінгі немагчыма адрозьніць ад аэрапорту.

У аўтобусе па дарозе ў горад ніхто не размаўляе, слухаюць плэеры, чытаюць часопісы.

Вуліца Осла ад цэнтральнага вакзалу да гатэлю — вуліца прастытутак і наркаманаў. Прастытуцыя легальная, наркаманы побач — паліцыі прасьцей назіраць за імі на спэцыяльна вызначанай тэрыторыі. У апошні час усходнеэўрапейскія прастытуткі ня вытрымалі канкурэнцыі з боку чорных таўшчэзных камэрунак — нахабныя, хапаюць за рукі незнаёмцаў.

Нарвэжцы ў прынцыпе не гавораць на вуліцы, сьмех і гучныя размовы — толькі ля ўнівэрсытэтаў ці моладзевых інтэрнатаў. Геаграфічная ізаляванасьць стала ізаляванасьцю пэрсанальнай — не турбаваць па дробязях, паважаць свабоду чалавека. Нарвэгія абмяркоўвала два дні, ці страляць па расейскім браканьерскім караблі «Электрон», які захапіў нарвэскіх кантралёраў, ці не... Івар зь міграцыйнай службы: «Нам даражэй добрыя стасункі з суседзямі, навошта страляць. Так, і мы добра ведаем, расейцы на нашым месцы празь пяць хвілін патапілі б…» Яны іншыя.

Праспаў сваю станцыю ў цягніку — вяртаюся дзьве станцыі назад на экспрэс-цягніку ў аэрапорт. Стуардэса пачынае распытваць, чаму выходжу раней, тлумачу. «Where are you from? Do you know where your hotel is?..» — усе размаўляюць па-ангельску, ад гандляра хот-догамі, кантралёра і





кіроўцы аўтобуса да… усе размаўляюць. Бляндынка з доўгімі валасамі і нагамі даплаты за квіток так і не спытала. Марыя, знаёмая, тлумачыць: «Чалавек мае права на памылку…»

Нарвэгія — краіна двухмэтровых бляндынак, гардэробаў без гардэробшчыц. На квітку ў тэатар побач з нумарам месца і шэрагу — нумар у гардэробе. Пакідаеш свае рэчы — ніхто ня сочыць, адчуваю дыскамфорт. Іх інтэрпрэтацыя Дастаеўскага далёкая ад арыгіналу — ну, ня ўмее Раскольнікаў крычаць натуральна, нават у тэатры. Ня ведае іх культура крыку. Эмоцыі нарвэжцаў пастэльных таноў, трэба прыслухоўвацца.

Музэі, галерэі, дзіцячыя спартовыя сэкцыі — бясплатна. Усё, што зьвязана з тытунём і алькаголем — вельмі дорага: пляшка піва, звычайнага, нарвэскага, каштуе ў бары каля $10. «Дорага быць алькаголікам ў Нарвэгіі», — жаліцца новы знаёмы. Яго былая жонка падала на развод, дзеці па чарзе жывуць у кожнага зь іх, па тыдні. У адпачынак зь немаўляткам — таксама па чарзе.

Нарвэгія — першая краіна ў сьвеце па ўзроўні жыцьця. На вечарынцы, прысьвечанай фіналу конкурсу на найлепшы дызайн бакалаў для кактэйляў, адсутнічае фэйс-кантроль, як і дрэс-код. Усе апранаюцца як хочуць.

Адзін з самых высокіх узроўняў суіцыдаў — у Нарвэгіі…

Я бачыў камунізм.

**Андрэй Лянкевіч,**
**фота аўтара**





# НАВІНЫ ЭЎРАЗЬВЯЗУ

## Украіна крочыць у ЭЗ

За першы год рэалізацыі супольнага пляну дзеяньняў «Украіна — ЭЗ» падпісаны мэмарандум аб супраці ў галіне энэргетыкі, пачаліся перамовы пра лібэралізацыю візавага рэжыму, наданьне Украіне статусу краіны з рынкавай эканомікай. Галоўная задача пляну — падрыхтаваць бакі да падпісаньня г.зв. «паглыбленага пагадненьня», якое мусіць зьмяніць існае пагадненьне аб партнэрстве й супрацы. Камісар па замежных сувязях і палітыцы суседзтва Бэніта Фэрэра-Вальднэр адзначыла сваё задавальненьне ўзроўнем дачыненьняў Эўразьвязу й Украіны: «За гэты год Украіна прадэманстравала сваю рашучасьць наблізіцца да ЭЗ. Я спадзяюся на далейшую плённую супрацу». У якасьці аднаго зь яе аспэктаў яна назвала парлямэнцкія выбары 26 сакавіка, якія мусяць стаць пацьверджаньнем крочаньня краіны па шляху дэмакратыі.

## Адна жанчына —1,5 дзіця

Эўрастат абвесьціў вынікі дасьледаваньня стану жанчын у ЭЗ. Паводле маніторынгу, сярэдняя працягласьць жыцьця жанчыны ў ЭЗ — 81,2 году, мужчыны — 75,1). У сярэднім адна жанчына ў Эўразьвязе мае паўтара дзіця. Найвышэйшы «дзіцячы паказьнік» — у Ірляндыі: 1,99 дзіцяці на жанчыну, сама меней — у Чэхіі: 1,22. Сярэдні ўзрост жанчыны, што нараджае першае дзіця, — 28,2 году.

Толькі ў Вялікабрытаніі й Швэцыі сярэдняя працягласьць працоўнага дня аднолькавая для абодвух палоў, а ў Італіі, Славеніі, Эстоніі, Літве, Гішпаніі, Вугоршчыне жанчыны працуюць на гадзіну болей, чым мужчыны, і гэта — без уліку хатняй працы, асноўны цяжар якой прыпадае таксама на жаночыя плечы.

## Абарона ад глябалізацыі

Эўракамісія прапанавала праект выдаткоўваньня штогод 0,5 млрд эўра для 50 тысячаў эўрапейскіх працоўных, што пацярпелі ад наступстваў глябалізацыі. Для гэтага будзе створаны новы фонд — «Антыглябалізацыйны». Сродкі гэтага фонду могуць быць накіраваныя на зьмену спэцыяльнасьці, падвышэньне кваліфікацыі альбо на пошкук іншай працы.

## Транснацыянальная бібліятэка

Цягам пяці гадоў звыш 6 млн кніг і дакумэнтаў, што ўяўляюць культурную спадчыну Эўропы, будуць выкладзеныя ў лічбавым выглядзе на адмысловы інтэрнэт-сайт. Праект мае назву «Эўрапейская лічбавая бібліятэка». Да канца 2006 г. да яго будуць прыцягнутыя ўсе бібліятэкі краінаў ЭЗ.

## Швайцарыя таксама

З 1 красавіка Швайцарская канфэдэрацыя, якая не ўваходзіць у ЭЗ, зробіць крок насустрач аб'яднанай Эўропе: яна стане сябрам Эўрапейскага агенцтва аховы прыроды. Ад красавіка агенцтва будзе налічваць 32 краіны.

## Падвышаецца аўтамабільны IQ

Эўракамісія распачала праграму «Разумны аўтамабіль». Адмысловыя сыстэмы ў «разумных» машынах будуць інфармаваць кіроўцаў пра сытуацыю на дарогах у рэжыме рэальнага часу, што дазволіць паменшыць колькасьць затораў і здарэньняў на дарогах. Таксама «разумныя аўто» будуць здольныя паменшыць расход паліва. Цяпер каля 10% дарог ЭЗ штодня блякуюцца вялізнымі заторамі. А 26% усіх эўрапейскіх энэргетычных затрат прыпадае на транспарт.

## ЭЗ чакае новых сяброў

На паседжаньні парлямэнцкай асамблеі NATO сябра Эўракамісіі, адказны за пашырэньне Эўразьвязу, Олі Рэн адзначыў, што на парадку дня пашырэньня ЭЗ — паўднёва-ўсходняя Эўропа, а менавіта — Балканы й Турэччына. Рэн паведаміў, што ў траўні Эўракамісія разгледзіць пэрспэктывы ўступленьня ў ЭЗ Баўгарыі й Румыніі і вырашыць, ці адбудзецца ўступленьне ўжо ў 2007 г., ці годам пазьней.

## Карысны сайт

Пры канцы лютага пачалася праца сайту, дзе штодзённа зьмяшчаецца ля мільёна працоўных вакансіяў у ЭЗ. Яго адрас: http://www.europa.eu.int/comm/employment_social/workersmobility2006/index_en.htm

Згодна з апошнім апытаньнем сацыялягічнай службы ЭЗ «Эўрабаромэтар», трацiна грамадзянаў ЭЗ працуе не ў «сваёй» краіне, а больш за 53% апытаных эўрапейцаў падтрымліваюць ідэю вольнага перасоўваньня працоўнай сілы па кантынэнце.

**Зьміцер Дрыгайла**

Больш падрабязную інфармацыю вы знойдзеце на партале Эўразьвязу (http://europa.eu.int), сайтах старшынства Аўстрыі ў ЭЗ (http://www.eu2006.at/en/index.html?null) і Парадстаўніцтва Эўракамісіі ва Ўкраіне й Беларусі (www.delukr.cec.eu.int і www.delblr.cec.eu.int).

# Цьвік у жэле

Заходнія карпарацыі дапамагаюць Кітаю будаваць у Інтэрнэце новы «Вялікі мур». Піша **Алесь Кудрыцкі.**




Неяк Біл Клінтан, тады яшчэ прэзыдэнт ЗША, сказаў: «Калі ўлады Кітаю паспрабуюць кантраляваць Інтэрнэт, я толькі магу пажадаць ім посьпехаў. Гэта тое самае, што спрабаваць прыбіць жэле цьвіком да сьценкі». Але выглядае на тое, што кітайскія ўлады ўжо знайшлі патрэбны цьвік, прычым — на радзіме Клінтана.

## Замураваны Інтэрнэт

Паводле прыблізных падлікаў, у Кітаі больш за 110 мільёнаў карыстальнікаў Інтэрнэту. Больш толькі ў ЗША, дзе Сецівам карыстаюцца 200 з гакам мільёнаў чалавек. Але паміж двума найбуйнейшымі інтэрнэт-рынкамі сьвету ёсьць агромністая розьніца: калі ў ЗША інфармацыя распаўсюджваецца свабодна, дык Кітай трымае першае месца сярод сусьветных інтэрнэт-цэнзараў.

Апошнім часам афіцыйны Пэкін не дае рады цэнтралізаванай цэнзуры — надта вялікі аб'ём працы. Таму гэтую задачу ён пакрысе перакладае на плечы прыватных фірмаў. Хочаш працаваць на прыбытковым інтэрнэт-рынку — супрацоўнічай з уладай. Інтэрнэт-кавярні зьбіраюць зьвесткі пра сваіх карыстальнікаў, інтэрнэт-парталы не зьмяшчаць на сваіх старонках забароненыя тэмы. Кітай зрабіўся экспартэрам сыстэмаў для інтэрнэт-цэнзуры: яго распрацоўкі выкарыстоўваюцца ў Віетнаме ды Іране, хадзілі чуткі пра пастаўкі ў Беларусь.

Галоўны фронт змаганьня — інтэрнэт-дзёньнікі. Калі на Захадзе так званыя «блогі» — гэта ўсяго толькі дапаўненьне да яскравай палітры звычайных мэдыяў, дык у Кітаі яны — цалкам самастойны, новы сродак масавай інфармацыі, у параўнаньні зь якім сухі афіцыёз выглядае бляклa. Летась у Кітаі было зарэгістравана больш за 30 мільёнаў аўтараў інтэрнэт-дзёньнікаў. Сярод гэтай безьлічы інтэрнэт-дописаў трапляюцца і дыскусіі на «вострыя» тэмы. Летась афіцыйны Пэкін нават забараніў абмяркоўваць у дзёньніках палітыку, эканоміку і замежныя сувязі, аднак гэтае патрабаваньне было такім абсурдным, што яго папросту праігнаравалі.

Але не заўсёды інтэрнэт-творчасьць праходзіць без наступстваў. На сёньня ў кітайскіх турмах знаходзяцца 49 «кібэрдысыдэнтаў» і 32 журналісты, якія карысталіся Сецівам для крытыкі ўраду. Ліквідаваць дзёньнікі на запыт уладаў — нармальная практыка сярод кітайскіх інтэрнэт-фірмаў. Цяпер кітайскі рэжым узяўся і за амэрыканскія карпарацыі. Калі яны жадаюць выйсьці на шматабяцальны кітайскі інтэрнэт-рынак, ім давядзецца заняцца цэнзурай ды выведкай на карысьць Камуністычнай партыі Кітаю.

## Чарвівы бізнэс

Сыстэма, якую Кітай выкарыстоўвае для адсочваньня няблаганадзейнага інтэрнэт-трафіку, мае назву «земляны чарвяк». У аснове яе, як мяркуюць праваабаронцы з арганізацыі «Рэпартэры бязь межаў», пакладзенае абсталяваньне, пастаўленае ў Кітай амэрыканскай кампаніяй *Cisco*. Менавіта яна ад 2000 году выйграе штогадовыя тэндэры кітайскага тэлекаму. *Cisco* запэўнівае, што пастаўляе ў Кітай звычайнае абсталяваньне, і тое, як яно выкарыстоўваецца, ня справа кампаніі. Разам з тым, існуюць падазрэньні, што кампанія інструктуе кітайскіх спэцыялістаў, у задачы якіх уваходзіць цэнзура Інтэрнэту.

Іншая карпарацыя, інфармацыйны гігант *Yahoo*, якая стварыла інтэрнэт-партал з масай разнастайных паслугаў, зьявілася на кітайскім рынку ў 1999 годзе. Як высьвілася, *Yahoo* ўвесь час патаемна фільтравала вынікі запытаў інфармацыі, якія робяцца кітайскімі карыстальнікамі праз пашуковы мэханізм кампаніі. А летась праваабаронцы выявілі, што прадстаўніцтва кампаніі ў Ганконгу перадало кітайскім спэцслужбам зьвесткі пра аднаго з карыстальнікаў паштовага сэрвісу *Yahoo*. Ім быў Шы Тао, журналіст кітайскай дзелавой газэты «Дангдай Сянь Бао». Напярэдадні 15-й гадавіны крывавага разгону студэнцкай дэманстрацыі на плошчы Цяньаньмэнь ягоная рэдакцыя атрымала закрытую ўрадавую інструкцыю, у якой журналістам нагадвалася пра падвышаную рызыку «сацыяльнай дэстабілізацыі» ў краіне. Шы Тао разаслаў гэтую інструкцыю праз электронную пошту рэдактарам шэрагу замежных сайтаў. 24 лістапада 2004 году журналіста схапілі ў двары, абшукалі ягоны дом, сканфіскавалі кампутар ды асудзілі за 10 год турмы за перадачу за мяжу «дзяржаўных сакрэтаў». Кіраўніцтва *Yahoo* заявіла, што віны за сабой ня бачыць. «Мы хоць і базуемся ў ЗША, аднак зьяўляемся міжнароднай карпарацыяй, таму мусім падпарадкоўвацца мясцовым за-

**Працяг на старонцы 38.**



**Дзяржаўны кантроль у кітайскіх інтэрнэт-кавярнях.**

# Цьвік у жэле

Працяг са старонкі 37.



конам», — заявіў сузаснавальнік інтэрнэт-сэрвісу Джэры Янг.

Запляміўся і знакаміты *Microsoft*. Летась увесну ён адчыніў свой першы кітайскі інтэрнэт-партал *MSN China*. Карыстальнікі выявілі, што на сайце нельга стварыць інтэрнэт-дзёньнік з назвай, якая ўтрымлівае словы «свабода», «дэмакратыя», «незалежнасьць Тайваню», «правы чалавека» ды «Далай Лама». Праваабаронцы таксама даведаліся, што *Microsoft* зьнішчае са свайго парталу на патрабаваньне кітайскага ўраду «няўгодныя» інтэрнэт-дзёньнікі. Адгаворка *Microsoft* стандартная: партал разьмешчаны ў Кітаі, таму падпарадкоўваецца мясцовым законам.

Шалёна папулярны пашуковік *Google*, які дапамагае знаходзіць і зьмяшчаць інфармацыю ў Інтэрнэце, абраў прынцыпова іншую тактыку. Як і іншыя заходнія кампаніі, якія пажадалі выйсьці на кітайскі інтэрнэт-рынак, *Google* натыкнуўся на патрэбу супрацоўніцтва з кітайскімі ўладамі. Але, у адрозьненьне ад *Microsoft* ды *Yahoo*, кампанія вырашыла рабіць гэта адкрыта. *Google* афіцыйна заявіў, што будзе фільтраваць запыты кітайскіх карыстальнікаў свайго сэрвісу ў адпаведнасьці з законамі Кітаю. Акрамя гэтага, карыстальнік, які атрымае адмову ў інфармацыі, будзе пра гэта адразу ж паінфармаваны адмысловым паведамленьнем на сайце. А вось разьмяшчаць у Кітаі свае сэрвісы электроннай пошты ды інтэрнэт-дзёньнікаў *Google* адмовіўся, каб ня быць абавязаным перадаваць кітайскім спэцслужбам асабістыя зьвесткі пра карыстальнікаў.

## Палітыкі супраць бізнэсоўцаў

Відаць, сваёй адкрытасьцю *Google* разьлічваў захаваць прыгожы твар, аднак атрымаў адваротны эфэкт. Выбухнуў сапраўдны скандал, у выніку якога прадстаўнікоў усіх чатырох карпарацыяў выклікалі ў амэрыканскі Кангрэс па тлумачэньні. Слуханьні прайшлі 15 лютага ў Камітэце па міжнародных адносінах і дужа нагадвалі публічную порку, прычым лупцавалі інтэрнэт-камэрсантаў як дэмакраты, так і рэспубліканцы. «Вашыя брыдкія дзеяньні ў Кітаі — гэта ганьба! — кінуў у твар зьніякавелым бізнэсоўцам Том Лантас, галоўны кангрэсмэн-дэмакрат у Камітэце. — Я проста не разумею, як вашае карпаратыўнае кіраўніцтва можа спакойна спаць уначы». Кангрэсмэн-рэспубліканец Крыстафэр Сьміт абвінаваціў кампаніі ў «падтрымцы спробаў кітайскага кіраўніцтва рэгуляваць Інтэрнэт паліцыйнымі мэтадамі».

Праблемы з амэрыканскім парлямэнтам могуць моцна нашкодзіць карпарацыям. Кангрэс можа перагледзець падатковыя льготы для кампаніяў, якія займаюцца інтэрнэт-распрацоўкамі, а таксама адмовіцца ад плянаў падвысіць колькасьць выдачы візаў для ўезду ў ЗША замежных спэцыялістаў у галіне высокіх тэхналёгіяў — таннай працоўнай сілы для волатаў інтэрнэт-індустрыі. Акрамя гэтага, ужо абмяркоўваецца прапанова забараніць амэрыканскім інфармацыйным карпара-

# Вецер Мэханічны: Супрацьстаяць блякадзе Інтэрнэту можна праз RSS

Знакаміты беларускі вэб-майстар Вецер Мэханічны мяркуе, што цэнзура ў Інтэрнэце можа быць эфэктыўнай толькі часткова.

**«Наша Ніва»: Існуе думка, што любыя спробы цэнзураваць Інтэрнэт ня маюць сэнсу — карыстальнікі раней ці пазьней знаходзяць магчымасьць абыходзіць перашкоды. Ці Вы згодныя з гэтай думкай? Ці можа цэнзура Інтэрнэту быць эфэктыўнай?**

**Вецер Мэханічны:** У тым і рэч — «раней ці пазьней». Першая перавага Інтэрэнту — магчымасьць звышапэратыўнага (!) інфармаваньня й інтэрактыўнага аддаленага кіраваньня інфармацыяй. Прыкладам, падзеі на памаранчавым кіеўскім Майдане на 90% каардынаваліся праз Інтэрнэт. Таму мяркую, што часьцяком праз страту значнай долі апэратыўнасьці цэнзура можа быць эфэктыўная. Зь іншага боку, праявы «адваротнай рэакцыі» супраць уціску й цэнзуры здольныя прыцягнуць больш увагі да «забароненых сайтаў».

**«НН»: Ці чакаецца ў сакавіку чарговая «кібэрвайна» накшталт той, якая адбылася на выбарах у верасьні 2001 году?**

**ВМ:** Толькі прагноз. Дакладнай інфармацыі ня маю. А прагноз — чакаецца. Як супрацьстаяць ёй? Праз RSS (сыстэма трансьляцыі/атрыманьня інфармацыі зь іншых сайтаў). Таксама празь месцы хуткага інтэрактыўнага абмену інфармацыяй (форумы, блёгі). Па вялікім рахунку, заблякаваць увесь бай/Інтэрнэт немагчыма з-за мноства праектаў у ім і простых магчымасьцяў утварэньня новых. Блякаваць можна толькі нейкія асноўныя сайты. Як бы тое ні было, Інтэрнэт ёсьць зараз і застанецца практычна адзіным «непадцэнзурным» інфармацыйным каналам.

**Што такое RSS?**
http://be.wikipedia.org/wiki/RSS

**Як карыстацца RSS?**
http://www.rssclub.ru

**Інтэрнэт-дзёньнікі беларусаў:**
http://bielarusy.livejournal.com

цыям зьмяшчаць свае сэрвэры ў Кітаі.

«Вядзеньне бізнэсу ў Кітаі вымагае самацэнзуры, — прызнаўся прадстаўнік *Google* Эліят Шрэйдж. — Гэта супярэчыць асноўным каштоўнасьцям і абавязкам *Google*. Аднак, на ягоную думку, нават ва ўмовах самацэнзуры кампанія зможа паспрыяць пашырэньню інфармацыі ў Кітаі. Кіраўніцтва *Google* заклікала ўрад ЗША не перакладаць увесь цяжар на плечы прыватнага бізнэсу, а самому больш актыўна дамагацца ад Кітаю ды іншых «праблемных» краінаў пашырэньня свабоднага слова.

Згода *Google* на самацэнзуру ў Кітаі можа мець для кампаніі і для інтэрнэт-індустрыі ўвогуле нечаканыя наступствы. Апошнім часам пашуковіку даводзілася адбівацца ад націску з боку адміністрацыі Джорджа Буша. Прэзыдэнт ЗША патрабуе, каб кампанія перадавала амэрыканскім уладам зьвесткі пра запыты, якія робяць карыстальнікі пашуковага сэрвісу. Такім чынам амэрыканскія ўлады зьбіраюцца шукаць тэрарыстаў ды дзялкоў дзіцячай парнаграфіі. *Google* адмаўляецца, бо лічыць гэтую інфармацыю сваёй камэрцыйнай таямніцай, а таксама асабістай таямніцай сваіх кліентаў. Аднак, выпрашыўшы супрацоўнічаць з кітайскімі ўладамі, *Google* будзе нашмат цяжэй патлумачыць сваю адмову «дапамагаць» уладам ЗША.

## Свабода заразная

*Google* — кампанія, якая любіць казаць пра тое, што бачыць перад сабой высокую місію — «арганізаваць сусьветную інфармацыю і зрабіць яе паўсюдна даступнай і карыснай». Паводле кіраўніцтва *Google*, сама прысутнасьць яго ў Кітаі, няхай нават няпоўнавартасная, аблегчыць жыхарам Паднябеснай доступ для інфармацыі. Тут ёсьць рацыя. Карыстальнік Інтэрнэту блукае ў Сеціве, нібы ў лябірынце. Лепей рабіць гэта з мапай, дзе ёсьць белыя плямы, чым зусім безь яе — паблукаўшы, так ці іначай усё роўна дойдзеш да мэты.

Акрамя гэтага, цэнзураваць Інтэрнэт — справа няўдзячная. Сеціва мае такі вялізны аб'ём і складаную структуру, што тэхніка з гэтым спраўляецца з горам напалам. Да таго ж, ёй даводзіцца мець справу з гнуткім чалавечым розумам. Ніякі кампутар ня здолее распазнаць эзопаву мову ці алегорыі. Менавіта таму стваральнік *Microsoft* Біл Гейтс лічыць: «Вы можаце прымусіць інтэрнэт-сайт прыбраць пэўныя зьвесткі, аднак, калі насельніцтва жадае нешта даведацца, яно ўсё роўна атрымае гэтую інфармацыю».

Зь іншага боку, татальны кантроль над Інтэрнэтам нікому і не патрэбны. Дастаткова кропкавых удараў, каб прымусіць змоўкнуць найбольш актыўныя галасы ды запужаць усіх астатніх. Паводле падлікаў *Google*, недзе 2% інфармацыі, якую звычайна шукаюць кітайскія карыстальнікі, будуць для іх недаступныя. Здаецца, няшмат. Аднак у гэтыя 2% увахodзяць усе самыя балючыя праблемы кітайскага грамадзтва, а 98% складаецца большай часткай з інфармацыйнага друзу. Дый ці можна назваць сапраўды свабодным чалавека, які часткова, няхай нават на 2%, зрабіўся несвабодным?

Скандал дазваляе з дакладнасьцю да даляра падлічыць кошт свабоднага слова. Для гэтага дастаткова ўзяць гадавы прыбытак кампаніі ад працы на кітайскім рынку ды падзяліць яго на колькасьць адмоваў у запытах на інфармацыю за год. Атрымаем суму прыбытку, якую атрымлівае *Google* у абмен на закрыцьцё доступу для інфармацыі для аднаго карыстальніка Сеціва. «Гэтыя кампаніі кажуць пра тое, што яны могуць зьмяніць Кітай, — кажа Том Лантас, — аднак Кітай ужо зьмяніў іх саміх». Кантроль над інфармацыяй з дапамогай тых, хто гэтую інфармацыю распаўсюджвае, зьмяняе сутнасьць Інтэрнэту. З глябальнага Сеціва ён ператвараецца ў набор лякальных сетак. Ужо цяпер тое, што могуць рабіць у Інтэрнэце амэрыканцы, немагчыма для жыхароў Кітаю.

Калі амэрыканскія гіганты ня здолеюць спыніць самацэнзуру ў Кітаі, іншыя краіны пачнуць пераймаць тактыку афіцыйнага Пэкіна. Цікава, калі *Google* вырашыць выйсьці на беларускі рынак, ён таксама будзе фільтраваць словы «дэмакратыя», «выбары» ды «Пагоня»?

# Сны летнім днём

Рэдкаму зь беларускіх паэтаў ня сьніўся Хадановіч. Піша **Аляксандар Фядута.**

Чаму яны ў гэтым прызнаюцца — не даўмеюся! Ня ведаю, як у іх з сэксуальнай, але з паэтычнай арыентацыяй усё як мае быць. І менавіта таму — хай бы яны лепей маўчалі.

Андрэя Хадановіча можна ўважаць за ўлюбёнца Фартуны. Яна надзяліла яго несумнеўным паэтычным геніем, дазволіўшы таксама нарадзіцца ў тую пару, калі за гэта ўжо ня паляць на вогнішчах і не расстрэльваюць у Курапатах. Я бачыў закаханыя вочы дзяўчат, што прыйшлі на прэзэнтацыю «Лістоў з-пад коўдры» і ціха вохкалі, нібыта на месцы Хадановіча быў — вылез з-пад гэткай самай коўдры — сам бог Апалён. Было зразумела: гэты яшчэ зусім малады чалавек здолеў стварыць уласную чытацкую аўдыторыю, зачараваць яе словам — каб потым, як Майсэй, вадзіць за сабой астатнія сорак год прадуктыўнага паэтычнага жыцьця.

Не пераблытай іх з правіламі артаграфіі —
знакі прыпынку праходзяць па іншай парафіі.
Прыклад: калі твой пісьменьніцкі посьпех,
станоўчыя водгукі ў прэсе,
удзячныя выкрыкі «брава! біс!»
прадвызначаюць выключна твой правапіс,
то бок майстэрства да месца ўжыць тую
ці іншую літару,
то — што дазволена тарэадору,
падчас не дазволяць Юпітэру! —
першачарговае ў справах паэзіі, то бок
літаратурны заробак,
прадвызначае выключна ўжываньне
працяжнікаў, косак і кропак.

Гэта інтанацыі будучага нобэлеўскага ляўрэата. Хто не дае веры — вазьмеце «Восеньскі крык шуляка» беднага, як сказаў бы зьедлівы Шалкевіч, Ёселя Бродзкага і пераканайцеся. Пры гэтым уласна ў беларускай літаратуры падобнага паэтычнага рытму, разьняволенага, я ня памятаю. Мажліва, памятае Ганна Кісьліцына: у тую пару, калі яна вывучала айчыннае пісьменства, мне давялося вывучаць нейкага там Пінтэра.

Нехта, здаецца, «таварыш Сапега», заявіў, што па-беларуску нічога вялікага стварыць немагчыма. Хадановіч — жывое абвяржэньне гэтай надзвычай хамскай заявы. Пераклаўшы ў беларускую «Кветкі зла» Бадлера, ён стаў Сёмухам новага чытацкага пакаленьня. Задачай Сёмухі было перастварэньне па-беларуску вялікіх прызнаных клясыкаў, ад аўтараў Сьвятога Пісьма да па-алімпійску спакойнага Гётэ. Хадановічу выпала перакладаць непрызнаных клясыкаў, адрынутых сучасьнікамі, а таму і не ціхамірных — раззлаваных, у канфлікце з грамадзтвам. Гэта — паэтычная праграма новага няўрымсьлівага пакаленьня паэтычных хуліганаў — наш уласны sturm und drang.

Хадановіч — хуліган. Ён і не хавае гэтага. Ён піша грандыёзныя тэксты, сапраўдны сэнс каторых ты зразумець ня можаш, калі не чытаў другія грандыёзныя тэксты. Да таго ж піша іх на беларускай мове — пышнай, выкшталцонай, завостранай, як француская мова эпохі Ларошфуко, — а ў кожным вершы — цытаты з паэтаў расейскіх, францускіх, польскіх і італьянскіх, і паспрабуй, расшыфруй, спасьцігні гэты код, калі ты не авалодаў усімі тымі ведамі, якія выпрацавала чалаве... (блін, цытую клясыкаў! дажыўся! — Хадановіч заразіў).

Кукалка, каўшанка, хрызаліда,
лялечны зародыш вышыні!
Досыць гідкіх фарбаў краявіду,
іншага няхай грызе агіда!
Супакойся, мілы, адпачні!
Сьпі, дзіцятка, птушкі ўжо паснулі,
зоры ў неба па ваду пайшлі.
Кукавадла вусьцішнай зязюлі,
люлі-люлі, прыляцелі кулі...
Стала ціха на усёй зямлі.
Засынай, загорнуты ў анучы.
Пасталееш хутка ў барацьбе.
Сьпі, выратавальнік наш прыйдучы:
у абладзе фюрэра і дучэ
спадзяёмся толькі на цябе!

І рэч зусім ня ў тым, што філёляг пазнае простыя лексычныя запазычаньні зь пяці славянскіх моваў. Але гэткую паэтычную крыжаванку трэба разгадваць, у зацемкі дадаваць цытаты з Мандэльштама і ўсіх-усіх-усіх... Ці памятаеце вы, як льюісакэралаўская Алеся зьвяртаецца да Шапавала з просьбаю растлумачыць верш пра Брандашмыга? Дык жа трэба яшчэ і зразумець, што гэты верш — без камэнтара, без уласнага хадановіцкага Шапавала — незразумела! Літасьцівы Пацюпа свае вершы камэнтуе сам, даючы зацемы. А Хадановіч жорсткі і цынічны: не зразумеў чытач — ну і ў Жодзіна яго! Ці ў які другі населены пункт з той соткі, пералічанай у «Землях».

Часам хочацца стаць-такі яго Шапавалам. Хочацца падрыхтаваць і выпусьціць у сьвет «Поўны збор твораў» Андрэя Хадановіча, з акадэмічнай біяграфіяй і паўнавартаснымі зацемамі.

Уяўляеце сабе:

Мы валім дрэвы (1), чэшам камяні (2),
капаем катлаваны (3) і каналы (4),
чакаем на спатканьні, лічым дні (5)
й абагульняем сьвет наш дасканалы (6) —

і зацемы:

1. «Лесапавал» — назва папулярнага ў Савецкім Саюзе (дзяржава, якую развалілі тры славянскія правадыры на загад сусьветнага сіянізму) гурту на чале з паэтам Міхаілам Танічам (гады жыцьця). Паэт геніяльна прадбачвае ўдзел у лесапавале беларускага публіцыста Паўла Севярынца (гады жыцьця) (гады лесапавалу).
2. «Муляр» — верш расейскага сымбаліста Валер'я Брусава (гады жыцьця), які чамусь уважаюць за рэвалюцыйны. Паэт таксама геніяльна прадбачвае будоўлю новага гмаху Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (гады будоўлі).
3. «Катлаван» — аповесьць расейскага савецкага (?) пісьменьніка Андрэя Платонава (гады жыцьця), у якой вядзецца пра беспасьпяховасьць спробаў трансфармацыі грамадзкіх адносінаў.
4. «Беламорканал» — папяросы, названыя ў гонар кніжкі, напісанай 50 выбітнымі савецкімі пісьменьнікамі



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

пасьля падарожжа на той самы канал (пералік пісьменьнікаў і гады жыцьця). Зрэшты, паэт мог геніяльна прадбачыць і кіроўную ролю БРСМ (гады існаваньня) у рэканструкцыі беларускай часткі Аўгустоўскага каналу (гады рэканструкцыі).

Ну й гэтак далей.

А пракамэнтавалі ж мы пры гэтым усяго толькі два радкі з чатырох!

А што будзе, як пачнеш камэнтаваць усю паэтычную традыцыю, вяршыняй каторай ёсьць ягоны, Хадановічаў, *exegi monumentum*:

Я помнік ладжу ў кшталце манускрыпту.
Ня зьнішчыць сьцежкі да яго дзірван!
Я фін паміж пяскоў зямлі Эгіпту,
паміж калмыкаў — горды ўнук славян!

Тут на кожны радок прыпадзе па пяць-шэсьць абзацаў камэнтароў! Якая прастора для прышлых філёлягаў!

І пры гэтым Хадановіча чытаюць тыя, каго ў нашых умовах можна ўважаць за чытацкую масу! Падкрэсьлю — не за эліту! Бо патэнцыйны кандыдат на Нобэля (паўтаруся: баюся, ён і стане першым беларусам, ушанаваным Нобэлеўскай прэміяй за літаратуру) абсалютна ўпэўнена гуляе ў паэтычную папсу, нібыта патураючы густам таго чытача, каторага сам ён і кланаваў, дай ім Бог абодвум здароўя!

І гэта — не зьнявага! Бо гэта — сьвядомы камплімэнт!

дзеўчына пела ў шыкоўным бары
танчыла і абдымала шост
дзеўчына проста шукала пары
а ў мужыкоў пачынаўся пост
дзеўчына скінула белы вэлюм
скінула белае паліто
і засталася ў станіку белым
а з мужыкоў не глядзеў ніхто

дзеўкі сьпяваюць ня толькі ў джазе
гэтая робіць што і заўжды
а ў мужыкоў проста зрух па фазе
і разьбягаюцца хто куды
толькі расшпіліць бялюткі станік
большая частка стуль уцячэ
толькі адзін паўсьляпы «батанік»
галасна крыкне: «хлопча яшчэ!»

Ён жа бо менавіта гэты верш Блока ўзяў, скрыўдзіў яго беласьць, бо ён і так — самы разматлашаны, згвалтаваны літаратуразнаўцамі, ператвораны ў паэтычны штамп. Бо ніхто з чытачоў самога Блока ўжо ў ім, у гэтым вершы, паэзіі — Паэзіі! — ня бачыць, ня ловіць яе павеву, не адчувае!

Ён і цытуе тое, што прынята называць «масавай літаратурай», ад Эжэна Сю да Джаан Роўлінг, апэлюючы да «супольных месцаў» нашай чытацкай памяці: не зразумеюць, але адчуюць роднае ў гэтых доўгіх песьнях літаратурнага возьніка. Так сама як сьніцца нам — у самых фантастычных спалучэньнях! — толькі тое, што мы на яве, шматкамі, часткамі, але бачылі, так і ў падсьвядомасьці, чытаючы Хадановіча, выплываюць вобразы, зганеныя настаўнікамі літаратуры, выкладнікамі філфакаў, бібліятэчнымі выставамі пад лёзунгамі кшталту «Салдат, герой, навуковец».

ціхі анёл праляцеў
над гняздом зязюлі
яшчэ адзінаццаць тысяч
тваіх маладых суайчыньнікаў
за цэлы год
не паглядзяць ніводнага фільму
Мілаша Формана

Накшталт анёлаў, што ня лётаюць над гнёздамі зязюляў — проста анёлы, як ведама, ня лётаюць, — Андрэй Хадановіч ня ёсьць сучасным беларускім паэтам, бо проста там, у тым засвоеным ім паэтычным сусьвеце, няма ні сучаснасьці, ні, відаць, Беларусі як самастойнага літаратурнага матэрыка, як бы ні спрабавалі гэта аспрэчыць усе тыя, хто летнімі і зімовымі начыма ня можа заснуць, каб ня ўбачыць у сьне Хадановіча. Там ёсьць толькі Паэзія! І Купала, і Мандэльштам, Байран і Францішка Уршуля Радзівіл ідуць поруч, а перакладнік ім, дарэчы, папросту непатрэбны.

От і добра! Хоць адзін беларус гэта ўцяміў!

І гэта ня можа ня радаваць.

# Інтымная гігіена

## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

БО

Бо сакавік разносіць па лёгкіх сваю праказу,
бо спаць не даюць садысты — марцовыя ка́ты,
бо адзінаццацікляснiцы думаюць зусім не пра члены сказу
і ўсё пазьней штовечар прыходзяць дахаты;

бо пагаліцца зранку — зьбіваецца подых,
і лязо спатыкаецца на падбародзьдзі,
покуль усе капяжы крычаць аб правох і свабодах
кругазвароту вясны ў прыродзе;

бо, прадчуваючы працу, касец газонаў ад хваляваньня
блытае словы, прызнаючыся ў каханьні *касілагазонцы*.
Адаграваецца сонца, па горла ў вясновай ваньне —
і лю́бая выйдзе бяз шаліка, па горла ў вясновым сонцы.

ET SI TU N'EXISTAIS PAS…

калі б цябе не было ў вялікім сусьветным раскладзе
я выдумаў бы што ты далёкі касьмічны спалах
сьвятлом бы табе дасылаў эсэмэскі ўва ўмоўным ладзе
і дарогу б чытаў па тваіх зорных ініцыялах

я наносіў бы тваё імя на зямныя й нябесныя мапы
прамаўляў бы яго на ўдыху захлынаючыся ад шаленства
і ня верыў што нават малпа можа паходзіць ад малпы
бо ўсё выглядала б створаным на божае падабенства

я складаў пра цябе й гарлаў бы невядомыя іншым песьні
і суседзі прачнуўшыся ўночы ня зналі б каго я клічу
я глыбока сярод зімы пасылаў бы іх… на прадвесьне
і ўпершыню ў жыцьці не баяўся б таннага кічу

калі б цябе не было выдумляў бы цябе як твор я
і павольна канаў ад шчасьця ня просячы эўтаназіі
мой аловак бы лётаў па-над зямлёй як указка прагнозу надвор'я
але ты ў мяне ёсьць і ня ведаю што рабіць са сваёй фантазіяй

***

лёс цалуе цябе ў шчаку ты яму падстаўляеш вусны
бо жывеш да нашае эры і ня лічыш нашых гадоў
твая мэтрыка даўні эпас дагамэраўскі дзёньнік вусны
белай пенаю раскіданы па сузор'і сямі гарадоў

ты ня бачыш павольных сноў і ня танчыш павольных танцаў
бо твая рытмічная памяць захавала выбух і ўсхліп
не хапае паветра ў лёгкіх ды ня хочаш лёгкіх дыстанцыяў
бо ня маеш часу і месца на паўторны відэакліп

алімпійскія гульні жарсьці на якіх за цябе заўзею
а вакол равуць стадыёны і прыемна што мы адны
засынаем да новай эры і прыходзяць дзіўныя сны
як жыцьцё што бачым з акна авангардавага музэю

ІНТЫМНАЯ ГІГІЕНА

Беручы гарачую ванну
з новым акрылавым пакрыцьцём,
бярэш заадно
і нешта да чытаньня.

Сёньня ты ўважліва чытаеш
надпіс на плястыкавым тубіку —
крэм-душ для інтымнай гігіены,
з намаляванай Афрадытай,
маса нэта 210 г.

«Нанясеце на мачалку
альбо ўсьпеньце паміж далонямі
і нанясеце на скуру».

Можа, з гэтай пены, — думаеш ты, —
нехта й народзіцца.
Стоп, а крэм-душ — гэта што?
І чаму тады наносіць на цела?

Маўчыць намаляваная Афрадыта.
Новае акрылавае пакрыцьцё
таксама нічога не тлумачыць,
быццам бы дае зразумець,
што няма чаго выпендрывацца,
што твая задача — проста зрабіць выбар:
на мачалку ці паміж далонямі.

Але, пагрузіўшыся ў ванну
па самую эўрыку,
ты разумееш сваю бездапаможнасьць,
адчайна лыпаеш павекамі,
а літары ўсё адно размываюцца,
покуль ты расьціраеш па твары
салёную субстанцыю
для інтымнай гігіены
душ.

# Анатоль Івашчанка




**Івашчанка Анатоль. Вершnick.** — Менск: «Беллітфонд», 2006

памежны верш сьцякае на падлогу
з-пад стрыжня вылятае п'яны стрыж
крывіцкі меч выпальвае дарогу
і вершнік без імя
зь ёй утварае крыж

Зборнік паэзіі Анатоля Івашчанкі, выдадзены ў бібліятэчцы часопісу «Дзеяслоў».

# Новае «Калосьсе»




Калосьсе. 2006. №1 (10)

Гэты нумар літаратурнага альманаху прысьвечаны тым, каго ўжо няма з намі. Алесь Асташонак, Анатоль Сыс, Іван Рубін, Мікола Купрэеў, Андрэй Пяткевіч, Васіль Сахарчук, Дзяніс Хвастоўскі ў згадках Алеся Аркуша, Франца Сіўка, Валянціны Аксак, Юрася Пацюпы, Леаніда Галубовіча, Уладзімера Сьцяпана і іншых.

## КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Архіў уніяцкіх мітрапалітаў. Дакумэнты да гісторыі царквы ў Беларусі XVI—XX стст. у фондах гістарычных архіваў Літвы і Расеі:** Даведнік / Складальнік С.І.Паўловіч. БНДІДАС, Грэка-каталіцкая парафія Сьвятапакутніка Язафата. — Менск—Полацак, 2005. — 166 с.

Кніга — складальная праекту па стварэньні каталёгу пра наяўнасьць і месца захоўваньня дакумэнтаў па гісторыі БГКЦ. Раней выйшлі з друку даведнікі па ўкраінскіх (львоўскім і кіеўскім) ды санкт-пецярбурскім архівах. У дадатку да выданьня зьмешчаны: сьпіс каталіцкіх кляштараў, зачыненых пасьля паўстаньня 1830—1831 гг., складзены супрацоўнікамі Расейскага ваенна-гістарычнага архіву, здымкі сучаснага стану пабудоваў, што належалі Уніяцкай Царкве, сярод якіх цэрквы і манастыр у Себескім раёне Пскоўскай вобласьці Расеі.

**Какареко В.И., Шталенков И.Н. Монеты Великого княжества Литовского 1492—1707. Каталог / Белорусское нумизматическое общество.** — Минск: Экоперспектива, 2005. — 79 с., ил.

Для акрэсьленага пэрыяду (1492—1707 гг.) кніга ёсьць выданьнем высокага ўзроўню. Хоць для зводнага каталёгу манэт ВКЛ бракуе першых спробаў вялікіх князёў літоўскіх у XIV—XV ст. біць уласную манэту: дынары ці пенязі. Аўтары ж каталёгу пачынаюць ад грашовай рэформы вялікага князя Аляксандра, пры якім масавае і рэгулярнае біцьцё манэт вывела грашовую сыстэму ВКЛ на эўрапейскі ўзровень. Апошняя дата каталёгу — 1707 г. — зьвязаная зь дзейнасьцю падскарбія Людвіка Пацея, які ў бязладзьдзі Паўночнай вайны здолеў арганізаваць у 1706—1707 г. у Горадні Манэтны двор, што выпускаў грошы менавіта Вялікага Княства. Яны сталі апошнімі манэтамі ўласна ВКЛ, а Людвік Пацей варты нашага шанаваньня як добры гаспадарнік і фінансіст.

У каталёзе падаюцца аўкцыённыя кошты манэт з папраўкаю на нумізматычны рынак Беларусі. Самыя дарагія ў каталёзе — залатыя (980-й пробы) манэты Жыгімонта Аўгуста і Жыгімонта Вазы наміналам у 10 флёрынаў і 10 дукатаў. Іхні аўкцыённы кошт ацэньваецца ў 20 000 даляраў. Але пры жаданьні вы можаце набыць іншую манэту з «Пагоняй» і за 3—5 даляраў — нават срэбную, хоць і 170-й пробы. Кажучы пра рэкордныя аўкцыённыя кошты, аўтары адзначаюць: «Але ж заўжды варта памятаць, што канчатковы кошт манэты вызначаецца калекцыянэрам, які жадае яе набыць».

Асобная сфэра інтарэсаў аўтараў — вызначэньне тыпаў «Пагоні» на манэтах ВКЛ. Нумізматы падаюць 10 асноўных прыметаў апісаньня герба (разьмяшчэньне ног у каня, форма тарчы, пазыцыя кончыка хваста ў каня, збруя на крыжы каня...). «Нашая цікавасьць да Пагоні выкліканая імкненьнем падштурхнуць нумізматаў-дасьледчыкаў і калекцыянэраў да больш дэталёвага вывучэньня стылістыкі красьлюнку на манэтах ВКЛ, да стварэньня і папаўненьня базы дадзеных».

Усё ж некаторыя важныя заўвагі да кніжкі трэба зрабіць. Некалькі разоў у тэксьце прысутнічае ўзгадка таго, што манэтная вытворчасьць ажыцьцяўлялася ў ВКЛ з пачатку XII ст. Але ж ВКЛ як каралеўства Міндоўга ўзьнікла ў сярэдзіне XIII ст. Беднаваценькай выглядае бібліяграфія.

Застаецца дадаць, што аўтары каталёгу ўзначальваюць Беларускае Нумізматычнае Таварыства (БНТ), якое паўстала ў Горадні ў 1995 г., а ад 2000 г. набыло агульнакраёвы статус. На расейскамоўным сайце Таварыства (www.bno.khoz.ru) маецца польскамоўны разьдзел, што натуральна тлумачыцца цікавасьцю калекцыянэраў з Польшчы да нумізматычнай спадчыны ВКЛ. Застаецца толькі пажадаць, каб БНТ засвойвала і беларускую мову, беручы, у тым ліку, удзел у тэрміналягічных напрацоўках.

**Синчук И.И. История одной фальшивой монеты.** — Минск: Минсктиппроект, 2006. — 40 с., ил.

Яшчэ адзін авантурны сюжэт з Заходняй Беларусі 1920—1930-х — а менавіта выраб фальшывых манэт наміналам у 2 злотыя. У той час як польскія грошы былі срэбныя, манэты падрабляліся з волава. Як высьвятліў аўтар, масава манэты пачалі закопвацца мясцовым насельніцтвам у зямлю, ствараючы скарбы, з пачаткам 1939 г. — у прадчуваньні вайны. Падобная манэта была знойдзеная ў 1970-я ў ваколіцах Кобрыня разам зь іншымі, ужо сапраўднымі манэтамі. З таго моманту і пачалася раскручвацца гісторыя пра палескіх фальшываманэтчыкаў. Пра тое, што фальшыўкі на Палесьсі былі масавымі, сьведчыць і фальклярызацыя тэмы. Самы папулярны сюжэт зводзіцца да выкарыстаньня нейкім селянінам прыстасаваньня, якое ўзмацняла сілу дзеяньня кожны раз, калі госьць адчыняў дзьверы хаты — ціск, маўляў, перадаваўся на аўтаматычную штампавачную машыну ў сутарэньнях, а стук дзьвярэй заглушаў грукат штампу пры ўдары ды звон манэты.

Чаго бракуе ў кніжцы? Гэтага гнанага наратыву. Аўтар так схаваўся за табліцы ды фізычныя характарыстыкі манэт, што губляецца апавядальная канва. Таму прыходзіцца падключаць уласную фантазію.

**Алег Дзярновіч**





У нядзелю будзіць тата:
«Прачынайся, кот мурзаты!»





Мы ідзём галасаваць,
Прэзыдэнта абіраць.



Ёсьць у сьпісе кандыдатаў
Добры дзядзька барадаты.



З татам бюлетэнь чытаем,
У квадрацік крыжык ставім.



У дзень сонечны, вясновы
Прэзыдэнт хай прыйдзе новы!

Капітан Танака ©

# Парады мітынгоўцам

даюць нямецкія антыфашысты.

Нэанацысты ўсё вышэй падымаюць галаву ў Нямеччыне. Як ні парадаксальна, падчас маршаў «брытагаловых» паліцыя сумленна іх ахоўвае — у дэмакратычнай краіне кожная група мае права выказаць сваю пазыцыю, калі трымае свае дзеяньні ў рамках закону. Абараняюць нэанацыстаў найперш ад леварадыкалаў, якія не даюць праходу калёне «скіноў», закідваюць іх яйкамі ды памідорамі ці ўвогуле спрабуюць «начысьціць ім пысы». Сродкі, якія прымяняе паліцыя супраць антыфашыстаў, якія «замінаюць дэмакратычнаму працэсу», нярэдка дужа нагадваюць паводзіны беларускага АМОНу, таму паход на такую акцыю — справа не для слабанэрвовых.

11 сакавіка філія антыфашысцкай сеткі «Гегенпарт» зладзіла ва ўсходненямецкім горадзе Дэсаў трэнінг для тых, хто зьбіраецца ўдзельнічаць у акцыях супраціву нэанацыстам. Акрамя парадаў праўнага характару, цікавых толькі для немцаў, трапляліся і ўнівэрсальныя. Банальныя, на першы погляд, яны могуць дапамагчы зрабіць удзел у дэманстрацыях больш бясьпечным ды асэнсаваным.

Дэманстрацыя — гэта заўжды канфрантацыя. Таму страх — не загана, а натуральная рэакцыя. **Не хавайце** яго, а паразмаўляйце пра яго зь сябрамі. Зразумець свой страх — першы крок да таго, каб яго пераадолець.

**Не ідзіце** на акцыю паасобку. Вазьміце з сабою сяброў, трымайцеся групай. Па-першае, гэта дапамагае пазбыцца страху ды адчуваць сябе больш упэўнена. Па-другое, калі вас схопяць, іншыя будуць пра гэта ведаць і паклапоцяцца пра ваш лёс.

**Прызначце** сябрам месца сустрэчы на той выпадак, калі вас разьдзеляць ці вы згубіцеся.

**Не бярыце** з сабой шмат грошай, але майце крыху драбязы ў кішэні. На ўсялякі выпадак прыдбайце тэлефонную картку. **Падзарадзіце мабільнік.** Праверце ягоную памяць ды выразшыце, якія нумары варта выдаліць на выпадак, калі тэлефон патрапіць у рукі паліцыі.

Тое, што вас не арыштуюць, яшчэ ня значыць, што вас ня могуць абшукаць проста на вуліцы, асабліва на падыходах да месца акцыі. Таму **добра падумайце**, што вы маеце ў кішэнях. Скажам, пэўныя рэчы, якія вы бераце з сабой на вечарынку, могуць згуляць з вамі дрэнны жарт.

**Ніякага алькаголю** ні да, ні ў часе акцыі. Ён затуманьвае розум, можа падштурхнуць вас да бязглуздых дзеяньняў, якія наклічуць бяду і на вас, і на людзей навокал. «Здымаць стрэс» будзеце пасьля, у коле сяброў.

**Не палянуйцеся,** даведайцеся з праваабарончых публікацыяў пра законы, якія рэгулююць парадак затрыманьня. Якія правы вы маеце?

Калі дэманстрацыя дазволеная, **даведайцеся дакладна,** у якім месцы. Гэта можа дапамагчы вам у выпадку затрыманьня і наступнага разьбіральніцтва.

**Падумайце пра сваю вопратку.** Наколькі лёгка зразумець, што вы — дэманстрант?

У натоўпе могуць быць **правакатары**. Найлепшы дэтэктар для іх выяўленьня — спакойная размова.

**Памятайце:** калі паліцыя нешта хоча зрабіць, ёй, хутчэй за ўсё, гэта ўдасца. У выпадку затрыманьня ня мае сэнсу моцна супраціўляцца.

Падчас высьвятленьня асобы не балбачыце лішняга. **Не сьпяшайцеся** ставіць свой подпіс на паперах, якія могуць вам прапанаваць.

**Падумайце,** што і каму вы хочаце давесьці сваім удзелам у дэманстрацыі. Не ідзіце на акцыю, калі гэта для вас усяго толькі нудны абавязак. Калі вы нешта робіце, гэта павінна быць вам цікава і весела. Адчуйце, што гэта — крута! А нудзіцца — доля палітыкаў.

**Занатаваў Алесь Кудрыцкі**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



## КАНЦЭРТЫ

**Neuro Dubel**
Электрычны канцэрт легендарнага беларускага гурту.
**21 сакавіка (аўторак)**.
Даведкі праз тэл. 671-58-65.

**Аляксандра і Канстанцін**
Акустычны канцэрт-прэзэнтацыя новага альбому дуэту.
**23 сакавіка (чацьвер)**. Beatles Cafe (вул.Ціміразева, 65).
Даведкі праз тэл.: 209-01-48.

**Гусьлі. Адраджэньне традыцыі**
У Моладзевым тэатры эстрады (вул.Маскоўская, 18а) **23 сакавіка** (чацьвер) а 19-й пройдзе канцэрт «Гусьлі. Адраджэньне традыцыі».
Музыка старажытных сьвятаў на лерах, гудках і на гусьлях беларускіх, латгальскіх, літоўскіх, расейскіх у выкананьні А.Кавалёвай (Віцебск), Алеся Чумакова («Стары Ольса»), гуртоў «Ветах», «Госьціца», «Кудмень», «Келіх кола», «Вайдэлот», «Гістрыен», «Дэсань».
Даведкі праз тэл. 222-82-96 (каса тэатру), 8-029-616-84-90 (Арына).

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**
**17** (пт) — «Парфён і Аляксандра».
**18** (ндз) — «С.В.».
**20** (пн) — «Ажаніцца — не журыцца».
*Ранішія спэктаклі*
**26** (ндз) — «Паўлінка».
*Малая сцэна*
**24** (пт) — «Балада пра каханьне».

**Тэатар беларускай драматургіі.**
**17** (пт) — «Ганна ў тропіках».
**18** (сб) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».
**18** (сб) — «Палёты з анёлам».

**Тэатар юнага гледача**
**17** (пт) — «Тарас на Парнасе».
**18** (сб) — «Шлях на Бэтлеем».
**18** (сб) — «Гісторыя каханьня Паласатага Ката і сэньярыты Ластаўкі».

## ВЫСТАВЫ

**Юры Палякоў**
Да 15 красавіка ў Гарадзкой мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) працуе выстава, прысьвечаная памяці скульптара Юр'я Палякова.

## ХАКЕЙ

13 і 14 сакавіка прайшлі першыя чвэрцьфінальныя матчы плэй-оф Адкрытага чэмпіянату Беларусі па хакеі. Наступныя матчы — пры канцы тыдня. Чвэрцьфінальныя і паўфінальныя сэрыі праводзяцца да трох перамогаў.
**17 сакавіка (пятніца). Трэція матчы**
«Нёман» (Горадня) — «Юнацтва» (Менск). Гарадзенскі лядовы палац. Лік у сэрыі 0:2.
«Гомель» — «Дынама» (Менск). Гомельскі лядовы палац. Лік у сэрыі 0:2.
«Хімвалакно» (Магілёў) — «Сокал» (Кіеў). Магілёўскі палац спорту. Лік у сэрыі 2:0.
«Рыга-2000» — «Керамін» (Менск). Пінькі. Лядовы палац «Сымэнз». Лік у сэрыі 1:1.
Пачатак а 18.30.
**18 сакавіка (субота). Чацьвертыя матчы (калі будзе патрэба)**
«Нёман»—«Юнацтва».
«Гомель»—«Дынама».
«Хімвалакно»—«Сокал».
«Рыга-2000»—«Керамін».
Пачатак а 17.00.
**20 сакавіка (панядзелак). Пятыя матчы (калі будзе патрэба)**
«Юнацтва»—«Нёман». Менск. Крыты каток у парку імя Горкага.
«Дынама»—«Гомель». Менск. Лядовы палац спорту. Былы пр-т Машэрава, 4.
«Сокал»—«Хімвалакно». Кіеў. Спарткомплекс «Авангард».
«Керамін»—«Рыга-2000». Лядовы палац на вул.Прытыцкага.
Пачатак а 18.30.

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 18 сакавіка

**БТ, 19.10**
«Плюшавы сындром».
Францыя, 2005, рэж. Вэнсан Дэ Бру.
Камэдыя.
Сквапны бізнэсовец Жак пакутуе ад нэўрозаў. Але нечакана знаходзяцца лекі. Талісманам становіцца сьціплы бухгальтар Андрэ, у прысутнасьці якога ў Жака зьнікаюць усе хваробы. Капіталіст мусіць цярпець побач з сабой неспакойнага пралетарыя бухгальтарскай працы і шукаць разгадку «плюшавага сындрому».
Дасьціпная й разумная камэдыя з іроніяй над псыхааналізам.

**СТВ, 23.25**
«Вясна, лета, восень, зіма... і зноў вясна».
Паўднёвая Карэя—Нямеччына, 2003, рэж. Кім Кі Дук.
Паэтычная прыпавесьць.
Вясной манах-мудрэц растлумачыць шасьцігадоваму хлопчыку абэцэду веры. Летам 16-гадовы юнак закахаецца і кіне настаўніка. Увосень 30-гадовы вучань вернецца, каб пакаяцца ў забойстве. І ўзімку манах будзе чакаць новай вясны...

**АНТ, 23.50**
«Законы прывабнасьці».
Вялікабрытанія—ЗША—Ірляндыя, 2003, рэж. Пітэр Хоўіт.
Рамантычная камэдыя.
Два адвакаты дапамагаюць кліентам у скасаваньні шлюбаў. Але нечаканае каханьне паміж гераіняю і героем робіць іх саміх ахвярамі «законаў прывабнасьці».
Для фанатаў Пірса Броснана і Джуліяны Мур.

**БТ, 22.35**
«11/9 па Фарэнгейту».
ЗША, 2004, рэж. Майкл Мур.
Дакумэнтальны фільм.
Выкрывальніцкая стужка Мура пра сувязі Бэн Ладэна й Буша. Самая слабая карціна Мура — і недасягальны ўзор для беларускіх прапагандыстаў.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

**Master Records**
**Брудныя ўчынкі**
Моладзевая камэдыя, ЗША, 2005, рэж. Дэйвід Кендал.
У ролях: Лэры Шабэрт, Том Амандэс.
Каб спадабацца дзяўчыне, школьнік вырашае зрабіць дзесяць забароненых «брудных учынкаў». Апошняя ахвяра такога выпрабаваньня зьнікла 15 гадоў таму...
**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# На радасьць камуністам

**Адданы садоўнік** (Constant Gardener). Кінафармат 4х4.
ЗША—Вялікая Брытанія, 2005, каляровы, 129 хв.
**Жанр:** палітыка-дэтэктыўны трымценьнік.
Пасьля трыюмфу забароненага ў Беларусі «Гораду Бога» бразыльца Фэрнанду Мэйрэлішу запрасілі ў Галівуд. У аснову сцэнара пакладзены сюжэт Джона Ле Карэ, вядомага шпіёнскімі гісторыямі. Але можна меркаваць, што лявак Мэйрэлішу зрабіў фільм па-свойму, аднавіўшы традыцыі палітычных фільмаў 1970-х.
Маладая пара брытанскіх дыпляматаў працуе ў Кеніі. Жанчыну знаходзяць мёртвай — побач зь целам тубыльца. Спадзеючыся злавіць забойцу і апраўдаць жонку, герой адпраўляецца ў Лёндан.
У фільме адзначаюць цікавую апэратарскую працу (некаторых раздражняе) і акторскую гульню, а Рэйчэл Вэйц за жаночую ролю атрымала «Залаты глёбус» і «Оскара».
Тэма карціны мусіць прыйсьціся даспадобы камуністам і антыглябалістам.

**AP**

## калі б...

**...жывёлы, якія ўдзельнічалі ў праграме дзяржцырку За Беларусь, рабілі гэта сьвядома.**




— Як я мог не прагаласаваць датэрмінова. Ён жа пагражаў адкусіць мне галаву ў вячэрнім аддзяленьні.

**...улады захацелі перастрахавацца ад абвінавачаньняў у электаральных фальсыфікацыях.**




**...беларусы пачалі нараджаць дзяцей дзеля атрыманьня кватэр.**




— Капец! Цяпер да канца жыцьця застануся з бацькамі ў аднапакаёўцы!

Малюнкі і тэксты Лёліка Ушкіна

## У НУМАРЫ

### Сьмерць пасьля сьмерці



Палітычна Мілошавіч памёр, калі Сэрбіі надакучыла баяцца і яна выйшла на вуліцы. Піша Віталь Тарас. **Старонка 28.**

### «Белжаба» не здаецца



Сайт бязьлітаснай палітычнай карыкатуры б’е рэкорды папулярнасьці. Піша Сяргей Будкін. **Старонка 17.**

### Беларусь — гэта экспэрымэнт

Колькасьць матэрыялаў пра Беларусь у замежным друку рэзка вырасла. Якасьць, збольшага, таксама. З Бэрліна піша Алесь Кудрыцкі. **Старонка 21.**

### Андрэй Хадановіч: Кругазварот вясны ў прыродзе



«Інтымная гігіена» і іншыя новыя вершы паэта. **Старонка 42.**

### Ёсьць у сьпісе кандыдатаў добры дзядзька барадаты



Жыхары Плястыляндыі ідуць на выбары. Газэтка дзеткам — **старонка 44.**

## ЖАРТЫ

Адзін Білінкевіч — гэта мільён Мілінкевічаў.

* * *

— Вы мяне відэльцам укалолі!

— Прабачце! Я думаў, калі локаць ляжыць у маёй талерцы...

* * *

20 сакавіка. У цягніку Менск—Магілёў едзе сумны Лукашэнка. «Як жа гэта вы так, Аляксандар Рыгоравіч, аддалі ўладу?!» — пытаюцца суседзі па пляцкарце. «А, 19-га ўвечары патэлефанаваў Мілінкевіч і выклікаў на двубой. Хто выйграе — той і прэзыдэнт. Ну, я паслаў Паўлічэнку, а Мілінкевіч шахматы прынёс...»

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**В. Солец**, Віленск. губ. Лідзк. пав. Ганчарскай вол. Нейкі Язэп Ж. наняў у нашай вёсцы кватэру і абвесьціў сябе знахарам, лечыць ён, націраючы сьпіртам, і ад кожнае хваробы робіць адно і тое ж. Хваліцца, што выганяе рэўматызм, падвей, рожу і др., ды што на ўсю Расею такіх, як ён, знахароў усяго 40 чалавек. Туманіць галаву людзям добра ўмее, а тыя пруць да яго, несучы свае цяжка запрацаваныя капейкі, каторыя шкадуюць на сапраўднага доктара.

**С.Сялецкі**

**М. Івянец**, Менск. губ. і пав. Некаторыя тутэйшыя добрыя людзі папрасілі пазваленьне на распрадажу газэт. Вось, цяпер у нашым Івянцы ёсьць газэтчык, каторы прадае газэты; прадаецца і «Наша Ніва». Варта было б і па другіх мястэчках Беларусі завесьці такую прадажу, бо скора павінны газэты многа пісаць цікавага пра выбары ў 4 Гас. Думу і другія справы.

**П.М.**

**«НН». 1911. №11. 17 сакавіка.**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Дз.В-ку зь Берасьця.** Чаму ж лацінка — «недарэчнасьць», калі ёй карыстаецца большая частка цывілізацыі? Калі нават татары і ўзбэкі перайшлі на лацінку? Што да клясычнага і наркамаўскага правапісаў: пераход на адзіную норму адбудзецца, але няможна рабіць гэта ва ўмовах антыбеларускага аўтарытарызму. Вы разумееце, чаму беларусам няможна прымаць савецкацэнтрычных падручнікаў гісторыі. Таму ж няможна і дазволіць савецкаму рэжыму навязваць правапіс.

Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2521. **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 15.03.2006.

Замова № 1458.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАНТАКТЫ

**Тэатар** старадаўняй культуры «Яварына» шукае маладых людзей, што маюць спэцыяльную падрыхтоўку ў тэатральна-танцавальных пастаноўках. Т.: 774-36-15. Маргарыта

### КАШУЛЯ

**Шаноўнае спадарства!** Падкажыце, дзе набыць сапраўдную вышываную кашулю. Т.: 766-12-79. Зьмітрусь

### ПАМЯЦЬ

**19 сакавіка спаўняецца** год з дня сьмерці адваката Арсена Скаруліса, які загінуў, узьнімаючы бел-чырвона-белы сьцяг на адну з альпійскіх гор у Швайцарыі. Мы помнім цябе. Сябры

### ПАСЬВЕДЧАНЬНЕ

**Згублена пасьведчаньне** аб сканчэньні курсаў старэйшых мэдыцынскіх сясьцёр на імя Лучанок Надзеі Васільеўны. Просьба вярнуць за ўзнагароду. Т.: 283-45-82.

### ТЭЛЕФОН

Прапаную мабільны тэлефон Nokia 6610, б/у. Т.: 283-08-85. Вітаўт